КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 46 (1224) 14 лістапада 2015 г.

Праекты развіцця

Пакуль гарыць Свяча?..

Напярэдадні камандзіроўкі папярэдзілі кіраўніцтва раённых аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі на Лепельшчыне, Бешанковіччыне і Лёзненшчыне, што будзем тут "палявацъ" па станоўчы досвед культурнага развіцця. Думалася ў сувязі з гэтым, што паўсюль будзе ўзорны парадак і спрыяльная падстава для шырокага абагульнення назапашанага вопыту. На жаль, нашы спадзяванні ў адным з раёнаў Віцебшчыны не пацвердзіліся. Але спачатку — працяг гаворкі пра тактыку і стратэгію лепельскай культуры.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ,
Мінск — Лепельскі — Бешанковіцкі — Лёзненскі раёны Віцебшчыны — Мінск

Коцікі цяпер адпачываюць

Вельмі важна, падаецца нам, спыніцца на дзейнасці Лепельскага РДР, скіраванай на рост наведвальнікаў, і не толькі гурткоўцаў. Тутэйшы Дом рамёстваў — не замкнёная на сабе вытворчая сістэма. Гэта, хутчэй, адкрытая відовішчная (так, менавіта відовішчная!) арганізацыя культуры.

Салон-крама "Скарбонка", з якой і пачынаюцца памяшканні РДР, — своеасаблівая мастацкая галерэя. Апрача гэтага (калі прайсці трошкі далей), ёсць тут і сапраўдная выставачная зала са зменнай экспазіцыяй. І мы шчыра раім чытачам "К": будзеце ў Лепелі, не прайдзіце міма РДР, бо потым пашкадуеце.

У зале выстаўляюцца мастакі і рамеснікі, прафесійныя і самадзейныя. Падбор твораў заўжды — на самы вытанчаны мастацкі густ. Мы, да прыкладу, заязджаем сюды пры любой нагодзе. Некалі тут выстаўлялася цудоўная калекцыя інсітнай керамікі Зінаіды Ляйко. На вялікі жаль, майстрыха-рамесніца пайшла ўжо з жыцця, але пакінула пасля сябе неверагодную творчую спадчыну. Жанчына вельмі любіла катоў і пастаянна ўвасабляла іх выявы ў гліне. Кожны з такіх твораў — адрозны ад іншага, характарны! Апошнія вырабы Зінаіда Ляйко не паспела пафарбаваць і абпаліць. Але і на гэтых катоў можна глядзець бясконца, бо паступова пачынаеш разумець, як думала аўтарка, што адчувала і чаго хацела ад сваёй творчасці. Словам, ад наведвання такіх выставак атрымліваеш неверагодную энергію шчырасці, якая дапамагае ў працы.

Заканчэнне чытайце **на старонках 10 — 11.**



Сцэна са спектакля "Генэзіс" Балета Яўгена Панфілава. / Фота прадаставлена Цэнтрам культуры "Віцебск"

ВІЦЕБСК: ПАВОДЛЕ ХАРЭАГРАФІІ...

19 лістапада стартуе XXVIII Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску. Цэнтральнай падзеяй форуму традыцыйна стане беларускі конкурс сучаснай харэаграфіі. Абрамленнем жа для падзеі стануць майстар-класы, відэалекцыі, тэматычныя выстаўкі.

Мастыхін

Толькі што закрылася выстаўка "Іншыя паралелі", якая сціпла, без усякіх дыскусійных абмеркаванняў, дзесяць дзён працавала ў Палацы мастацтваў. Такім чынам, быў час, каб падвесці некаторыя вынікі. Гэты арт-праект прадстаўляў чыста станковы жывапіс амаль усіх членаў творчай секцыі манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў.

Барыс КРЭПАК

"Неэўклідава" геаметрыя "Паралеляў"

Цікава, што ў экспазіцыі можна было ўбачыць і творы некаторых мастакоў, якія выстаўляліся для продажу. (Досвед "Восеньскага салона" з "Белгазпрамбанкам" відавочна даўся ў знакі.) Цана на работы вагалася ад 13 500 000 беларускіх рублёў (палатно Уладзіміра Зленкі "Кафейная кантата") да 160 000 000 рублёў (карціна Васіля Зянько "Трансфармацыя У"). Валянцін Нудноў ацаніў свой дыптых "Масты Ліёна" ў 70 мільёнаў, а Іван Кліменка таксама дыптых пад назвай "Два чорныя элементы" ў 92 мільёны рублёў. Дарэчы, у Парыжы гэтыя творы калісьці былі выстаўлены на продаж амаль удвая даражэй. А вось назвы твораў іншых мастакоў, якія чакалі пакупніка: "Вясковы нацюрморт" Глеба Отчыка, "Бацькоўскі дом", "Вечар на возеры" і "Абмыванне" Аляксандра Сушы, "Браняносец упоцемку" і "Гіпапатам" Андрэя Пяткевіча, тры пейзажы Сямёна Дамарада, "Міжсезонне" і "Аб'ект" Барыса Сямілетава … Пра вынікі гэтых продажаў не ведаю....

Канешне, цана ў мільённых лічбах за "картину маслом" можа прывесці шараговага абывацеля ў шок, але для "крутога" бізнесмена, буйнога калекцыянера ці багатага турыста з-за мяжы можа падацца дробяззю. Для параўнання: работы падобнага па якасці ўзроўню на міжнародных аўкцыёнах купляюцца за дзясяткі і сотні тысяч, а то і за мільёны долараў, праўда, калі іх аўтар — асоба "раскручаная" ў сусветным ці, прынамсі, еўрапейскім маштабе. Думаю, менавіта імя мастака, а не столькі якасць твора, сёння ў свеце акрэсліваюць яго цэнаўтварэнне, ягоны, так бы мовіць, коштавы "вобраз".

Але я трошкі адхіліўся ад гаворкі пра арт-праект "Іншыя паралелі". Уласна кажучы, гэта своеасаблівы працяг групавой экспазіцыі "БТР", якую не так даўно экспанавалі ў Цэнтры сучасных мастацтваў і пра якую я нядаўна пісаў у "К". Там была "васьмёрка" мастакоў, якія ўваходзяць у склад бюро секцыі манументальна-дэкаратыўнага жывапісу БСМ, тут — большасць членаў гэтай жа секцыі плюс тая ж самая "васьмёрка", канешне, з іншымі творамі.

Усяго на выстаўцы ў Палацы мастацтваў прадставілі прыкладна, калі не памыляюся, сем ці восем дзясяткаў твораў станковага жывапісу. У асноўным, гэта мастакі сярэдняга пакалення, ёсць і маладыя. Тут і "аксакалы", даўно вядомыя персоны, асабліва ў галіне ўласна манументальнага жывапісу (Юрый Багушэвіч, Камал Гаджыеў, Сямён Дамарад, нябожчык Генадзь Жарын). Траціна работ — новыя, гэтага года; астатнія — частка даўно знаёмыя, частка — з тых, што раней не выстаўляліся, хаця і зроблены ў мінулыя часы. Матэрыял — галоўным чынам алей, акрыл ці змяшаная тэхніка. У гэтым сэнсе навацый ніякіх: усё ў межах жывапіснага станкавізму. Толькі адна работа — карціна Ірыны Бараноўскай "Фарфаліка": ляўкас, энкаўстыка, воск. Ну яшчэ ў матэрыяле алюміній, эмаль — адмыслова зроблены Аляксандрам Некрашэвічам аб'ект пад назвай "Мыльныя бурбалкі".

Заканчэнне — **на старонцы 9.**

Дэтальны разгляд

Незаўважныя кантэксты

Да канца лістапада на розных пляцоўках Мінска і Беларусі ладзіцца адна з маштабных падзей гэтай восені — Месяц фатаграфіі. 24 экспазіцыі, 11 лакацый — форум, нараджэнне якога адбылося толькі летась, сёлета працягнуў сваю працу, пашыраючы сферу ўплыву. Недаацаніць яго місіі нельга: Месяц фатаграфіі, дэманструючы розныя аблічча фатаграфіі, прыцягвае ўвагу грамадства да гэтага сродку камунікацыі і віду мастацтва. Тым не менш, сёлетні форум, так і не займеўшы галоўнай лініі-тэмы, застаўся на ўзроўні падзеі-"зборкі": россып разнайстаных выстаў без агульнага кантэксту.

Ідэнтычнасць

Павучыцца і тут ёсць чаму, але ад другога па ліку Месяца фатаграфіі, прызнаюся, чакала большага. На жаль, па гэтым прынцыпе — вольнага супастаўлення — была пабудавана і галоўная экспазіцыя Месяца, якая размясцілася сёння ў прасторы пляцоўкі "ЦЭХ".

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Дзевяць выставак у адным месцы: ад эстэцкага і адначасова сацыяльнага праекта Франсуазы Юг'е "Камуналка" — да маленькай і густоўнай экспазіцыі, прысвечанай творчасці і плёну на ніве беларускай фатаграфіі заслужанага работніка культуры нашай краіны Юрыя Васільева. Маштаб падзеі адчуваецца, але вось тэматычны фокус, бадай, адзін: сучасная фатаграфія. Знакамітыя серыі Яны Раманавай "Чаканне" і "Азбука агульных слоў", медытатыўная фатаграфія Андрэйса Строкінса — "Людзі ў дзюнах", калектыўны праект пад куратарствам Маціаса Хардэра і Марэна Польтэ — "Дзікія — жывёлы ў сучасная фатаграфіі"… Кожная серыя, праект самі па сабе вартыя ўвагі, але вось агульнага кантэксту не заўважалася.

Між тым тры праекты дакладна выбудоўвалі паміж сабой паралелі, звяртаючыся да актуальных пытанняў: што ёсць сёння жыццё на перыферыі? Чаму адны месцы паглынае мінулае, а іншыя — запаўняе новае жыццё? Ці здольныя мы вырвацца з малога кола нашага атачэння? І ці прагнем мы такога прарыву? Гаворка — пра праект "У калідорах памяці" Даніэля Зайферта і Івэты Вайводэ (яго прадаставіў Цэнтр фатаграфіі "C/O Berlin"), серыя "Агра" беларуса Сяргея Лескеця і вышэйзгаданыя "Людзі ў дзюнах" латвійскага фатографа Андрэйса Строкінса.

■■■

Што ёсць ідэнтычнасць сучаснай вёскі Рыжскага заліва, якая застыла ў трансфармацыі паміж былой ваеннай базай СССР і новым пасяленнем? Дзюны — і пясок для вытворчасці сілікатнай цэглы. Прырода — і яе выкарыстанне ў прамысловых мэтах. Месца, якое калісьці мела сваё ўтылітарнае прызначэнне, але і падобнае да берагу, які мог бы мець свае "караблі".

Заканчэнне — **на старонках 2 — 3.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Падчас аднаго з мерапрыемстваў форуму на сцэне залы Магілёўскага АМЦНТКАР. / Фота аўтара

Рызыкі і актуаліі

У Магілёве — пра традыцыйную культуру

У Магілёве прайшоў IV Міжнародны форум "Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства". Горад на Дняпры наведалі прадстаўнікі 11 дзяржаў. Збольшага гэта краіны СНД, а таксама Італія, Турцыя, Кітай, Польшча.

Алена ЛЯШКЕВІЧ
Мінск — Магілёў — Мінск

Форум адкрыў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў, імпрэзы былі прысвечаны нематэрыяльнай культурнай спадчыне: прэзентацыі традыцый Магілёўшчыны ў форме выстаўкі, канцэрта, знаёмства з працай раённых устаноў культуры, навукова-практычная канферэнцыя "Нематэрыяльная культурная спадчына: сучасны стан, рызыкі, праблемы захавання і актуалізацыі".

Выступоўцы падчас канферэнцыі закраналі і тэарэтычныя пытанні функцый традыцыйнай культуры ў сучасным грамадстве, і практычныя аспекты аховы і папулярызацыі пэўных элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Крыху дзіўным падалося тое, што не ўсе, хто працуе ў гэтым полі, карыстаюцца тэрміналогіяй Канвенцыі, прынятай UNESCO яшчэ ў 2003 годзе: варта казаць дакладна "элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны", а не аб'ект. Аб'ект — гэта панятак з Канвенцыі 1972 года аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

Некаторыя выступоўцы крытыкавалі падзел на матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну, казалі пра тое, што без матэрыяльнага ўвасаблення складана ўявіць сабе ідэю, і ў якасці прыкладу прыводзілі артэфакты народных рамёстваў і кухні. У такіх выпадках варта тлумачыць, што страва ці рамесны выраб — матэрыяльны аб'ект, а навык па іх стварэнні — элемент нематэрыяльнай спадчыны, які перадаецца ад пакалення да пакалення. Зрэшты, у панятак нематэрыяльнай спадчыны акрамя звычаяў, форм выражэння, ведаў і вопыту, адпаведна Канвенцыі, уваходзяць звязаныя з імі інструменты, артэфакты, прадметы і культурная прастора.

У немалой ступені прыняццю Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны папярэднічалі абмеркаванні Канвенцыі 1972-га: у Еўропе лічыцца, што помнік аўтэнтычны, калі захавалася вялікая частка матэрыялу, з якога ён быў пабудаваны. На Усходзе ж могуць сказаць "Гэтаму храму тры тысячы гадоў", хаця ён з драўніны, якая ніяк не магла так доўга пратрываць. На пытанне еўрапейца чалавек Усходу адкажа: гэты храм будаваўся па тых жа тэхналогіях, тымі ж інструментамі, што тысячы гадоў таму, будаўнікі — пераемнікі тагачасных майстроў. І па ўсходняй, неарыстоцелеўскай логіцы, дзе калі А не роўнае В, яны адначасова могуць быць роўныя С, храму, і праўда, — тры тысячы гадоў.

З Канвенцыі 2003 года панятак "аўтэнтычнасць" прыбралі, аргументуючы тым, што ўсе элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны аднолькава каштоўныя, незалежна ад іх узросту. Таму і на канферэнцыі ў Магілёве аднолькава цікава было паслухаць пра стварэнне банка даных па малдаўскай традыцыйнай культуры, аднаўленне кажлянскай цацкі ў Курскай і раманаўскай у Ліпецкай абласцях Расіі, працу з калекцыяй ручнікоў у Бельску-Падляшскім і спеўна-танцавальныя заняткі з карпацкімі дзецьмі (Польшча), папулярызацыю туркменскага эпасу "Гёроглы" і брэндынг культуры ў розных частках Казахстана.

Чацвёртым разам наведала Магілёў Арусяк Саакян, супрацоўніца Інстытута археалогіі і этнаграфіі Нацыянальнай акадэміі навук Арменіі. Этнамузыколаг старой школы, чымсьці нагадала нашу Зінаіду Мажэйка, якая шмат супрацоўнічала з UNESCO і прысвяціла экалогіі традыцыйнай культуры сваю апошнюю кнігу. Арусяк Саакян — стваральніца армянскай праграмы імплементацыі Канвенцыі 2003 года. Яна казала пра тое, што вусная, народная, школа — такая ж прафесійная, як класічная (узгадаем "карыфееў песенных абшчын" у Мажэйка). Цытавала прамову Амаду Хампадэба ў UNESCO ў 1960 годзе: "Калі ў Афрыцы памірае адзін стары, знікае цэлая бібліятэка".

На адкрыцці форуму выступалі старэйшыя носьбіты традыцый з Глускага і Кіраўскага раёнаў. Пра беларускія аўтэнтычныя спевы армянка сказала: "Калі чую вашых бабуль, то плачу...". Ну, што тут дадаць?

Алесь Лозка закрануў пытанне беларускіх каляндарных стыляў у еўрапейскім кантэксце, Хрысціна Лямбовіч прэзентавала спадчыну Міншчыны, мадэраваў дыскусію і рабіў абагульненні Іван Крук. Ларыса Быцко з Брэста падзялілася планамі наконт спадчыны Міколы Тарасюка: хацелі рабіць выстаўку ў Нацыянальным мастацкім музеі, але пакуль нешта не склалася. Але пленэр на сядзібе майстра ўлетку будзе, нават калі сродкаў хопіць толькі на адну скульптуру. Аксана Катовіч распавяла пра сімволіку вясельнага каравая. Аказваецца, першая згадка каравая ў друкаваных крыніцах сустракаецца ў 1526 годзе, а "каравайнікаў" — яшчэ раней, у XIV стагоддзі.

Выступоўцы ад Беларусі не губляліся на фоне прадстаўнікоў іншых краін. У той жа час адчувалася, што і гасцям цікава. Нездарма некаторыя прыязджаюць ужо чацвёртым разам і абяцаюць вярнуцца.

К

Працяг гаворкі пра магілёўскі форум — **у наступных нумарах "К".**

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункта гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 558. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 13.11.2015 у 15.30. Замова 4482. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Івета Вайводэ. "Без назвы" (з серыі "На сцежцы, што знікае").

Андрэйс Строкінс. "Рэклама рамонту аўтамабіляў".

Незаўважныя кантэксты

Месяц фатаграфіі: ад латвійскіх рыбацкіх вёсак — да беларускага аграгарадка

Але аблічча гэтых мясцін — тэрыторыя сталкераў, калі горад яшчэ не набыў уласнай будучыні, застаўшыся пакуль у статусе пэўнай "зоны". Які лёс у гэтага краю? Ці ёсць ён? Андрэйс дэманструе застылы ў пясках час, калі людзі і маленькае паселішча так і не могуць адчуць сябе тымі, хто паспеў, аглядаючыся на закат былой эпохі.

Прыклад дакладнага, асэнсаванага, актуальнага і, разам з тым, прыгожага выказвання — праекты Іветы Вайводэ і Даніэля Зайфета. Адзначу, што маладыя фатографы сталі пераможцамі конкурсу некамерцыйнага фонду "C/O Berlin". У якасці ўзнагароды інстытуцыя выпускае кнігу і робіць выстаўку фатографам. І экспазіцыя гэтай выстаўкі на Месяцы фатаграфіі — адна з лепшых. Супастаўленне дзвюх серый аўтараў, якое дае магчымасць убачыць розныя погляды на адну тэму, параўнаць манеры фатографаў — тое, што адразу вылучае праект.

Перад намі — зноў жыццё аддаленых мясцін. У Іветы — гэта радзіма яе сваякоў, дом, у якім яна раней ніколі не была, — Латвія, у Даніэля — Усходняя Германія. Ціхія мястэчкі, якія яшчэ захавалі ў чымсьці нетаропкі, традыцыйны лад жыцця — Пілцэне і Любенаў. Месцы тыя як прытулак і сховішча памяці, месцы, як тое, што перамагае (альбо каго перамагаюць), месца як калідор са сваімі насельнікамі, які вядзе аднекуль… і цікава, куды? Вось, што з'яўляецца прадметам разважанняў аўтараў. Гэта фатаграфія, якая не проста даследуе, яна і пагружае ў сябе, бо мае гэткую глыбіню асабістага роздуму, калі фатограф не хавае работы ўласнай памяці і суб'ектыўнасці.


Даніэль Зайфет. З серыі пра нямецкае мястэчка Любенаў.

І трэцяя серыя, якая ўздымае пытанне месца, якое трансфармуецца, гэта — "Агра" беларускага фатографа Сяргея Лескеця. І гэта серыя цалкам падтрымлівае знойдзеную мной лінію. Урэшце, што такое аграгарадок? Якое месца займае ён у іерархіі паміж вёскай і горадам? Хто яго насельнікі? Сяргей задае гэтыя пытанні і, мяркую, шукаючы адказы, не можа "схапіць" сваё дачыненне да аб'екта даследавання. Ці крышыцца сёння падмурак савецкай гісторыі, які ляжыць у аснове гэтага стварэння? Што ўяўляе з сябе жыццё аграгарадка як паселішча XXI стагоддзя? У серыі аўтара ўбачыць гэтага ў поўнай меры не давялося. Асобныя ўдалыя партрэты, адметныя сімвалы, панарамы аграгародоцкай тыпавой забудовы… Але ў праекце няма няўлоўнага паветра гэтай прасторы. Што для яе будзённае? Якія яе сучасныя рытуалы? "Месцы жыцця"? Ці ёсць яны? У чым "маята" ягоных жыхароў і іх радасць? Сяргей мае значную перавагу, ведаючы жыццё аграгарадка знутры, але выкарыстоўвае свае веды фрагментарна. Гэта погляд ужо чалавека з пэўнай дыстанцыі, але тую дыстанцыю пакуль не ўдаецца запоўніць ані спагадай, ані асуджэннем. Адсюль — аўтар не можа абраць найлепшую (для праекта) мову фатаграфіі для ўвасаблення ідэі. Хоць, магчыма, поўная версія праекта, а не яго экспазіцыйны варыянт, адабраны кураторам, раскрывае тэму больш.

Ані вёска, ані горад, ані мінулае, ані будучыня… Але ў гэтага месца ўсё ж ёсць сапраўднае? У чым яно, Сяргей?

Трансфармацыя грамадства, трансфармацыя маленькага мястэчка, адчужэнне савецкага і яго дзейснае — вось тыя балявыя кропкі, якія выявілі абраныя праекты, і напэўна, гэтай тэме і мог быць прысвечаны цалкам Месяц фатаграфіі. Такі ўступ і назіранне.

Тым не менш, мае форум і пэўныя вартасці на прыкладзе іншых выставак, але пра іх — у наступным матэрыяле.

Праект "Агра" Сяргея Лескеця — як нагода для разваг і рэдактара аддзела рэгіянальнай культуры нашай газеты Яўгена Рагіна. Журналіст, які ведае вёску і мястэчкі літаральна знутры, займаючыся іх вывучэннем на працягу дзясяткаў гадоў, заглянуў на галоўную экспазіцыю Месяца фатаграфіі, каб убачыць праект на сваю тэму і — падзяліцца сваімі меркаваннямі.

Сяргей Лескець. Фота з серыі "Агра".

Андэграўнд ці інсіт?

Думалася, што пабачу тлустыя скібы раллі, задаволеныя белазубыя ўсмешкі загарэлых хлебаробаў, традыцыйную барацьбу за ўраджай, важкі яго каравай і сонечныя паверхі новых вясковых крам. Добра, што не пабачыў. Схема была іншай. Больш дакладна, яе ўвогуле не было. Апрача хіба што афіцыйнай схемы планіроўкі аграгарадоцкага дамка. З яе "Агра" і пачынаецца. Пяць разоў падыходзіў да гэтых здымкаў, столькі ж сыходзіў і вяртаўся.

Яўген РАГІН

Відэашэраг — як кляксы-тэсты Роршаха. Асацыяцыі — гэткія ж нечаканыя, бо нечаканы сам падбор яўна пастановачных фота. Усё гэта ў суме можна назваць "безабароннай шчырасцю". Прыехаў маладзён-гараджанін у вёску, паздымаў, што трапілася на вока, атрымаўся эклектычны інсіт на зададзеную тэму. Апранутыя ў чыстае пастаральныя пастушкі, што дапамагаюць на пашы дзядулі. Мускулісты юнак пасля заняткаў на аграгарадоцкім стадыёне. Пазначана, што ён — работнік СВК. Працуе трактарыстам і "качаецца" пасля працы? Прынамсі, я такога самаадрачэння не бачыў. На хлопцы нават загар — не механізатарскі. Уражанне такое, што ў гэтых аграгарадках палеткі — заасфальтаваныя, а наўкол — барацьба цудоўнага з добрым. Аднак, не. Вось той жа маладзёнкачок з дзяўчынай на фоне легкавіка. Выява іншамаркі — ключавая? З'едуць у горад? І я гэтаму веру. Адток моладзі — страшэнны. Аднак аўтар хоча разабрацца ў вытоках (ягоная цытата) "вясковага рэнесансу" і называе жыццё ды працу аграгарадоцкіх юнакоў і дзяўчат "актам згоды на дарослае жыццё". Па-мойму, бяздоказна. Шчыра, але бездапаможна.

У якасці прыдарожнага сервісу адлюстравана нязграбная кавяранька. Тут бы танную і дыхтоўную вясковую сталоўку. Але яны цяпер — рэдкі выпадак па краіне. Калі аўтар пра "вясковы рэнесанс" іранічна, дык зусім іншая справа — я далучаюся да такой пазіцыі. Вёску захоўваюць не такім чынам.

Наступнае фота — таксама як код-намёк. Работа "Графіці". На бетоннай агароджы мехдвара — адмысловы роспіс. Але гэта не праява стрыт-арта, а кандовая спадчына савецкай прапаганды і агітацыі, дзе безаблічныя постаці на мове сацрэалізму заклікаюць наблізіць вёску да горада. Ці горад да вёскі? Насценная "пісанка" трымаецца на плоце і не блякне. Гэтак жа добра захавалася ў кожным з маіх равеснікаў і савецкасць. І яшчэ адна асацыяцыя, выкліканая чарговай "кляксай". Грань паміж сялом і горадам пачалі "сціраць" яшчэ напрыканцы 1950-х. Таксама будавалі дамкі для вяскоўцаў, але без гаспадарчых пабудоў на падворку. Навошта карова ў сяле, куды можна будзе прыехаць на тралейбусе? А ў 1980-х я сам бачыў двухузроўневыя катэджы для вясковай сям'і, дзе на першым паверсе гадавалася… цяля. Вёска ўпарта і цягам дзесяцігоддзяў не хоча стаць горадам.

Сумняваюся, што мае рэфлексіі падзеліць равеснік аўтара "Агра". У кожнага — свае пункты адліку і коды асэнсавання рэчаіснасці… Зноў фотарэжысура: на шурпатым табурэце — ваза. Прыз лепшаму працаўніку на фоне безаблічнага бетоннага кута. Сімволіка выявы — банальная: праца хлебаробская — шурпатая ды мазолістая, але яркі фасад аграгарадка "падсалоджвае" цяжар сялянскай адказнасці. А раптам гэта пратэст супраць таго, што нельга фармальна ставіцца да таго, на чым беларускі свет трымаецца, чым корміцца і поіцца. Так, нашы памідоры часам даражэйшыя за польскія. І ў гэтым таксама парадокс аграгарадкоў.

А ўвогуле, Сяргей Лескець, я вам удзячны. Вы сваёй працай прымусілі спыніцца і задумацца. Няўжо ў вёсках жыць наканавана спаконвечным гараджанам? Прынамсі, хаты сабе яны, будзем спадзявацца, пабудуюць не па тыпавой схеме планіроўкі.

К

Фотасюжэт нумара

Цягам тыдня нашы журналісты сачылі за ходам падзей на XXII Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад", які завяршыўся ўрачыстай цырымоніяй учора. Прапануем вашай увазе фотасюжэт, складзены з уражанняў ад падзеі, а на старонцы 13 публікуем развагі ганаровай госці форуму французскай актрысы і рэжысёра Фані Ардан.

Фота Аліны САЎЧАНКА

"Лістапад": уражанні кінатыдня

Віцэ-прэм'ер Наталля Качанава падчас уручэння спецпрыза Прэзідэнта Беларусі рэжысёру Вадзіму Абдрашытаву.

Беларускія артысты на "чырвонай дарожцы".

Народная артыстка Беларусі Таццяна Мархель.

Народны артыст Беларусі Віктар Манаеў.

Народны артыст Беларусі, рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў і старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў, акцёр Віктар Васільеў.

Аўтары айчыннага дакументальнага фільма "Подых балот", прадстаўленага ў Нацыянальным конкурсе.

Анджэй Цеханавецкі

Страты

2 лістапада 2015-га з Лондана прыйшла сумная вестка: на 92-м годзе жыцця памёр шчыры прыхільнік беларускай культуры, польскі навукоўца, беларусіст, грамадска-культурны дзеяч Польшчы і Беларусі, ганаровы грамадзянін Заслаўя, вядомы мецэнат, нашчадак князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх прафесар Анджэй ЦЕХАНАВЕЦКІ.

За сваё плённае жыццё ён здзейсніў шмат карысных спраў для беларускай культуры, да апошніх дзён нястомна займаўся данясеннем да замежнага чытача і карыстальніка звестак пра беларускую гісторыю, рабіў важкі ўклад у справу папулярызацыі помнікаў гісторыі і культуры, нямала сіл аддаваў іх захаванню і рэстаўрацыі. Быў ён і шчодрым ахвяравальнікам беларускім музеям, нават знакаміты слуцкі пояс перадаў у Беларусь. Яго манаграфія "Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме" (1961 г.) — першае грунтоўнае даследаванне па гісторыі прыдворнага тэатра ў Беларусі.

Анджэй Цеханавецкі з'яўляўся ганаровым старшынёй Беларуска-польскай кансультатыўнай камісіі па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, актыўна спрыяў працы беларускіх і польскіх навукоўцаў па аднаўленні Нясвіжскага замка, стварыў Міжнародны фонд "Нясвіж", ахвяраваў Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму запаведніку "Нясвіж" не адзін радзівілаўскі рарытэт.

Анджэй Цеханавецкі нарадзіўся 28 верасня 1924 года ў Варшаве, але яго радаводнае дрэва сваімі каранямі моцна зраслося з беларускай зямлёй — вёскай Бачэйкава Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, дзе шмат дзесяцігоддзяў жыў ягоны род. Цеханавецкі вывучаў гісторыю мастацтваў у Ягелонскім універсітэце Кракава, удасканальваў адукацыю ў Германіі, ЗША, Партугаліі, Вялікабрытаніі.

З 1961 года жыў у Лондане. Ягоная нястомная і плённая дзейнасць адзначана многімі высокімі ўзнагародамі, у тым ліку беларускім ордэнам Дружбы Народаў. З'яўляўся ганаровым доктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, ганаровым сябрам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Шануем і памятаем.

У.І. Адамушка, С.Ф. Алейнік, А.І. Бутэвіч, У.А. Гілеп, У.П. Грыдзюшка, Д. Дзінглі, С.М. Клімаў, А.І. Лакотка, А.В. Мальдзіс, Р.С. Матульскі, А.Ю. Міхневіч, У.І. Пракапцоў, Б.У. Святлоў, Т.І. Стружэцкі, А.А. Суша, І.М. Чарняўскі, У.Р. Шчасны.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе аб заўчаснай смерці ЧУЕВАЙ Наталлі Станіславаўны, якая шмат гадоў працавала на пасадзе дырэктара дзяржаўнай установы "Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна", а таксама была старшынёй савета грамадскага аб'яднання "Беларуская бібліятэчная асацыяцыя", і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Калектыў ДУ "Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна" смуткуе ў сувязі са смерцю ЧУЕВАЙ Наталлі Станіславаўны, былога дырэктара дзяржаўнай установы "Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна", і выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыцы. Светлая памяць аб Наталлі Станіславаўне ЧУЕВАЙ назаўсёды застанецца ў сэрцах людзей, якія яе ведалі і працавалі разам з ёй.

Дзяжурны па нумары

Мінімум, максімум, оптымум…

Падчас камандзіроўкі ў гутарцы з майстрам народнай творчасці я неасцярожна закрануў балючую тэму аптымізацыі ўстаноў культуры. Той аптымізацыі, якая, як меркавалася, з цягам часу дазволіць падвысіць заробкі супрацоўнікам галіны. "Ад мёртвага асла вушы!" — гэтыя словы вялікага камбінатара з вядомага рамана Ільфа і Пятрова я пачуў ад візаві.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Скепсіс майстра, як на мой погляд, шмат у чым апраўданы. Вось толькі адзін факт з нядаўняга камандзіровачнага выезду: у Глускім раёне Магілёўшчыны сярэдні заробак супрацоўнікаў сферы, па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Наталлі Гулевіч, складае 3 мільёны 400 тысяч рублёў. Між тым, згодна з данымі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, сярэдняя налічаная заработная плата ў студзені-верасні 2015 года ў Магілёўскай вобласці склала 5 мільёнаў 761 тысячу рублёў. Атрымліваецца, што сёння культработнікі Глушчыны зарабляюць прыкладна 59 % ад сярэдняга абласнога заробку.

Падобная сітуацыя назіраецца ў іншых рэгіёнах краіны. Так, па словах першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святланы Баранок, заробак культработнікаў вобласці знаходзяцца ў межах 4 мільёнаў рублёў. (*Пра ініцыятыву, што ў пэўнай меры дазволіць палепшыць сітуацыю, чытайце на старонцы 6.* — **Ю.Ч.**) А сярэдняя заработная плата за студзень-верасень бягучага года, паводле той жа статыстыкі, роўная па вобласці 6 мільёнам 610 тысячам рублёў. Значыць, і тут культработнікі маюць прыкладна 60,5 % ад агульнаабласнога заробку.

Дарэчы, падобная сітуацыя назіралася і летась. У 2014 годзе ўзровень сярэднямесячнага заробку работнікаў культуры склаў толькі 60,6 % да сярэдняй зарплаты па рэспубліцы — пісаў пра гэта ў адным з нядаўніх артыкулаў. Такім чынам, нягледзячы на аптымізацыю, сітуацыя з заробкамі ў галіне не змяняецца. І, як вынікае з прыведзеных лічбаў, механізм пераразмеркавання грошай для матэрыяльнага стымулявання работнікаў, на якіх ускладаецца дадатковая нагрузка, не прадугледжаны ні на раённым, ні на іншых узроўнях…

Ад культработнікаў патрабуюць выканання планаў, нарошчвання пазабюджэтных даходаў арганізацый, павелічэння аб'ёмаў спонсарскай дапамогі… Але парадаксальным застаецца і наступнае: колькасць работнікаў скарацілася, абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы даводзіцца чакаць гадамі, а ў сферы не прадугледжана ніякіх фінансавых стымулаў для тых супрацоўнікаў, якія засталіся "шчыраваць" на культурнай ніве пасля аптымізацыі. Разам з тым, як было адзначана ў лютым бягучага года на выніковай калегіі Міністэрства культуры краіны, эканамічны эфект ад аптымізацыі сферы культуры склаў каля 294 мільярдаў рублёў…

Задумацца над праблемай варта — і вельмі пільна, неадкладна. Бо можна "аптымізавацца" да такой ступені, што перспектыўныя (асабліва больш маладога веку) творчыя сілы сыйдуць у "Еўраопты" ды "Гіпа" — заробкі там значна вышэйшыя…

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41, альбо пішыце
на электронны адрас **kultura@tut.by.**

Суб'ектыўныя нататкі: нагода для абмеркавання

Дзіцячая опера: што "Доктар…" прапісаў?

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі, паставіўшы оперу "Доктар Айбаліт" нашай Марыны Марозавай, не проста "вылечыў", а практычна вярнуў з небыцця нацыянальны дзіцячы рэпертуар. Бо цягам апошняга паўстагоддзя, калі і з'яўляліся на яго сцэне беларускія оперы і балеты, дык былі яны скрозь "дарослымі".

Надзея БУНЦЭВІЧ

Хто камандуе парадам?

Кампазітары на дзяцей не забываліся, оперы Віктара Капыцько, Уладзіміра Солтана, Уладзіміра Кандрусевіча і іншых былі самымі рознымі: авангардная аднаактоўка, эпічная опера-казка ў традыцыях Глінкі — Рымскага-Корсакава, поп-опера, блізкая да мюзікла. Але за ўвесь час толькі "Вясновая песня" Віктара Войціка была ўвасоблена ў 1993-м на сцэне Музычнага тэатра. Вялікі ж тэатр заставаўся непрыступнай крэпасцю, працягваючы скардзіцца на недахоп айчыннага рэпертуару.

Пачуўшы тыя скаргі на адной з прэс-канферэнцый, лібрэтыст Таццяна Мушынская, больш вядомая як музычны і балетны крытык, паэтэса, празаік, драматург, паступіла так, як рабіў калісьці Джузэпэ Вэрдзі: прыйшла да кіраўніцтва тэатра і запытала, ці не трэба ім дзіцячая опера паводле Карнея Чукоўскага. Пачала працу, папярэдне атрымаўшы згоду на пастаноўку, бо раней мела ўжо даволі багаты вопыт напісання лібрэта нястораных ці створаных, ды неўвасобленых балетаў. Знайшоўся і кампазітар-аднадумец, бо Марына Марозава плённа звярталася да вершаванай лірыкі Таццяны, ператвараючы яе ў рамансавую. Так што на гэтым этапе ўсё было калі не бязвоблачна, дык дакладна "бясхмарна".

Навальнічныя парывы (памятаеце, карабель Айбаліта разбіваецца, і доктар плыве на кіце?) перавандравалі з казкі ў рэчаіснасць, як толькі партытура была скончана і калі за пастаноўку ўзяўся рэжысёр. Кампазітару шмат чаго давялося перарабляць, а між тым, таго ж самага выніку (і нават яшчэ лепшага!) можна было дасягнуць і меншай крывёю, калі б твор з самага пачатку нараджаўся пры непасрэдным удзеле рэжысёра, які "камандаваў" бы агульнай драматургіяй. Дарэчы, раней тэатр практыкаваў сумесную працу з кампазітарамі, пачынаючы з самых ранніх этапаў нараджэння твора. Але калі парады давала ўся пастановачная каманда, уключаючы выканаўцаў цэнтральных партый, дык вынікам часцяком станавіліся да болю традыцыйныя партытуры, дзе многія кампазітарскія прыдумкі разбіваліся аб тэатральны "побыт": маўляў, тут мы хочам "як у Вэрдзі"… Так што ўсё залежыць ад крэатыўнасці дарадцаў і супадзення мастацкіх памкненняў!

А вось у "…Айбаліце" менавіта Панджавідзе належыла цудоўная думка вывесці на сцэну некаторых герояў разам з музычнымі інструментамі ў руках. Ансамбль з "атамнай сумесі" баяна, тубы, вялікага барабана ды талерак, на якіх іграюць самі галоўныя героі, суправаджае камічнае "пахаванне" Зайчыка. Ванечка (Аляксандр Гелах) і надалей на свой баян не забываецца, спраўна салірует акампаніруе. Раяль спяшаецца "з кустоў" на авансцэну ў час бойкі. На ім заўзята "тапёрнічае", выдаючы джазавыя імправізацыі, артыст хору і адначасова малады кампазітар Андрусь Якушаў, заняты ў сольнай партыі Акулы Каракулы, памагатай Бармалея. З гітарай у руках з'яўляецца Матылёк (Аляксандр Жукаў), але… інструмент так і застаецца ўсяго сцэнічным антуражам, не задзейнічаным у музыцы, бо гэта — рэжысёрская, а не агульная з кампазітарам прыдумка.

А між тым, у сваёй рамансавай творчасці Марына Марозава яшчэ са студэнцкіх гадоў шчодра выкарыстоўвае балалайку, гітару, кларнет, скрыпку, флейту, віяланчэль. Яе кампазітарская індывідуальнасць найбольш ярка выяўляецца менавіта ў такіх нешараговых спалучэннях з вакалам розных сольных інструментаў і іх ансамбляў! Уяўляеце, наколькі яшчэ больш цікавай, адметнай, нечаканай магла б атрымацца опера? Дый спевакам было б утульна не спаборнічаць увесь час з аркестравымі напластаваннямі, а раз-пораз спяваць у адметным ансамблевым атачэнні — тым больш, што многім артыстам аркестра сцэнічныя выхады не ў навіну.

Сцэна са спектакля "Доктар Айбаліт". / Фота прадастаўлена тэатрам

> Пра прэм'еру і вядомыя праблемы жанру

Дык спевамі ці песенькай жывуць артысты "весела"?

А вось з тымі, хто лічыць, што дзіцячая опера абавязкова павінна быць песеннай, не выходзячы за рамкі простых дзіцячых мелодый, не пагаджуся. Бо калі мы і надалей будзем карміць дзятву эстэтыкай "а-ля 1950-я", дык ніколі не атрымаем оперную публіку, схільную не адно да знаёмых арый, але і да творчых эксперыментаў, без якіх немагчыма ніякае развіццё. Сама неаднойчы пераконвалася, што дзеці рэагуюць не столькі на інтанацыйны склад музыкі, колькі на яе вобразнасць, а тая найперш ствараецца тэмбрам, тэмпам, рытмам. Таму можна толькі радавацца, што музыка "…Айбаліта" звернута да XX стагоддзя, а не XIX. У ёй мы чуем "спасылкі" на нашага Яўгена Глебава, бо менавіта яго выпускніцай была Марына Марозава. А скрозь прызму "глебавізмаў" — на гармоніі Пракоф'ева, стылістыку ранняй творчасці Стравінскага (і ягонага педагога — "позняга" Рымскага-Корсакава), Шастаковіча.

У вакальных партыях ёсць і каларытная скорагаворка (дуэт Танечкі і Ванечкі), і відавочныя інтанацыі яўрэйскай музыкі (арыёза Гіпапатама), і "асучаснена народны" трыхорд у межах не кварты, а трытона ("Слава, слава Айбаліту!") і, што падалося залішнім, паралелі з савецкім дзіцячым хітом Дзмітрыя Кабалеўскага "То бярозка, то рабіна" ў Калыханцы Кракадзіліхі. У аркестроўцы ж, як ні дзіўна, больш яркія тэмбравыя фарбы прыпадаюць на вакальныя нумары, але там яны справядліва "мікшыруюцца" дырыжорам (Алег Лясун), каб не замінаць спевакам. А ў танцавальных і ўступных фрагментах, дзе той жа медзі можна было б і разгарнуцца ва ўсю моц, чамусьці пераважаюць больш бляклыя ў такім атачэнні струнныя.

З Чукоўскім па жыцці

Звяртацца да казак Чукоўскага кампазітару было і проста і складана. З аднаго боку, у Марыны Марозавай мелася і дыпломная кантата "Муха-Цакатуха", і больш позняя музыка да аднайменнай тэатральнай пастаноўкі, якія можна было скарыстаць. З другога — пасля шматсерыйнага мультфільма, які набыў неверагодную папулярнасць, вершаваныя радкі сталі неад'емнымі ад кідкай, звышзапамінальнай музыкі Георгія Фірціча. Як з гэтым "змагацца"? Толькі нейкай альтэрнатыўнай стылістыкай, што кампазітар і зрабіла.

І хаця ўсе ў адзін голас сцвярджаюць, наколькі выйгрышная сама тэма, я так не думаю. Справа не толькі ў памянёным мультфільме, але і ў асаблівасцях опернага жанру. Высокія мастацкія якасці, пастаянныя змены метрыкі, як у фальклоры, фантасмагарычная віхура паэзіі Чукоўскага прыцягальныя для кампазітараў — і беларускіх таксама. У 1973 годзе, да прыкладу, з'явілася на той час вельмі сучасная па музычнай мове опера Людмілы Шлег "Тараканішча" — у выглядзе, падкрэслім, радыёоперы.

Сама па сабе казка пра Доктара (у яе аўтарскім, а не якімнебудзь "перакручаным" постмадэрнісцкім варыянце) прызначана для зусім маленькіх — каб тыя не баяліся людзей у белых халатах. Пагадзіцеся, на поўнамаштабныя оперныя спектаклі, прызначаныя для вялікай сцэны, дзяцей пачынаюць вадзіць крыху пазней. Але для тых жа малодшых школьнікаў, добра знаёмых з вершамі Карнея Чукоўскага, больш прыцягальнымі ў гэтай казцы будуць прыгоды. Невыпадкова і ў колішнім фільме "Айбаліт-66" з музыкай Барыса Чайкоўскага, і ў створаным паводле яго мюзікле "Айбаліт-2002" у нашым Музычным тэатры акцэнтаваліся найперш супрацьборства доктара і Бармалея — героя іншай казкі. Мюзікл Уладзіміра Назарава ў Музычным тэатры нацыянальнага мастацтва ў Маскве нават назвалі "Айбаліт і Бармалей". А з пазнакай "3+" у Валгаградскім тэатры лялек узнік спектакль з музыкай яшчэ аднаго расійскага аўтара, выканаўцы, акцёра Аляксандра Пінегіна — "опера-буф для маленькіх дзяцей і малодшага медперсанала ў адной дзеі".

Каб нашу беларускую оперу расцягнуць да дзвюх дзей, лібрэтыст Таццяна Мушынская выкарыстала не толькі фрагменты іншых казак Чукоўскага, але і некаторыя ранейшыя радкі ягонага "… Айбаліта", што не ўвайшлі ў канчатковы тэкст. Затое скарацілася падарожжа ў Афрыку. У выніку ўся першая дзея сталася вялізнай экспазіцыяй, дзе Доктар (Аляксандр Краснадубскі) усё лечыць ды лечыць, а плынь хворых не заканчваецца. Чым не ўздзеянне нацыянальнага эпічнага мыслення? І менавіта тое, чаго так баяўся сам паэт, імкнуўшыся як мага хутчэй адправіць героя ў Афрыку, насустрач прыгодам і, у адпаведнасці з часам, гераізму. Бармалей (выдатная, ці не лепшая на сёння праца Юрыя Балацько), бы чорцік з табакеркі, у спектаклі з'яўляецца ў пачатку другой дзеі, калі тыя ж хлопчыкі-гледачы могуць канчаткова страціць да відовішча цікавасць.

■ А вось з тымі, хто лічыць, што дзіцячая опера абавязкова павінна быць песеннай, не выходзячы за рамкі простых дзіцячых мелодый, не пагаджуся. Бо калі мы і надалей будзем карміць дзятву эстэтыкай "а-ля 50-я", дык ніколі не атрымаем оперную публіку, схільную не адно да знаёмых арый, **але і да творчых эксперыментаў,** без якіх немагчыма ніякае развіццё.

Заканчэнне артыкула — **на старонцы 12.**

"Культпралёт" ад Полацка да Віцебска

Калі рыхтаваліся вернісажы майго праекта "Культпралёт", у эксплікацыі згадваўся выраз "белыя плямы". Пад імі я меў на ўвазе кропкі на карце Беларусі, дзе мне не давялося пабываць. А ў рэгіёны я еду для таго, каб набрацца жывой энергіі. Яна тут ёсць, у адрозненні ад Мінска, запоўненага клішаванымі аднатыпнымі праектамі, якія не нараджаюць новых сэнсаў. Не ведаю, як гледачу, але мастаку там падсілкоўвацца няма чым. Хіба кісароднымі актэйлямі.

меркаванне

Руслан ВАШКЕВІЧ, мастак

Людзі па-за межамі сталіцы сапраўды іншыя. Яны не перакормленыя інфармацыйным бацвіннем. Моцна адрозніваюцца і адносіны адміністрацыі тых месцаў да мастакоў. Там абсалютна традыцыйны акадэмічны падыход да мастацтва, пры гэтым — вельмі любоўны: як мне тое бачыцца, мастацтва для клеркаў, чыноўнікаў гэтак жа важнае, як і для аўтара.

Вызначыў для сябе наступны фармат: выязныя выстаўкі, якія сінхронна праходзяць у розных гарадах краіны (адначасовасць тая дарэчная, таму што выстаўкі адна з адной не звязаны, апроч як аўтарам). Такім чынам быў рэалізаваны праект "Культпралёт", частку якога прыняла Полацкая карцінная галерэя, размешчаная ў будынку колішняга езуіцкага калегіума, а частка адкрылася ў віцебскай "Арт-прасторы".

Першы паверх калегіума прысвечаны абразам, праваслаўным, каталіцкім, уніяцкім. Паглядзець на гэтыя аб'екты з'язджаюцца людзі з усяго свету. Другі ўзровень сіламі дырэктара галерэі Ларысы Лысенка запоўнены калекцыяй работ XX стагоддзя. Трэці ж — аддадзены пад зменныя выстаўкі. Усё падрыхтавана да таго, каб стаць "вішанкай" на гэтым торце, таму рабіць "пшык" нецікава. Ларыса вельмі ўважлівая да таго, што павінна выстаўляцца ў галерэі. Яна сама вышуквае імёны за мяжой і ў нас. Таму, калі мы з ёй вызначыліся з супрацоўніцтвам, то сталі ўзгадняць працы.

І атрымаліся дзве серыі. Адна з іх — "Музей". Вялікі, класічны, запоўнены работамі таленавітых вядомых мастакоў. Менавіта з імі я вяду бясконцую спрэчку, турнір. "Дзяўчынка на шары", "Выкраданне Еўропы" — мне блізкія працы аўтараў, але я вырашыў, што можна зрабіць яшчэ лепш або паглядзець на іх з іншага боку. А некаторых персанажаў наогул "ажывіць". І вось карлік Веласкеса ў мяне, як у мультфільме, на шасці палотнах паступова адкрывае вочы і закрывае рот. Мастацтва гэткім чынам жыве, а з ім "ажывае" і карлік. Такіх работ з гадамі стала неверагодная колькасць: гэта ператварылася ў даследчую лабараторыю.

Другая серыя больш хуліганістая. Гэта геаметрычныя працы: белыя палотны, нескладаныя прамалёўкі чорнай лініяй. Яны задзірлівыя, не без фарсу. Драйвовы, стрыт-артаўскі настрой у тых сценах глядзіцца сапраўды класна. Скляпеністыя столі, байніцы, далікатна-малочны фон. Выглядае так, быццам хуліган забег і хутка намаляваў. Карціны ў гэтай прасторы становяцца значнымі, а прастора — адкрываецца для новых перажыванняў. Я назваў серыю "Размалёўкі для дарослых", прапануючы тым самым абстрактна ў галаве альбо на раздрукаваных маленькіх копіях з дапамогай алоўкаў самім усё гэта размаляваць. Водгук быў настолькі жывы, што ўсе лісткі разышліся за гадзіну. І, здавалася б, два нічым не звязаныя праекты, але, калі ўдумацца, то ў першым выпадку я гуляю з мастацтвам, перарабляючы яго і перакройваючы, а ў другім — прапаную гледачу тое ж самае зрабіць са мной.

> Людзі па-за межамі сталіцы сапраўды іншыя. Яны не перакормленыя інфармацыйным бацвіннем. **Моцна адрозніваюцца і адносіны адміністрацыі** тых месцаў да мастакоў. Там абсалютна традыцыйны акадэмічны падыход да мастацтва, пры гэтым — вельмі любоўны...

У Віцебску я зноў адчуў добрае стаўленне. Чым больш пафасу сканцэнтравана ў пэўным месцы, тым больш моцна гэта адбіваецца на чалавечых адносінах. У Мінску ўсё адбываецца па іншай "схеме": "круглыя сталы", мадэратарства, кураторства. Гэта раз'ядае жывую плоць, не пакідае ў сухім астатку цэласнай з'явы. Яна яшчэ, можа, не саспела, а паміж мастакамі пабудаваны перагародкі. Яшчэ няма нічога, а людзі адзін з адным не размаўляюць, не вядуць агульных спраў: хтосьці кагосьці піярыць, хтосьці кагосьці замоўчвае. Мастацтва пад ціскам такіх дыскусій драбнее і вымірае.

Віцебская выстаўка адлюстроўвае ідэю паўзучага крызісу, мастацкага, фінансавага. Ён прапануе працаваць на хуткасць: стужка "Фэйсбука", крамы "Ікея", запоўненыя паўфабрыкатамі, процьма калажаў ў авангарднай тэхніцы, калі дастаткова нешта выразаць або выкарыстаць ужо наяўныя іміджы. Інтэрнэт перапоўнены фатаграфіямі на любую тэму. Для таго, каб напісаць партрэт чалавека, ужо не абавязкова садзіць яго перад сабой, дастаткова прагартаць яго старонку ў Сеціве. І мне захацелася зрабіць калажныя працы на белым фоне, з дзіўнымі аб'ектамі, якія, на першы погляд, ні аб чым не сведчаць. Яны зроблены ў фармаце эканом-класа, спрошчаным для ўспрымання, універсальным для экспанавання. Іх можна вешаць усюды: у галерэі, гіпермаркеце, на хайтэкаўскай кухні. Іх зручна друкаваць у каталогах, разглядаць, вярстаць, складаць з іх нешта новае. Назвы ж ім я не даваў наўмысна, спачатку яны былі сілуэтамі, цяпер жа нагадваюць мне прасціны ці вітрыны. Яны мне падабаюцца, гэта нешта такое да канца неадрэфлексаванае. Збор непрааналізаваных катэгорый. Ну і накіравана ўсё тое на гледача, якому прапануецца ўсё гэта склеіць як пазл. Я сабе ўяўляю гэта так: будуць прыходзіць ярка апранутыя людзі, запоўняць сабой прастору, і работы проста стануць для іх дэкарацыяй. Іх сілуэты, іх размовы — вось што важна, і зусім не трэба над кожнай работай стаяць і вырашаць, у залатую раму яе павесіць або ў срэбраную.

Занатавала Аліна САЎЧАНКА

Прамалёваны этнапрофіль

Пасля IV Расійска-беларускага адкрытага конкурсу народнага песеннага мастацтва "Як на рэчцы была на Фантанцы" варта павіншаваць прызёраў і ўзважыць, — наколькі ўзнагароды прадстаўнікоў Беларусі — студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Гран-пры ансамбля "Грамніцы", лаўрэацкі дыплом фальклорнай суполкі "Тацянка-Вяснянка", дыпломы салістаў) былі абумоўлены арыенцірам на каранёвыя формы культуры Беларусі.

тэкст

Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,
загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Конкурс "Як на рэчцы была на Фантанцы" ладзіцца ў Санкт-Пецярбургу ў мэтах расійска-беларускага сяброўства. Ля яго вытокаў стаялі былы міністр культуры Беларусі Павел Латушка, сённяшні рэктар Санкт-пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры Аляксандр Тургаеў, заснавальнік аднога з расійскіх гісторыка-культурных фондаў Юрый Бундзін. Імпрэза мае сучасны менеджмент, фінансавую падтрымку, сталае кола гледачоў, дзе пераважае музычнае, тэатральнае і арыентаванае на спаціжэнне мастацтва студэнцтва.

Сёлета ўдзельнікамі конкурсу ў Санкт-Пецярбургу былі прадстаўнікі рэгіянальных школ рускага песеннага мастацтва, майстры фальклору з аўтаномій Расіі, бліскучыя маскоўскія і пецярбургскія фальклорныя выканаўцы. Аднак Гран-пры за стылістычна выверaную інтэрпрэтацыю палескіх спеваў, за адноўленую старажытную кантавую беларускую традыцыю і за густоўную траістую інструментальную музыку звезлі ў Мінск "Грамніцы" — адзін з першых фальклорна арыентаваных студэнцкіх гуртоў Беларусі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Зяневіча.

> ...У сучасным свеце ўсё больш **цэніцца "твара не агульны выраз"** — мастацтва з добра прамалёваным "этнічным профілем", якое дапамагае і творцам, і гледачам сябе ідэнтыфікаваць прадстаўнікамі свайго народа. Сёлетняя конкурсная перамога мінчан — працяг лініі на "этнаарыентаванае" прадстаўніцтва Беларусі на гэтым форуме.

А лаўрэацтва першай ступені ў фальклорнай намінацыі расійскі ансамбль народнай музыкі "Златацвет" Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры падзяліў са студэнтамі спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" БДУКіМ — курсавым гуртом "Тацянка-вяснянка" Ларысы Рыжковай. Творчасць апошняга калектыву, заснаваная на метадзе дэманстратыўнай антрапатэхнікі (навучанні без нот, а з аўдыя- і відэакрыніц і з вуснага пераймання ад носьбіта фальклору) глядзелася надзвычай пераканаўча і свежа.

У залах палаца прынцаў Альдэнбургскіх (дзе сёння размяшчаецца СПбДІК) у свой час разгортваліся падзеі "Пікавай дамы" Пушкіна, яго паркет цягам трох папярэдніх стагоддзяў краналі аксамітныя патофлікі арыстакратычных модніц "паўночнай Венецыі", а ў XXI стагоддзі адмыслова збалансаваная акустыка яго пазалочаных скляпенняў нечакана ўзвібравала ад беларускіх загуканняў вясны, смыковай і дударскай музыкі і полечных "драбух", ад паўночнарускіх кугіклаў, пскоўскіх звонкіх гусляў і курскіх карагодаў... "Фальклорная" дамінанта конкурсу была сёлета заўважная "няўзброеным вокам".

Сапраўды, у сучасным свеце ўсё больш цэніцца "твара не агульны выраз" — мастацтва з добра прамалёваным "этнічным профілем", якое дапамагае і творцам, і гледачам сябе ідэнтыфікаваць прадстаўнікамі свайго народа. Сёлетняя конкурсная перамога мінчан — працяг лініі на "этнаарыентаванае" прадстаўніцтва Беларусі на гэтым музычным форуме, акрэсленай рэктарам БДУКіМ Юрыем Бондарам у 2013 годзе, калі ўпершыню Гран-пры "схіліўся" ў напрамку фальклорнай намінацыі і быў дастаўлены ў Мінск гуртом "Талака" — выпускнікамі і вучнямі Уладзіміра Зяневіча. Чым больш школ, каледжаў, мастацкіх устаноў вышэйшай адукацыі будуць будаваць свае праграмы на этнаспадчыне Беларусі — тым больш ацэненым і запатрабаваным будзе творчасць іх выпускнікоў. Этнічная музыка адлюстроўвае глыбінную мадэль свету кожнага народа. Таму — пакуль мы чуем і здольныя ўзнавіць каранёвыя беларускія спевы, іх глыбінны і непаўторны гук, мы дакладна ведаем — хто мы і скуль мы, — і нават падсвядома дзелімся гэтым усведамленнем з тымі, хто навокал. А яны — заўсёды пачуюць, ацэняць і ўшануюць гэта.

Меркаванні калумністаў і экспертаў газеты не абавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Рэпліка пра...

Меню замкавых рэстаранаў не пакіне галоднымі замежных грамадзян, а вось беларусам, за рэдкім выключэннем — яно "не па кішэні". Памятаю, як падчас першага арт-фэсту ў Нясвіжскім замку (у 2012 годзе) нашы турысты харчаваліся піражкамі, піцай і іншым печывам пад летнімі паветкамі, бо цэны рэстарана "Гетман" здольныя былі "адхапіць палец".

Абед ці спектакль?

Напярэдадні арт-фэсту ў Міры адбываўся "Рыцарскі турнір". Зранку моладзь з розных краін свету разгортвала свае палаткі на беразе возера перад замкам і рыхтавалася да спаборніцтваў. Некалькі хлопцаў пайшлі ў краму па прадукты, бо, па словах "рыцараў", "княжацкі абед" вельмі дарагі. Падарожжа і без таго багата каштавала, таму на страўніку варта эканоміць.

Такі водгук іншаземцаў з Украіны, Польшчы і Літвы прымусіў мяне, тады яшчэ работніка культуры, наведаць замкавы рэстаран "Княжацкі двор". Дазволіць сабе змагла я толькі каву "Латэ" без дэсерту, бо абед каштаваў даражэй за білет на спектакль. Але, пакуль яе падалі, агледзела залу. Наведвальнікаў апоўдні было няшмат, а за столікамі гаворка вялася на замежнай мове. У той момант нават стала крыўдна ад таго, што на сваёй зямлі не можам сабе дазволіць тое, чым частуюцца іншаземцы, і тое не ўсе.

> ...Кожны турыст, незалежна ад памеру сваёй кішэні, хоча не толькі азнаёміцца з турыстычным аб'ектам, але і добра пад'есці. Мяркую, рэстараны ды кавярні з гістарычнымі найменнямі нашых продкаў **проста павінны** частаваць і адпаведнай ежай.

Нядаўна зноў выправілася ў Мір на выстаўку "Партрэты князёў Радзівілаў" з прыватнай калекцыі Канстанціна Гогенлоэ Шілінгсфюрста (Баварыя). Цэны ў рэстаране падраслі, непрапарцыйна заробкам у сферы.

Непадалёк ад мірскага аўтавакзала ёсць кавярня "Рагнеда", прыгожая і ўтульная. Там кошт — даступны кожнаму беларусу, толькі адно "але" — без папярэдняй замовы (са слоў афіцыянта) падаюць толькі напоі. Усё гатуецца пад замову. А ўвогуле, пад'есці можна нядрэнна.

Не ведаю я рэстараннага маркетынгу і тэхналогіі разлікаў кошту, але цудоўна ўсведамляю, што кожны турыст, незалежна ад памеру сваёй кішэні, хоча не толькі азнаёміцца з турыстычным аб'ектам, але і добра пад'есці. А яшчэ, мяркую, рэстараны ды кавярні з гістарычнымі найменнямі нашых продкаў проста павінны частаваць і адпаведнай ежай. Інакш кажучы, меню гэтых пунктаў харчавання варта складаць толькі з "гістарычных страў".

Вольга ПАЛУНЧАНКА,
чытачка "К"

Слова ўпраўленню

Ад паясоў да "...Алімпа"

меркаванне

Святлана БАРАНОК, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ІРКСМ Мінскага аблвыканкама

Сёлета па вобласці прайшло багата знакавых мерапрыемстваў, і распавесці пра ўсе з іх у газеце наўрад ці магчыма. Таму згадаю хоць бы нашу апошнюю гучную акцыю: 17 кастрычніка ў Мар'інай Горцы адбыўся традыцыйны, 12 па ліку, абласны фестываль народнай творчасці "Напеў зямлі маёй". У ім прынялі ўдзел 28 калектываў са званнямі "народны" і "ўзорны" з усёй Міншчыны. Гран-пры фестывалю — мікрааўтобус — быў уручаны зводнаму духавому аркестру са Стаўбцоў.

Акрамя таго, варта згадаць і II Абласное свята рамёстваў "Слуцкія паясы", якое прайшло ў верасні і сабрала каля 500 майстроў народнай творчасці. Мерапрыемства, пад час якога можна было не толькі набыць самыя розныя сувеніры, але і ўзяць удзел у конкурсе ды навукова-практычнай канферэнцыі, адбылося ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы" на 2012-2015 годы.

Гэта падзеі мінулага дня. Але, натуральна, думаем і пра будучае. Так, 20 лістапада ў Барысаве, у раённай бібліятэцы імя Івана Каладзеева, мы ўрачыста адкрыем Карцінную галерэю Валерыя Шкарубы. Пад яе ў бібліятэцы адведзена цэлая зала. Дарэчы, рамонт памяшкання быў зроблены пры дапамозе спонсарскіх сродкаў (у аб'ёме каля 600 мільёнаў рублёў) і бюджэтных асігнаванняў. Да слова, мастацкую раённую галерэю плануецца адкрыць у наступным годзе (хутчэй за ўсё, першага верасня) і ў Маладзечне. У ёй будуць прадстаўлены палотны не толькі мясцовых мастакоў, а і майстроў пэндзля з усёй вобласці.

Цягам года ў Мінскай вобласці працягвалася рэарганізацыя раённых метадычных цэнтраў, стварэнне ўстаноў культуры змешанага тыпу, інтэграцыя публічных і школьных бібліятэк. Так, да канца 2015 года павінны быць рэарганізаваны 5 раённых метадычных цэнтраў — Вілейскі, Мядзельскі, Слуцкі, Смалявіцкі і Салігорскі. Яны стануць або філіяламі мясцовых раённых Дамоў ці Цэнтраў культуры, або ўвойдуць у якасці структурнага падраздзялення ў раённыя цэнтралізаваныя клубныя сістэмы.

Таксама сёння на Міншчыне працягваецца працэс аптымізацыя ўстаноў культуры. Напрыклад, летась сетка ўстаноў культуры вобласці скарацілася на 277 адзінак, або на 19,6%. А за 2013 — 2014 гады скарачэнне сеткі ўстаноў склала амаль 25 працэнтаў. Лічбы, натуральна, вялікія, таму можна сказаць, што пік аптымізацыі мы ўжо прайшлі. Так, сёлета было аптымізавана прыкладна 10 устаноў культуры.

Натуральна, у сувязі з аптымізацыяй скарацілася і штатная колькасць супрацоўнікаў галіны, але не так моцна, як летась. Напрыклад, калі за 2014 год было скарочана 512 штатных адзінак, дык у гэтым — толькі некалькі. А ўвогуле на сённяшні дзень у галіне культуры Міншчыны працуе звыш 9 тысяч чалавек. У сувязі са скарачэннем штатаў у некаторых раёнах прадугледжаны дадатковыя меры стымулявання супрацоўнікаў галіны ў частцы павышэння тарыфнай стаўкі згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Беларусі №29.

На жаль, што да сярэдняй зарплаты культработнікаў, дык яна не надта вялікая. Так, калі летась сярэдні заробак супрацоўнікаў сферы культуры Міншчыны склаў 3 мільёны 583 тысячы рублёў, дык на сёння яна знаходзіцца ў межах 4 мільёнаў рублёў. У мэтах матэрыяльнага стымулявання культработнікаў у 2014 годзе было прынята рашэнне аб правядзенні абласнога конкурса "Творчы Алімп Міншчыны". На ім прысуджаюцца 10 прэмій па 30 базавых велічынь кожная, а таксама грант Мінскага абласнога выканаўчага камітэта на рэалізацыю творчага праекта.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Паштальёны Любанскага раёна Мінскай вобласці прыносяць у вясковыя хаты не толькі "жыроўкі" для аплаты камунальных паслуг і свежыя газеты, але і запрашэнні на ўнікальныя мясцовыя мерапрыемствы, падобных якім наўрад ці ў рэспубліцы знойдзеш. На гэтым тыдні з размахам прайшло адно з іх — II Рэгіянальны фэст аўтэнтычнай народнай песні пад лаканічнай і вычарпальнай назвай "Бабулі". Такі фестываль — гэта сапраўды бабулі ў цэнтры ўвагі, а па сумяшчальніцтве яны — носьбіты нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Падавалася б, у свеце яна знікае літаральна на вачах. А праз галасы кабет жыве. Хаця б на беларускай Любаншчыне.

Аліна САЎЧАНКА

Калі бабулі — хэдлайнеры

Падчас правядзення форуму "Бабулі". / Фота аўтара

Пра тэхналогію правядзення свята такога кшталту мне распавёў начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама Васіль Каткавец. "У нашым рэгіёне, лічы, запаведнік традыцыйнай народнай песні і творчых калектываў, што працуюць у аўтэтычнай манеры, — зазначыў суразмоўца. — Толькі шаснаццаць з іх мы запісалі ў праекце "Наперад у мінулае" тэлеканала "Беларусь 2". Тры аб'яднанні ў раёне маюць статус гісторыка-культурнай традыцыі пэўнага песеннага стылю. Таму і фэст "Бабулі" (як і творчасць саміх кабет) у нас вельмі запатрабаваны. А калі да гэтага мерапрыемства дадаць цікавую творчую "акантоўку", што мы і робім, то яно атрымліваецца арыгінальным, непаўторным, самабытным".

Любанская тэхналогія лакальнага свята

Адметнасць "Бабуляў" у тым, што свята не выглядае пастановачным. Выканаўцаў і гасцей запрашаюць занурыцца менавіта ў сельскі антураж, выбіраючы для правядзення абавязкова вясковы клуб ці нават хату, але не атынкаваны, хай сабе і больш прывабны, будынак установы культуры аграгарадка. Кожным разам (а пакуль фэст праводзіўся раз на паўгоддзе) "Бабулі" будуць наведваць новую вёску Любаншчыны, карагодзячы гэтак па раёне. Цяпер пашчасціла жыхарам вёскі Дарасіно. Туды з'ехалася магутная каманда з 8 раённых калектываў і аднаго запрошанага з Лунінецкага раёна Брэстчыны — усяго каля 70 чалавек, якія прывезлі песні, танцы, легенды, паданні і стравы нацыянальнай кухні, прыгатаваныя ў адпаведнасці з лакальнымі традыцыямі. Гаворка пра стравы кшталту дранікаў-баранікаў, грыбнога квасу, кашы, зваранай у гаршку...

Па словах спадара Каткаўца, канцэртнае выступленне гэтым разам доўжылася тры з паловай гадзіны, і ўвесь гэты час поўная зала знаёмілася з вясельнымі, жніўнымі, а таксама і журботнымі песнямі, з байкамі ды легендамі. "Бабулям" атрымалася аб'яднаць вакол сабе і людзей сталага ўзросту, і маладых. Праўда, збольшага жанчын, але і мужчыны, варта адзначыць, назіралі за дзеяй з непадробнай цікавасцю. (Дарэчы, самай старэйшай спявачцы — 92 гады, а самым малым слухачом было немаўлятка, спакой якога гэты канцэрт зусім не парушыў.) "Мы імкнуліся, каб свята гэтае праходзіла не толькі для саміх бабуль, але і каб іншыя любаваліся імі ды слухалі песні", — сардэчна кажа Васіль Сцяпанавіч. Канешне, не забыліся арганізатары і аддзячыць спявачкам сімвалічнымі падарункамі: усе калектывы, а гэта і "Глыбокія крыніцы" з вёскі Закальное, і "Журавушка" з вёскі Ямінск, і "Хамеліха" з вёскі Кузьмічы, і "Беражніца" з вёскі Пласток, атрымалі дыпломы ды вырабы з лёну.

> Адметнасць "Бабуляў" у тым, што свята не выглядае пастановачным. Выканаўцаў і гасцей **запрашаюць занурыцца менавіта ў сельскі антураж,** выбіраючы для правядзення абавязкова вясковы клуб ці хату.

Не ведаю, як аднесліся б да такога свята беларускія этнографы (хаця адным з галоўных арганізатараў "Бабуляў" з'яўляецца Сяргей Выскварка, таксама вядомы даследчык у гэтай галіне). Справа ў тым, што фэст не ставіць за мэту дасягнуць гістарычнай, энцыклапедычнай дакладнасці жыцця нашага народа. Такія мерапрыемствы маюць хутчэй імправізацыйны характар, і тут аўтэнтычную культуру ніхто строга не вывярае. Напэўна, рабіць так — слушна. Бо галоўнае ў "Бабулях" — нават не захаванне песняў, а захаванне добрых адносін паміж людзьмі, асабліва сталага веку. Бо вясковыя бабулі, як заўважыў Васіль Каткавец, вельмі маюць патрэбу ў чалавечых зносінах: "Гэта іх душа, гэта іх жыццё".

Вялікія грошы для такіх мерапрыемстваў не патрэбныя. Усё ладзіцца разам, сваімі сіламі. Бабулям не асабліва затратна пачаставаць гасцей, кіраўнікам народных калектываў і суседзям-вяскоўцам не складана ўзяць на сябе транспартныя і арганізацыйныя пытанні. Дарэчы, вялікі ўклад у тых жа "Бабуль" зрабіла моладзь. Менавіта яна была асноўным складнікам арганізацыі мерапрыемства.

Наступным разам "Бабулі" пройдуць у лютым, бо кабеты вельмі папрасілі сустракацца часцей, чым раз на паўгоддзе. Гэтую просьбу падтрымаў і райвыканкам, і жыхары рэгіёна. У планах жа фэсту — пашырэнне геаграфіі, бо вакол Любаншчыны яшчэ столькі раёнаў са сваёй непаўторнай нематэрыяльнай культурай. Вядома, хацелася б, каб мерапрыемства цікавіла не толькі жыхароў мясцовых вёсак, але і гараджан, бо яны, як тыя яблыкі, што далёка адкаціліся ад свайго дрэва з магутнымі каранямі.

Дарэчы, у пятніцу ў Мінску пасля вакацый зноў запусціўся праект "Спеўны сход", пра які "К" ужо неаднойчы пісала. Дык вось аб'яднанне такіх стыхій, хаця б разавае, таксама было б вельмі арганічным і паспяховым.

К

Без СНА не абысціся

Нестацыянарнае абслугоўванне: вопыт Барысаўшчыны

Сёння на Барысаўшчыне з трох соцень населеных пунктаў засталося толькі дзевяць, дзе пражывае больш за тысячу жыхароў. Насельніцтва ж большасці з іх не дасягае і трохсот чалавек. А сельскіх бібліятэк на сёння — толькі 25. Як забяспечыць пры такіх умовах даступнасць кнігі? Для гэтага ў Цэнтральнай райбібліятэцы быў створаны Сектар нестацыянарнага абслугоўвання (СНА). Без яго цяпер цяжка ўявіць нашы будні.

Структурамі СНА сталі бібліобус, пункты выдачы літаратуры на прадпрыемствах і ў асобных мікрараёнах Барысава, сельскіх паселішчах. Выбар такіх формаў абслугоўвання застаецца за ЦБ, а таксама за кіраўнікамі тых прадпрыемстваў, арганізацый ды ўстаноў, дзе ладзіцца нестацыянарная праца.

Пастаянны фонд дакументаў уключае не толькі мастацкую і дзіцячую літаратуру, але і выданні, падабраныя з улікам прафесійных патрэб карыстальнікаў. Натуральна, для гэтага выкарыстоўваюцца фонды ЦБ і міжбібліятэчны абанемент.

За нестацыянарнае абслугоўванне ў 42-х населеных пунктах адказваюць 18 сельскіх бібліятэк. Кожная з іх займаецца гэтым раз на месяц. Такімі паслугамі карыстаюцца больш за 400 чытачоў. Пераважаюць пенсіянеры ды інваліды. Але немалую частку карыстальнікаў складаюць супрацоўнікі РУП-14 у Навасадах, малочна-таварнага комплексу вёскі Жыцькава, работнікі і пацыенты дзвюх бальніц сястрынскага дагляду.

Цяпер — пра пункты выдачы кніг. Іх дзесяць: чатыры — у горадзе, астатнія — вясковыя. Горад узялі на сябе тры супрацоўнікі СНА. Бібліобус рэгулярна папаўняе кніжныя фонды, якія размешчаны на заводзе палімернай тары, у радзільным доме, у Лядзішчанскім ЦКіД, у адным з жылых дамоў па вуліцы Ватуціна.

Дарэчы, цікавы факт: сярод чытачоў радзільнага дома, акрамя супрацоўнікаў, актыўнічаюць і… парадзіхі. А на заводзе палімернай тары існуе традыцыя: чытаюць тут цэлымі сем'ямі. Бібліятэчным фондам карыстаюцца і колішнія супрацоўнікі завода.

Кнігавыдача на сяле наладжана ў клубах-бібліятэках вёсак Ніўкі, Чарневічы, Вялікае Стахава, Бродаўка, Жортай, Прыяміна. Такім абслугоўваннем карыстаюцца 616 чалавек, у тым ліку 238 дзяцей.

Бібліобус абслугоўвае шэсць аздараўленчых летнікаў. Сёлета з 2 600 дзяцей трох змен, да прыкладу, чытачамі сталі 2 234. Больш дзвюх соцень набралася чытачоў і сярод дарослых. Даволі красамоўны прыклад актыўнасці нашай бібліятэкі на колах.

Нагадаю, што пры ЦБ дзейнічае Духоўна-асветніцкі цэнтр. Ягоныя бібліятэкары нестацыянарна абслугоўваюць Барысаўскі гарнізон, два храмы, каледж: усяго — каля 500 чытачоў.

Такім чынам, у нас дзейнічае 64 пункты нестацыянарнага абслугоўвання гарадскіх і сельскіх чытачоў (іх каля — 3 800 чалавек).

Застаецца толькі дадаць, што ўся інфармацыя пра рэсурсы бібліятэк, правілы карыстання даводзіцца да чытача ў друкаваным і электронным выглядах праз бібліятэчны сайт, электронныя рассылкі і з дапамогай СМІ. Спадзяюся, што гэты артыкул стане карысным маім калегам з іншых абласцей. Калі ёсць заўвагі і пытанні, давайце абмяркуем іх на старонках "К".

Алена КАПЫТОК,
вядучы метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Івана Каладзеева

Дваццатая прэм'ера

У якім бы РДК не працавала Валянціна ГАЎРЫЛАВА, заўжды была рэжысёрам самадзейнага тэатра. Пачынала ў Ветцы, цяпер — у Мастах. Агульны стаж — без малога сорак гадоў. Кухню раённай аматарскай сцэны ведае да драбніц. Давайце ж высветлім, як і якія стравы на ёй гатуюцца.

Яўген РАГІН

— Чаму самадзейны тэатр заўжды малады?

— Таму, што дапамагае жыць, радавацца, спачуваць… Іншым разам нават конкурс даводзіцца арганізоўваць сярод ахвотных папоўніць нашу трупу. І маладых — заўжды шмат. Значыць, ёсць штосьці ў тым, калі ты выходзіш на сцэну РДК і спрабуеш данесці да гледача свае эмоцыі, сваё стаўленне да сённяшняга жыцця. І яно на сцэне нібы падвойваецца. Я, напрыклад, сябе без тэатра ўжо не ўяўляю. І няхай нашым артыстам не стае часам майстэрства. Гэты недахоп кампенсуецца шчырасцю ігры. Кожны з нас у душы — артыст…

Рэпетыцыя дваццатага спектакля народнага тэатра з Мастоў.

— Спектакль пачынаецца з...

— З выбару п'есы. Чытаю яе і ўжо бачу, каго буду браць на тую ці іншую ролю. Здаралася так, што да будучага кандыдата нават на вуліцы падыходзіла, бо сустракаўся менавіта той тыпаж, што і патрабаваўся для чарговага спектакля. І не было выпадку, каб хтосьці адмовіўся, нават той, хто пра тэатр не надта ведаў. Прынамсі, імкнуся зацікавіць, заінтрыгаваць патэнцыйных артыстаў, каб прыйшлі і паспрабавалі сябе. Пакуль атрымліваецца.

— Многія застаюцца?

— Многія. У гэтым — магія народнага тэатра.

— Які падбіраеце рэпертуар? Што ў гэтым плане патрэбна раённаму цэнтру?

— Патрэбны камедыі. Жыццё і без таго жорсткае ды часам шэрае, шмат няшчасных лёсаў. Так і смяяцца можна развучыцца. Таму п'еса павінна быць вясёлай, пазітыўнай, жыццесцвярджальнай.

— На якасную драматургію, ды яшчэ на беларускай мове, — заўжды дэфіцыт. Самі ці калектыўна спрабавалі пісаць п'есы?

— Не. Гэта ўжо было б прафанацыяй. Канешне, драматургічнага матэрыялу на беларускай мове малавата. Але дэбют наш адбыўся падчас пастаноўкі "Не пакідай мяне" паводле п'есы Аляксея Дударава. На абласным фестывалі "Лідскія тэатральныя сустрэчы" занялі тады першае месца. Цяпер гэта — ці не традыцыя для нашага тэатра.

— 20 лістапада ў вас адбудзецца дваццатая прэм'ера...

— "Шыкоўнае вяселле" Робіна Хоўдана — вельмі вясёлая дзвюхактоўка. Занята ў ёй шмат моладзі.

— Аншлаг — гарантаваны?

— У нас аншлагі пастаянныя. Трэба ведаць спецыфіку раённага жыцця: у невялічкім гарадку амаль кожны — ці знаёмы, ці сваяк. Усім цікава, а як на сцэне сыграе, скажам, дачка суседкі або пляменнік швагера. У прэм'ерным спектаклі, да прыкладу, задзейнічана дзяўчына з "Мастыдрэва". Так што на прэм'еры трэба ўсю фабрыку чакаць. Дый надакучылі ўжо тэлевізары з пастаяннай "чарнухай". А мы гарантуем толькі добры настрой. Білет, дарэчы каштуе 50 тысяч.

— Хапае на сцэнаграфію ды касцюмы?

— Не. Але выкручваемся, як і ўсе калегі-самадзейнікі па рэспубліцы.

— Калектыў мае званне "народны"?

— Пачынала я з драмгуртка, з купалаўскіх "Прымакоў". А ў 1995 годзе выраслі ўжо да народнага тэатра.

Мае права быць сучаснай?

Выстаўка, якая на днях адкрылася ў музеі-сядзібе "Пружанскі палацык", знаёміць нас з асобнай з'явай: з "сучаснай іконай". Што гэта такое? І ці мае права на жыццё падобнае словазлучэнне? На гэтыя і іншыя пытанні пастараўся адказаць вядомы ў Расіі, але не надта знаёмы землякам, ураджэнец Баранавічаў, мастак Сяргей Шавырын.

Трыццаць сем святых абразоў, больш за палову з якіх — спісы з найбольш вядомых праваслаўных ікон, а таксама карціны на біблейскую тэматыку ўпрыгожылі выставачную залу "…Палацыка". Гэтыя творы мастацтва транслююць аўтарскі погляд на старадаўнюю кананічную традыцыю, кансерватыўныя правілы і ўзоры якой, аказваецца, прымаюць новаўвядзенні і даюць прастору для палёту фантазіі.

Сяргей Шавырын даказвае, што ікона мае права быць сучаснай, мае права на тое лепшае, што даступна чалавеку сёння: новыя тэхналогіі і новыя матэрыялы. Для сваіх карцін мастак выкарыстоўвае драўляную аснову, якую старанна прасушвае, затым грунтуе. Пасля драбнюткім лесіровачным мазком піша свой абраз, упрыгожвае яго вянком з сусальнага золата, рызай, інкрустацыяй з выкарыстаннем штучных і натуральных матэрыялаў, нават такіх нечаканых, як гарох і фасоля. З зайздросным ювелірным майстэрствам прыкладвае пацерку да пацеркі, зярнятка да зярнятка, ствараючы імітацыю жамчужнай ніткі. У працэсе напісання прымяняе брашыраванне і фратаж — штучнае старэнне і рэльеф. Апраўляе дзіўнымі аўтарскімі ажурнымі ляпнымі багетамі. А тэмы для творчасці выбірае па натхненні, што сыходзіць ад самога дрэва: спецыяльна нарыхтаванай дошкі ці звычайнай клёпкі ад расколатай бочкі.

Іконы майстра перадаюць прыхаваныя малітоўныя хваляванні чыстай душы нашага сучасніка. Ён ўсведамляе, што напісанне ікон патрабуе вялікай адказнасці, таму перад стварэннем кожнага новага абраза вывучае духоўную літаратуру. Трэба адзначыць, што першыя кнігі па іканапісе падарыла Сяргею маці — Лідзія Пятроўна, гісторык па адукацыі. Так, наш госць дакрануўся да святой прыгажосці і праз спробы ды пошукі прыйшоў у мастацтва. Спачатку зацікавіўся пластыкай — працаваў і вучыўся ў вядомага маскоўскага скульптара Міхаіла Кірылава, потым быў роспіс гатэлю "Расія" ў Маскве, дызайн і роспіс рэстарана "Secession", працаваў Сяргей куратарам выставачнай залы, займаўся рэстаўрацыяй храмаў і неўзабаве прыйшоў да іканапісу.

Алена ЗЯЛЕВІЧ,
старшы навуковы супрацоўнік Музея-сядзібы "Пружанскі палацык"

Тактыка культурнага развіцця

Сёння модна складаць розныя топ-рэйтынгі, спісы прыярытэтаў. Гэта можа быць рэйтынг лепшых музычных кампазіцый, фільмаў, твораў. Вось і навагрудскія бібліятэкары ў Год моладзі падчас дзеяння раённай акцыі "Моладзь ЗА кнігу і чытанне" склалі топ-рэйтынг самых чытаных кніг сярод адпаведнай аўдыторыі. Гэта топ з "Дзесяці кніг, якія ўзрушылі мяне".

Хваля рэйтынгу

Спіс заяўленых кніг паказальны для чытацкіх пераваг сучаснай моладзі, і яшчэ раз пацвярджае вынікі папярэдніх даследаванняў і мерапрыемстваў, якія прайшлі ў межах акцыі (бліц-апытанне "Чытаць — гэта модна?", вялікае онлайн-галасаванне "Любімая кніга пра вайну", конкурс рэцэнзій "Ёсць такая кніга!"). Некаторыя аўтары і творы паўтараюцца з даследавання ў даследаванне. Гэта Міхаіл Булгакаў, Васіль Быкаў, Барыс Васільеў, Наталля Батракова, Стэфані Морган Маер.

На першым месцы нашага рэйтынгу — кніга сучаснага беларускага аўтара Наталлі Батраковай "Тэрыторыя душы". Другі радок заняла кніга Маргарэт Мітчэл "Знесеныя ветрам", а трэці — кніга беларускага празаіка Галіны Пярун "Прабач".

Чацвёртае, шостае, сёмае і дзясятае месцы займаюць кнігі Стэфані Морган Маер, амерыканскай пісьменніцы, якая стала вядомай дзякуючы серыі раманаў "Прыцемкі". Дзве пазіцыі займаюць рускія аўтары. "Майстар і Маргарыта" Міхаіла Булгакава — пяты радок, а кніга Барыса Васільева "А досвіткі тут ціхія…" — восьмая ў топ-рэйтынгу.

■ Беларускіх аўтараў у рэйтынгу маладых чытачоў Навагрудчыны двое. А чатыры пазіцыі займаюць кнігі Стэфані Морган Маер, амерыканкі, якая стала вядомай дзякуючы серыі раманаў "Прыцемкі".

На дзявятым месцы кніга "Спяваючыя ў цярноўніку" аўстралійскай пісьменніцы Колін Маккалоў.

Як бачна, у моладзі ў прыярытэтах як сучасная беларуская літаратура, так і замежная. Урэшце, ніякі рэйтынг, і наш — таксама, не можа ведаць, якая кніга закране да глыбіні душы і прымусіць думаць канкрэтнага чытача, а гэта, бадай, — самае галоўнае пакліканне. І ўсё ж з тым, што навагрудская моладзь вызначыла як самую чытаную літаратуру, варта пазнаёміцца. Нават для таго, каб ведаць, чым захапляюцца дзеці і ўнукі, каб быць на хвалі.

Фаіна МАЛЮЖЭНЕЦ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынга Навагрудскай раённай бібліятэкі

Дасье на героя

Чым можа зацікавіць чытача сельская бібліятэка? Якой павінна быць установа, каб вясковы працаўнік пасля напружанай працы завітаў сюды не толькі ўзяць пачытаць што-небудзь цікавае, але і з карысцю правёў свой вольны час?

Наведвальнікі гісторыка-краязнаўчага цэнтра.

Сельская бібліятэка аграгарадка "Агарэвічы" размешчана на трэцім паверсе будынка-велікана мясцовага Дома культуры. Тут карпатліва збіраюць краязнаўчыя матэрыялы. У выніку ўзнік гісторыка-краязнаўчы цэнтр "Бусліны край — мой вырай і прыстанак". Матэрыялы, прадстаўленыя тут, апавядаюць пра мінулае і сённяшняе вясковае жыццё і, канешне, пра людзей, якія сваёй працай стваралі гісторыю Агарэвіч.

Вялікую каштоўнасць ўяўляе тэматычнае дасье "Заўсёды помнім…" пра воіна-афганца Мікалая Крысюка, які не вярнуўся дадому з той вайны. Куточак, прысвечаны земляку, змяшчае ўспаміны аднакласнікаў, класнага кіраўніка, сяброў, ваенныя фотаздымкі і пасмяротныя ўзнагароды Мікалая. У бібліятэцы часта наладжваюцца сустрэчы з маці героя, з воінамі-інтэрнацыяналістамі, а таксама — патрыятычныя ўрокі.

Пра гады Вялікай Айчыннай нагадаюць дасье пра ветэранаў "Яны прайшлі па той вайне", успаміны бежанцаў, лёс якіх звязаны з нашым краем — "З гісторыі вёскі і лёсу людзей". Свята захоўваецца спіс загінулых на вайне землякоў "Не памірае памяць…". Гісторыка-краязнаўчы цэнтр змяшчае больш за дзясятак дасье пра арганізацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі вёскі. Праз фотаздымкі і ўспаміны людзей раскрыты гісторыі сельскага Савета, камбіната бытавога абслугоўвання, паштовага аддзялення, школы, юнацка-спартыўнай школы, ФАПа, дзіцячага садка. Цікавыя персанальныя дасье пра шаноўных людзей вёскі.

На тэрыторыі вёскі знаходзіцца сядзіба Апацкіх, якая з'яўляецца помнікам архітэктуры. Некалькі гадоў таму сюды наведаліся нашчадкі роду колішніх уласнікаў. Яны падарылі Агарэвіцкай бібліятэцы ўнікальныя фотаздымкі і дакументальныя матэрыялы. Таму сёння чытач можа разгарнуць схему панскіх уладанняў Апацкіх, а на фота разгледзець саму пані Апацкую, якая не толькі добра ставілася да вясковых людзей, але і сама шмат працавала.

Агарэвіцкая сельская бібліятэка з'яўляецца лідарам сярод бібліятэк Ганцаўшчыны па назапашванні краязнаўчых звестак. Паліцы гісторыка-краязнаўчага цэнтра налічваюць не адзін дзясятак дакументальных матэрыялаў і тэматычных дасье, сотні фотаздымкаў, і гэта яшчэ не скончаная праца. Гэта робіцца для таго, каб маладое пакаленне не губляла сувязь з мінулым свайго роднага куточка, каб захаваць сённяшнюю вёску.

Таццяна МАЛЯЎКА,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай РЦБС

Чакаем вашых тэлефанаванняў з цікавымі навінамі **па нумары +375 17 334-57-23**

Бамонд: опера, балет

“Маленькі прынц”

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі, падобна на тое, усур’ёз узяўся за беларускі рэпертуар. Роўна праз чатыры тыдні пасля прэм’еры оперы Марыны Марозавай “Доктар Айбаліт” адбылося свята на балетнай вуліцы — з’явіўся “Маленькі прынц” Яўгена Глебава. Пры жыцці кампазітара гэты балет, напісаны ў 1982-м, ставіўся ў Хельсінкі (Фінляндыя), Маскве, Ніжнім Ноўгарадзе, Самары. Але ў нас — абсалютна новая версія. Нават па музыцы!

Надзея БУНЦЭВІЧ

Ды ўсё ж цяперашняе ўвасабленне аповесці Антуана дэ Сэнт-Экзюперы на нашай музычнай сцэне не першае. У 2008-м Музычная капэла “Санорус” паставіла аднайменную оперу Андрэя Мдзівані, напісаную чатырма гадамі раней, і шмат вазіла яе па краіне, выклікаючы фурор у дзяцей і іх бацькоў. Можна згадаць і пластычны спектакль “Дзэрт” (“Пустыня”) Польскага тэатра танца, паказаны тры гады таму на сталічным фестывалі “ТэАРТ“. Асабіста я бачыла балет Львоўскага опернага тэатра імя Саламіі Крушальніцкай з музыкай украінскага кампазітара, а ў Інтэрнэце кожны можа паглядзець знакаміты французскі мюзікл Рыкарда Качыантэ, упрыгожаны неверагоднымі сцэнічнымі эфектамі.

Любое музычнае (а тым больш, харэаграфічнае) увасабленне “Маленькага прынца” — справа складаная. Каб не скаціцца да пераказу сюжэта ў рамках колішняга жанру харэадрамы, важна абраць неабходны ракурс. Гэта можа быць дзіцячы балет — пра падарожжы і прыгоды. Ці дарослы філасофскі, дзе Маленькі прынц успрымаецца як alter ego Лётчыка. Ці балет пра каханне, каб у цэнтры апынуліся няпростыя ўзаемаадносіны Прынца і Ружы. Ці — пра мужчынскае сяброўства і пошук уласнага “Я”, калі на першы план выйдзе Ліс. Пра што ж была гісторыя, якую пабачылі мы?

Балет — гэтак жа, як і пластычны спектакль — павінен “чытацца” без аніякіх дадатковых тлумачэнняў і тым больш пераказу, “пра што” ён пастаўлены. У зале ж не-не ды луналі пытанні: “А гэта хто?”, “А што гэта?”. І гледачы зазіралі зноў і зноў у праграмку. Але і пасля дэталёвага вывучэння лібрэта засталіся пытанні. “А куды падзелася мама?” — запытала дзіця, убачыўшы фінал, дзе пасля абдымкаў з Каханай Лётчык на сцэне з дзецьмі. “Якая мама?” — здзівіліся бацькі. “Ну, тая, у чырвонай сукенцы”. Для дзяцей, мяркую, балет застаецца не да канца зразумелым. Для дарослых — на мой погляд, надта простым, на ўзроўні сюжэта і відэаілюстрацый да яго, якія не схіляюць да роздуму. Калі ж свядома прымушаеш сябе шукаць ды разгадваць “знакі-сімвалы” (згадваючы анонсы пра філасафічнасць спектакля), дык канцы з канцамі не заўжды сходзяцца. Спачатку Лётчык лётае проста ў шлеме. Каханая, адгаворваючы яго ад палётаў, дорыць белы шалік, а той быццам “душыць” яго. А потым такі ж самы шалік аказваецца і на Маленькім Прынцы. Дый крылы Пералётных птушак, з якімі герой падарожнічае па планетах, зроблены з той жа белай тканіны. Дык шалік — сімвал усяго палётнага ці, наадварот, зямнога? Ружы, што акружаюць Прынца ў час падарожжа, ніяк не падобны да Ружы, кінутай ім на сваёй планеце. А скінуўшы чырвоныя каўнеры, ператвараюцца ў змей, што значна спрашчае змест, набліжаючы яго да дзіцячай казкі пра пераўвасабленні.

Лібрэта, зробленае ўдавой кампазітара Ларысай Глебавай і харэографам Аляксандрай Ціхаміравай, патрабавала некаторых змяненняў у партытуры. Для балетаў, у тым ліку айчынных, гэта — справа звыклая. У свой час Валянцін Елізар’еў, яшчэ маладым харэографам, не пабаяўся папрасіць расійскага мэтра Андрэя Пятрова перапрацаваць і дапісаць партытуру “Стварэння свету“. А з Глебавым, працуючы над “Цілем Уленшпігелем”, увогуле сварыўся, бо той не пагаджаўся на купюры. І хаця некаторыя музыказнаўцы і дагэтуль шкадуюць пра скарочаныя ў ім старонкі, гэта, на маю думку, пайшло балетнай драматургіі на карысць, бо ў спектаклі больш ярка выявілася музычна-пластычная сімволіка. І замест паслядоўнага выкладання гістарычных падзей далёкай Фландрыі ўзнікла блізкая кожнаму прытча пра каханне, здраду, уладу, барацьбу, смерць і неўміручасць.

У “Маленькім прынцы” — наадварот, дадаліся новыя фрагменты, але без пазначэння аўтара рэдакцыі. А гэта Дзмітрый Даўгалёў, адзін з лепшых выпускнікоў майстра. Для Танца нелюдзяў узята музыка з балета Глебава "Выбранніца" з этна-ўхілам, далучыліся іншыя нумары, аўтарскія ўстаўкі. Асабліва вылучаюцца эпілог, дзе тэма Адажыа Прынца і Ружы праходзіць у мажоры, а таксама Адажыа Лётчыка і Каханай, дзе мелодыя так і не з’яўляецца, з-за чаго ўвесь нумар успрымаецца фанаграмай-мінусоўкай для патэнцыйнага саліста. Гэта цалкам змяніла не толькі драматургію музыкі, але і яе стыль. Як вядома, тэма Адажыа спачатку была выкарыстана Глебавым у кінастужцы “Дзікае паляванне караля Стаха” і толькі потым перанесена ў балет, застаўшыся там устаўкай з нейкага “іншага свету”, што, тым не менш, адпавядала характарам “незямных” герояў. Тэма праходзіла тройчы, утвараючы размеркаваную трохчасткавую форму: у канцы балета Адажыа паўтаралася цалкам, а ў сярэдзіне другой дзеі, калі Прынц сустракаў шмат аднолькавых Ружаў, мелодыя скажалася, распрацоўвалася. Цяпер тая музычная тэма і, адпаведна, яе кіношны ўхіл становяцца ў балеце галоўнымі, пераважваючы ўсё астатняе. Хтосьці ўзрадавана ўбачыць у гэтым подых сучаснасці, бо заходні музычны тэатр акадэмічнага напрамку даўно імкнецца і да полістылістыкі, і да шчыльных кантактаў з кінамузыкай (дададзім, што пакуль не пастаўленая опера “Чорны манах” Алега Хадоскі — акурат такая па стылі). Але ў балетах Глебава галоўным выразным сродкам было іншае, найперш, тэмбравыя характарыстыкі, сціслія лейтматывы-сімвалы, якія ў цяперашнім спектаклі, вядома, не зніклі, але аказаліся адсунутымі на другі план, быццам “змікшываліся” ў агульным зладжаным гучанні аркестра (дырыжор — Алег Лясун).

Харэаграфія Аляксандры Ціхаміравай больш цікавая і насычаная, чым у яе ранейшым балеце — “Шчаўкункую”. Але ў параўнанні з іншымі складнікамі спектакля часяком застаецца “фонавай”. Адсюль адчуванне асобных “устаўных” нумароў — накшталт з’яўлення Баабабаў з элементамі эстраднага танца ці П’яніцы ў атачэнні дзяўчатбутэлек з рысамі народнага. Прыдумаць штосьці новае ў пластыцы неверагодна цяжка, харэаграфічныя знаходкі сёння — на вагу золата. І калі ёсць хоць якая адметнасць, незашмальцаваны рух ці падтрымка, дык і падносіць гледачу іх трэба не раўнуючы як дзівосную страву ў цэнтры стала. У павольных па музыцы Адажыа, дзе эрца павінна замірыць ад прыгажосці чалавечых цел ды іх спляценняў, даволі шмат мітусні. Дый шматлікія відэа, мільгаючы замест задніка, адцягваюць на сябе залішнюю ўвагу, дадаюць у відовішча эстэтыку галівудскіх апакаліпсісаў. Думаецца, узаемасувязі экраннага і сцэнічнага дзеянняў маглі стацца больш глыбокімі.

У многіх герояў ёсць свае балетныя правобразы, куды ярчэйшыя за іх новае ўвасабленне. Што ў спектаклі сапраўды “па-багатаму”, дык гэта сцэнічныя строі Вячаслава Окунева. Прызнання заслугоўваюць артысты і іх педагогі: усё добра вывучана, адрэпеціравана. Гледзячы на бліскучыя, віртуозна адточаныя па Вольгі Гайко, Ігара Аноўкі, Канстанціна Героніка, Людмілы Хітровай, марыць пра лепшае выкананне немагчыма. Але на другой прэм’еры з іншым складам артыстаў былі знойдзены новыя фарбы. Бо акцэнт аказаўся пастаўлены не на чысціню балетных рухаў, а на агульныя эмацыйны напал пры абмалёўцы характараў. Узнікілі больш відавочныя супрацьпастаўленні дарослага (Ягор Азаркевіч) і дзіця (Такатошы Мачыяма), зямной, прыземленай да побыту Каханай (Аляксандра Чыжык) і “незямной”, скіраванай у касмічныя далячыні Ружы (Яна Штангей з яе “нечалавечай” пластыкай) — тым больш, што абедзве гераіні з’яднаны падобнай позай рук.

Але такія дэталі — хіба для балетаманаў. Для шырокай публікі новы спектакль застаецца проста відовішчам.

К



Сцэна з балета "Маленькі прынц". / Фота прадстаўніка тэатрам

Новае прачытанне балета Яўгена Глебава

Тэму дзіцячай оперы з нагоды выхаду спектакля "Доктар Айбаліт" разглядаем **на старонках 4, 12.**

Мастыхін

Адна з шасці

Калегі, якія яшчэ і сябры

У галерэі “Вільнюс” — чарговая выстаўка. Гэтым разам адзіны праект склалі творы шасці мастакоў. Пяцёра з іх — жывапісцы. Гэта Анатоль Бляўскі, Уладзімір Кожух, Міхаіл Гаўрыленка, Уладзімір Дзядзюля, Ігар Арлоў. І адзін скульптар — Аляксандр Батвінёнак. Выстаўка называецца “Сябры”.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Калі ведаць творчыя асяродкі, дык такая назва падаецца крыху дзіўнай. Бо канкурэнты сябруюць рэдка. Але ў дадзеным выпадку яна насамрэч адпавядае характару стасункаў паміж згаданымі творцамі. Яны сябры не толькі з прычыны псіхалагічнай і творчай сумяшчальнасці, але і таму, што пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута ў 1980-х стажыраваліся ў Творчых майстэрнях Акадэміі мастацтваў СССР у Мінску (куды трапляў далёка не кожны) пад кіраўніцтвам такіх легендарных творцаў, як Міхаіл Савіцкі і Заір Азгур. Плён навучання ў гэтых майстэрнях адчуваецца і ў творах, экспанаваных на гэтай выстаўцы, хоць аўтары вучыліся там трыццаць гадоў таму. Думаю, гэтая акалічнасць, што нараджае пачуццё далучанасці да эліты, і яднае мастакоў, чые творы мы зараз бачым у “Вільнюсе”. Не ўсе ўдзельнікі выстаўкі па жыцці трапілі ў шорт-ліст сваёй творчай спецыялізацыі, але выдатнае майстэрства дэманструюць усе шасцёра. Вось таму мне і шкада, што сёння такіх майстэрняў няма. Можа, варта падумаць пра іх аднаўленне…

Ступень папулярнасці ў згаданых творцаў розная. Бадай, найбольш вядомы сярод іх Уладзімір Кожух, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Ягоныя творы знаходзяцца ў прэстыжных дзяржаўных зборах і прыватных калекцыях. Не аднойчы карціны Кожуха экспанаваліся за межамі Беларусі, прычым часта не ў складзе групавых выставак, а ў фармаце персаналіі. А персанальную выстаўку, скажам шчыра, пацягнуць здольны не кожны мастак. Кожух — вынаходца адметнага стылю і стваральнік характэрных тыпажоў, якія нясуць адбітак брутальнай прыгажосці. Гэтага дасягнення дастаткова, каб лічыць ягоную творчую кар’еру паспяховай. Шым больш прыемна, што мастак на дасягнутым не спыняецца і ўвесь час шукае і знаходзіць новыя тэмы і вобразы. У гэтай экспазіцыі Уладзімір Кожух прадставіў карціны пераважна на хрысціянскую тэматыку.

Анатоль Бляўскі працуе ва ўсіх жанрах станковага жывапісу. Ён творца экспрэсіўнага характару. Ягоныя дынамічна выбудаваныя краявіды, сюжэтныя карціны прасякнуты драматызмам на хісткай мяжы з трагічнасцю. Прынамсі, такое ўражанне ад карцін, прадстаўленых тут. Партрэты ж вабяць глыбокім псіхалагізмам.

Міхаіл Гаўрыленка — майстар краявідаў. Ён успрымае прыроду не фонам і рэсурсам жыццядзейнасці чалавека, але самадастатковай каштоўнасцю. Так ставіліся да прыроды нашы продкі ў тыя часы, калі гарады былі маленькія, а далягляды — вялікія. Гараджанін, усё жыццё якога праходзіць сярод бетону і асфальту, глядзіць на гэтыя краявіды з непрыхаванай настальгіяй.

Уладзімір Дзядзюля працуе не толькі ў станковым жывапісе, але і ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Праз гэта ў ягоных карцінах выразна праяўляецца дэкаратывізм, абагульненасць формаў, яркасць колеру. Да сваіх мадэлей аўтар ставіцца з добрай іроніяй, што не перашкаджае яму бачыць свет з філасофскага гледзішча.

Для Ігара Арлова гэта выстаўка — пасмяротная. Сёлета мастак пайшоў з жыцця. Яму было пяцьдзясят дзевяць гадоў. Гэтая сумная акалічнасць надае драматызм нават тым работам мастака, дзе закладзены ў аснову аптымістычны настрой і светлыя фарбы. Канкрэтыка і таямнічасць — вось, бадай, асноўнае, чым вабіць ягоны жывапіс.

Скульптар Аляксандр Батвінёнак з усіх жанраў аддае перавагу партрэту. Прычым, звяртаецца да знакавых постацей айчыннай і сусветнай культуры. Яго вабяць асобы, што здолелі пабудаваць віртуальны свет, які станоўча ўплывае на рэчаіснасць, фарміруе яе ў адпаведнасці з прынцыпамі гуманізму. Скульптар лічыць галоўным не партрэтнае падабенства, але сугучнасць аблічча ўнутранаму свету асобы.

Экспазіцыя атрымалася камернай паводле формы і разгорнутай зместам, шырынёй тэматычнага раскладу, сэнсавай глыбінёй твораў.

К

Фрагмент выстаўкі.

Мастыхін

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Грэшнай справай падумаў, што хутка прыйдзе час, калі ўсе былыя манументалісты, якія сёння не могуць прымяніць на поўную моц першапачатковы дар у афармленні інтэр’ераў і экстэр’ераў будынкаў, арганічна і на поўных, а не на птушыных правах увойдуць у секцыю жывапісу БСМ...

А што такое “іншыя паралелі” ў кантэксце выстаўкі? Па-першае, гэта своеасаблівы сінтэз мінулых пошукаў манументалістаў у галіне “станкавізму” (усе яны прайшлі добрую школу майстэрства ў Акадэміі мастацтваў і па малюнку, і па кампазіцыі, і па каляравай пластыцы: таму ім не трэба было “перавучвацца”). Па-другое, сёння, у соцыуме яны на сваіх палотнах імкнуцца прыцягнуць гледача да роздуму над праблемамі чалавека і грамадства, іх узаемапранікнення і ўзаемаадмаўлення. Праз прызму жывапісу спрабуюць весці дыялог адносна важных і асноватворных, на іх погляд, сфер быцця, такіх, як духоўнае развіццё, свабода і звязаныя з ёй абмежаванні, слушнасць выбару, апраўданасць надзей і чаканняў.

Частка ўдзельнікаў праекта ставіць перад сабой выключна эксперыментальныя задачы ў галіне “беспрадметнага” мастацтва ў разліку на разумнага гледача, нейкім чынам знаёмага з рознымі “-ізмамі” ў сучасным жывапісе. Эксперыменты розныя, не звязаныя адзін з адным ні тэматыкай, ні паслядоўнасцю жанраў, вобразаў, выяўленчых пераказаў. Пластычныя стратэгіі аўтараў свабодныя ад узаемаўплываў, іх аб’ядноўвае глыбіня задумак і эмацыйнасць рашэння, як, скажам, у палотнах “абстрактнага напрамку” — “Белае воблака над залатым полем” і “Трыракі” Сяргея Крыштаповіча, “Лабірынт” і “Кампазіцыя” Настасі Вабатавай, “Трыя” Сяргея Варкіна ці “Заплюшчы вочы” Станіслава Гурскага.

Вопыты паралельнага светаўспрымання, выходзячы за рамкі фармальнай гульні, пашыраюць гарызонты кожнага з мастакоў, адкрываюць багатыя магчымасці ў галіне колеру, фактуры, прасторы. Ёсць тут і рэчы зусім “натурнага” кшталту, напісаныя ў старых добрых традыцыях так званага рэалізму (“Край зямлі” Васіля Матусевіча, “Успамін” Сямёна Дамарада, “Сланечнікі” Валерыя Чайкі, “Травень” Уладзіміра Зленкі). А як бы паміж імі, паміж “мадэрнам” і “рэалізмам”, — філасофскія экзерсісы Уладзіміра Кандрусевіча, Камала Гаджыева, Ірыны Бараноўскай, Аляксея Хацкевіча…

Погляды мастакоў паралельныя, але знаходзяцца ў вострых перасячэннях з навакольнай прасторай. Аўтары, канешне, ахоплены жаданнем спасцігнуць асноўныя катэгорыі жыцця, адкрыць у ператвораных формах аб’ёму, кампазіцыі, рытму свае схаваныя быційныя заканамернасці. І такая аб’ядноўчая ідэя атрымлівае ў творчасці мастакоў большменш арыгінальную інтэрпрэтацыю.

Прызнаюся, выявіць у экспазіцыі лідараў — вельмі цяжкая задача, бо карціны, як і людзі, індывідуальныя, непаўторныя і па-свойму цікавыя. Бо адлюстроўваюць характар і настрой творцы, дэманструюць мастакоўскія магчымасці кожнага і выпраменьваюць пэўную энергетыку. Таму кожны аўтар заслугоўвае добрых слоў і пагадзіць, колькі вечна п’яным рэзанёрам, вымаўляючы знакаміты “гімн чалавеку” над скрыняй гарэлкі.

З’яўляецца і яшчэ адна дэталь, якая сваёй маўклівасцю не можа парушыць горкаўскага тэксту, але становіцца вельмі значнай для разумення канцэпцыі спектакля. У фінале баракі паступова зносяцца (сцэнаграфія Паўла Рабава). І рабочы, выносячы на сметнік няхітрыя пажыткі цяпер ужо былых насельнікаў, сярод рэчаў Кляшча (Алег Бузук), якога ўсе прывыклі абвінавачваць у бяздушнасці (як жа, жонка памірала, а ён і не збіраўся ёй спачуваць), знаходзіць новенькую, свежа выплаваную мадэль храма. У адным гэтым — уся амплітуда развіцця сапраўднага характару Кляшча. Рабочы круціць храм у руках, цягне на сметнік і... не можа выкінуць, зносіць кудысьці, каб прыхаваць. Сімвалічна?

Так, бо Максім Горкі ў гэтым спектаклі паўстае не заснавальнікам сацыялістычнага рэалізму, а пісьменнікам-рамантыкам, філосафам, сімвалістам, шукальнікам духоўных шляхоў, якія пралягаюць паўкуль не па самім гасцінцы, а дзесьці ўздоўж яго. У адпаведнасці з гэтым, яшчэ ў самым пачатку першай дзеі да тэксту п’есы дададзены верш Горкага “Фея”, а смерць Ганны (Тацяна Строк) выяўлена праз вальс гераіні ў белай сукенцы.

Але... За тры гады існавання спектакля ён быў паказаны, як прызналіся госці, усяго 12 разоў. Таксама сімвалічна?..

К



Андрэй Скіндзі. "Сцяна".

Настасся Хобатава. "Лабірынт".

Ірына Бараноўская. "Glorlyà".

“Неэўклідава” геаметрыя “Паралеляў”

Станковае і манументальнае перасякаюцца ці не?

Васіль Матусевіч. "Край зямлі".

Тэатральная плошча

Сімптаматычна, што сярод абласных тэатраў, прадстаўленых на Міжнародным форуме “ТэАРТ”, аказаліся менавіта тыя, у якіх праводзяцца і свае фестывалі. Усё ўзаемазвязана: дзе бачаць, што робіцца ў свеце, там ствараюць і больш цікавыя, “прасунутыя” спектаклі. А дзе працуюць таленавітыя рэжысёры (а працы менавіта такіх і вылучаліся на сёлетні “ТэАРТ”), там не баяцца паказваць, што робіцца ў свеце. На гэтым скрыжаванні з Еўропай Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы паказаў, што робіцца “на дне” — паводле аднайменнай п’есы Максіма Горкага, дзеянне якой перанесена ў сучаснасць.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Рэжысёр Цімафей Ільеўскі свядома набліжае да нас не толькі час, але і само месца дзеяння: дзесьці на мяжы з Заходняй Еўропай, на шляху між Варшавай і Масквой, пра што неаднаразова нагадвае ваказальны дынамік. “Паміж Польшчай і Расіяй” — гэта не проста ў Беларусі, а яшчэ і акурат у Брэсце. Але... цягнікі праляталі міма, героі ж застаюцца дзесьці на ўзбочыне — не проста дарогі, а ўсяго жыцця. Пачатак спектакля вымушае згадаць 1990-я з іх зломам эпох і агульнай разгубленасцю, як выжыць і што рабіць. У другой дзеі больш рашуча пазнаюцца рэаліі 2000-х. Усё ж разам набыванне значэння сімвала — той перабудовы (у самым шырокім сэнсе слова) грамадства і свядомасці, калі пры ўсім крушэнні ранейшых жыццёвых арыенціраў павінны застацца чалавек і чалавечнасць.

Героі Горкага, як аказалася, вельмі дакладна “праецыруюцца” на сучасныя тыпажы “страчанага пакалення“. Гаспадар начлежкі (Яўген Тарасаў) стаў тым “ворам у законе“, які пад прыкрыццем праваахоўчых органаў “здае ў арэнду” былыя пуні, прызначаныя пад знос. Яго жонка Васіліса (Караўна (Наталля Лабко) ператварылася ў жонку дробнага “алігарха” мясцовага пашыбу, якая нідзе не працуе, дзяцей не мае, таму і не ведае, чым яшчэ сябе заняць, апроч любоўных ўцех. Наста (Наталля Вараб’ёва) стала таннай прастытуткай, падобнай да неўладкаванага падлетка, якому так не хапае хатняга цяпла — хаця б у выглядзе плюшавай цацкі. Татарын (Сяргей Кандрацюк) — зборным вобразам гастарбайтара з нейкай усходняй краіны. Квашня (Яніна Малінчык), якая ў арыгінале была гандляркай пяльменямі, цяпер, мяркуючы па вялізнай пазнавальнай торбе, гандлюе прывезеным з замежжа шырспажывам. На першы план былі выведзены складаныя чалавечыя характары прадстаўнікоў гэтага неаднароднага “кантынгенту”, узаемаадносіны паміж імі. Дзеянне ўспрымаецца натуральным зрэзам “падгледжанай рэчаіснасці”, бо персанажы не ператвараюцца ў тэлевізійныя галовы, што гаворыць: кожны заняты сваёй справай, адначасова кідаючы рэплікі.

Можна шмат разважаць, наколькі дарэчна пераносіць дзеянне ў сучаснасць. Хтосьці з гэтым рынцыпова не пагаджаецца, хтосьці лічыць за моду, што хутка мінае, за імкненне ісці на паваду ў гледача, патураць ягоным густам, шукаць лягчэйшага акцёрскага хлеба, бо сыграць сучаснікаў прасцей, чым дакладна перадаць мінуўшчыну. Але ўсё, пэўна, залежыць ад кожнага канкрэтнага выпадку. У брэсцкім спектаклі, як ні дзіўна, такі перанос — зусім не галоўнае. Бо ён фіксуе ўсяго толькі знешні сэнсавы пласт. Куды больш важна тое, як трактуецца самы, бадай, загадкавы герой п’есы — Лука, наконт якога спрачаліся яшчэ сучаснікі пісьменніка. І якога савецкая крытыка адзінагалосна лічыла хітрым хлусам, ашуканцам, чыё імя паходзіць ад “лукавого”.

На мінскім паказе Луку граў сам рэжысёр (дададзім, што гісторыя пра чараду нечаканых і тэрміновых акцёрскіх замен у спектаклі магла б стаць тэмай асобнай публікацыі — пра мужнасць артыстаў і кіраўніцтва тэатра, якія нягледзячы ні на што ўсё ж не падвялі арганізатараў фестывалю, прывезлі і паказалі сваю працу). І гэта выявіла ў аблічы героя менавіта тыя рысы, якія і хацеў закласці пастаноўшчык. Лука стаў асацыявацца з “аднайменным” евангелістам, своеасаблівым місіянерамедыумам, які звязвае гэтую і тагасветную прасторы. Невыпадкова ён і з’яўляецца з ніадкуль, і сыходзіць у нікуды, не “матэрыялізуючыся” потым нават на паклоны. Старац побач з ім, бачны не ўсім героям, сімвалізуе Госпада. І ўся п’еса адразу становіцца не пра тое, што “жыццё зайшло ў тупік начлежкі”, а што выйсце ўсё ж павінна быць — абавязкова. Проста яшчэ не ўсімі знойдзена. Пры такім раскладзе Сацін паўстае не столькі антаганістам Луку, як пра тое прынята пластоў нашага грамадства праходзіць паралельна. Вечная барацьба і адзінства супрацьлегласцей. Так і мастакі: розныя па стылі, агульныя па духу. Спрэчкі іх вечныя, дыскусія бессэнсоўная, бо жывуць яны ў розных плоскасцях. Толькі плоскасці гэтыя, як бы хтосьці не стараўся ахоўваць сваю тэрыторыю, перасякаюцца. Як у “неэўклідавай” геаметрыі Лабачэўскага. Самае важнае ў такіх спрэчках тое, што ад перасячэння гэтых плоскасцей выйграем мы, гледачы — а не ўласна манументалісты ці “чыстыя” жывапісцы-станкавісты…

К

Сцэна са спектакля "На дне". / Фота прадстаўніка дзяржаўнага форуму

Дванаццаты паказ

“На дне” і шлях у нябёсы

Пакуль гарыць

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

І гэтым разам запыталіся: "А дзе коцікі?". "Адпачываюць", — адказала кіраўнік РДР Алена Барадзейка. Усё правільна. Коцікі стаміліся ад чужых вачэй, ім трэба "адпачыць" у фондах ды паднабраць сіл, патрачаных на нас. Неўзабаве яны зноў вернуцца на экспазіцыйныя паліцы. Гэта як святло згаслай зоркі. Аўтаркі ўжо няма, але дабрыня яе ўпэўнена асвятляе. Час ад часу і святлу патрэбны адпачынак…

Новая экспазіцыя — не менш цікавая ды пранізлівая. У галерэі РДР выстаўлены жывапіс Алены Бязега. За яго ўважлівым аглядам затрымаліся надоўга. Дзіўная справа: жанчына пачала вучыцца маляваць у 61 год. Смяецца: "У групе пры ДШМ я была самай "малодшай". Дзясяткі твораў напісаны за апошні год. Такі тэмп дапамагае Алене Фёдараўне змагацца з адзінотай і хваробамі. Мастачка выглядае бадзёрай. Яе творы — таксама. Так, іншым разам не стае тэхнікі, але ўсё гэта кампенсуецца шчырасцю і вялізнай прагай жыць не толькі для сябе. Побач з рэалістычнымі выявамі — абсалютна нечаканыя палотны. Да пракладу, чалавек у лодцы на аранжава-чырвонай воднай роўнядзі. Колер — не са спакойных. Але ад яго сыходзіць нейкае спакойнае ўпэўненае ды шчырае замілаванне. Хіба ж гэта не цуд!.. Вось які лірычны раздзел у нас атрымаўся.

А цяпер давайце разам падумаем: чаму большасць РДР Беларусі і на недахоп плошчаў пакутуюць, і не з'яўляюцца вось такімі адкрытымі і карыснымі для наведвальнікаў. Казаць па шчырасці, дык гэтых наведвальнікаў увогуле няма, адны толькі гурткоўцы. Дык ці не час зрабіць Лепельскі РДР, як цяпер прынята казаць, мадэльным? Няхай сюды прыязджаюць кіраўнікі РДР з усёй рэспублікі, натхняюцца ўбачаным ды пераймаюць вопыт. Свет не абмяжоўваецца роднымі весніцамі, ён — бясконцы і шматгранны. Нагодай для такога прыезду можа стаць і выстаўка "Фарбы Лепельшчыны", што ладзіцца ў райцэнтры раз на два гады і прадстаўляе працы як прафесійных мастакоў, так і аматараў ды пачаткоўцаў.

Напрыканцы раздзела вельмі хочацца памарыць, што першы паверх будынка крамы таксама стане ўласнасцю лепельскай "Скарбонкі" (так называецца не толькі сувенірны салон, але і суполка тутэйшых народных майстроў, якія займелі ўжо статус "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь"). Тады можна будзе перанесці ганчарныя майстэрні, якія ледзь змяшчаюцца ў аддзелаўскіх кабінетах. А ў наведвальнікаў з'явяцца дадатковыя магчымасці на ўласныя вочы прасачыць за стадыямі ганчарскай справы, бо на працу прафесіянала можна глядзець бясконца.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Мы мала пішам пра тэрапеўтычны эфект сапраўднага мастацтва. А шкада. Невыпадкова людзі, якія не мелі да яго ніякага дачынення, у сталым веку пачынаюць цягнуцца да музыкі, жывапісу, прыгожага пісьменства. Не як спажыўцы, а як аўтары-творцы. Так, трапляюцца графаманы і эпігоны, але шмат выпадкаў і таго, што аматары нечакана ўзнімаюцца да высокага ўзроўню шчырай самарэалізацыі. Ці не дамы рамёстваў павінны тут весці рэй?

"Бібліятэчная" ткачыха

І ў працяг вышэйназванай тэмы. Не першы раз мы сустракаемся з тым, што пры сельскай бібліятэцы ці клубе дзейнічае ці дзейнічаў невялічкі ткацкі цэх. Меў месца такі сімбіёз і ў Домжарыцах, пра якія мы пісалі ў мінулым нумары "К".

Рэпецыруюць "Беражніцы".

Мастак-аматар Алена Бязега.

Як нам патлумачыла намеснік начальніка аддзела ІРКСМ Тамара Бароха, цягам некалькіх дзесяцігоддзяў у Домжарыцах дзейнічала такая ўстанова, як Сельскі дом ткацтва. Аднак глабалізацыя і ўрбанізацыя не пакінула ёй перспектыў. У вёсцы засталося мала моладзі, а ахвотных навучыцца гэтаму рамяству — яшчэ менш. Цяжка не пагадзіцца з думкай, што калі няма працэсу пераемнасці, дык сэнс у існаванні такой установы губляецца. У выніку аптымізацыі Сельскі дом ткацтва разам з кроснамі і майстрам перанеслі ў вёску Старое Лядна. Дадаліся саломкапляценне, кераміка. У выніку ён трансфармаваўся ў Дом народнай творчасці. Пасля апошняй аптымізацыі ўстанова стала філіялам Лепельскага РДР.

Але калі ёсць Дом народнай творчасці, дык чаму б не зрабіць школу народных рамёстваў па ўзорах іванаўскай, горацкай, любанскай? Ад такой ідэі ў Лепелі катэгарычна не адмаўляюцца, але маюць свае контраргументы: спасылаюцца на вялікія выдаткі — трэба наймаць настаўнікаў, шукаць памяшканне, рыхтаваць базу для навучання. Ды і Тамара Максімаўна сумняецца ў мэтазгоднасці стварэння ў райцэнтры падобнай школы, бо пераканана, што традыцыйная культура бліжэй, найперш, сельскаму насельніцтву. На яе думку, сучаснасць дыктуе свае ўмовы, а традыцыя адыходзіць на другі план, становіцца дэкаратыўнай.

І тым не менш Лепельшчына можа пахваліцца сваёй сістэмай навучання народнай культуры: сёння там эфектыўна працуе Стайская дзіцячая школа традыцыйнай культуры — філіял Лепельскай школы мастацтваў. Яе дзейнасць ахоплівае песенную, харэаграфічную, танцавальную традыцыйную культуру мясцовага рэгіёна, а таксама дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Што ж, мусім толькі пашкадаваць, што лепельскія Стаі гэтым разам засталіся збоч нашых аўтатураўскіх шляхоў.

Знарок у Камені

А вось у вёску **Камень** — апошнюю ў нашым аўтаваяжы па Лепельшчыне, — усё ж патрапілі. Галоўная адметнасць паселішча ў тым, што непадалёк ад яго нарадзіўся Тодар Кляшторны, які стаў паэтам і быў беспадстаўна рэпрэсаваны ў 1937-м. Пры бібліятэцы, якой кіруе Ірына Знарок (ацаніце смак беларускага прозвішча!), дзейнічае музей пісьменніка. Маленькі, але досыць цікавы. Сімвалічна, што наш прыезд супаў з днём ушанавання памяці таленавітага літаратара.

Музей створаны яшчэ ў 2003 годзе. Ірына Знарок узначальвае ўстанову з 2009-га, а разам з тым з'яўляецца і дэпутатам мясцовага сельсавета. Такое спалучэнне ідзе на карысць агульнай справе: сельсавет дапамагае скасіць тра-

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Мёршчына /

У душы сваёй храм пабудуем

Днямі Язна (Мёрскі раён) стала сапраўдным царкоўным цэнтрам. Сюды з'ехаліся прадстаўнікі 14 праваслаўных нядзельных школ з рэгіёнаў Віцебшчыны. Сярод іншых выступалі язненцы і мярчане. Шосты па ліку фестываль "Благавест" меў важны, жыццеставральны напрамак, падкрэслены дэвізам "Захоўвай, Гасподзь, ачаг сямейны".

Напачатку адбыўся малебен у Спаса-Праабражэнскай царкве. Затым у Доме культуры выхаванцы Язненскай нядзельнай школы прыходу Спаса-Праабражэнскай царквы прыгожа спявалі…

Дзеткі з нядзельнай школы з Бягомля Докшыцкага дабрачыння даводзілі, што ў сне ахоўваюць нас дзве бяссонніцы — вочы мамы і Багародзіцы. Браслаўчане з прыходу Свята-Панцеляіманскага жаночага манастыра спявалі гімн Божай Маці "Радуйся, нявеста нябесная". Выхаванцы нядзельнай школы храма Святога Мікалая Цудатворцы распавялі пра святы куточак на іх зямлі — Сар'е, які заўсёды наведваюць паломнікі. Шчасце нараджаецца ў сям'і, сцвярджалі дзеткі і прасілі Бога ахоўваць сямейны лад. Выступоўцы з Варапаева, што на Пастаўшчыне, паказалі цікавую інсцэніроўку.

Глыбоцкія выхаванцы песнямі і дарэчнымі словамі падтэкстна нагадалі біблейскі сюжэт пра вясёлку — сімвал, што на зямлі ніколі не будзе патопу. Вароніцкае аб'яднанне па інтарэсах праваслаўнай скіраванасці з Полаччыны побач са знакамітай "Спадчынай" гаварылі прыгожыя словы пра сям'ю. Пасялкоўцы з Начы, што на Полаччыне, параўналі чалавека з дрэўцам і спявалі пра рамонкавыя палі.

Усе атрымалі дыпломы і падарункі, у сумеснай фінальнай песні заклікалі заўсёды аберагаць адно аднаго. Мясцовы святар Сергій Гуцко падзякаваў выкладчыкам. Дарэчы, язненцаў рыхтавала Ірына Бахір, мярчан Таццяна Пацеенак. Старшыня Язненскага сельсавета Валянціна Фядзьковіч аб'явіла тэму наступнага фестывалю "Дзеля жыцця на Зямлі". Дарэчы, Валянціна Мікалаеўна разам з галоўным урачом участковай бальніцы Уладзімірам Пашковічам (да слова, нязменным вядучым "Благавесту") і настаўніцай на заслужаным адпачынку Ірынай Стома сталі галоўнымі ініцыятарамі правядзення на язненшчыне такога мерапрыемства.

Алена БАСІКІРСКАЯ
Фота Казіміра БЛАЖЭВІЧА

Валожыншчына /

Бона Івянецкая

У Івянецкім музеі традыцыйнай культуры экспануецца выстаўка нумізматыкі і баністыкі "Скарбы роднай зямлі" з прыватных калекцый Алега Буткевіча, Яўгена Паплаўскага, Валерыя Мазуры. Амаль усе матэрыялы выяўлены на тэрыторыі былога Івянецкага графства.

Выстаўка адметная тым, што дае магчымасць візуальна дакрануцца да гісторыі грашова-гандлёвых стасункаў на беларускіх землях ад часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза да картак спажыўца, чэкавых кніжак, талонаў і папяровых банкнот незалежнай Беларусі.

Россып старадаўніх манет ад гаршка задымленай керамікі сімвалізуе скарбы, якія нашы продкі захоўвалі ў роднай зямлі падчас ваенных ліхалецццяў, — з'яўляецца ўводнай часткай у экспазіцыю.

Адным з рарытэтаў, які вылучаецца з мноства артэфактаў, з'яўляецца Івянецкая Бона наміналам 10 грошаў, адчаканеная з цынку спажывецкім кааператывам 6-га батальёна Корпуса памежнай аховы "Івянец". Такія боны-знакі выкарыстоўваліся з сярэдзіны 20-х гадоў XX стагоддзя і на тэрыторыі тагачаснай Заходняй Беларусі.

Дзякуючы скрупулёзнай працы супрацоўнікаў музея праведзена навуковая класіфікацыя экспанатаў, падрыхтаваны каталог-дапаможнік для наведвальнікаў, што стварае перадумовы дэталёва прааналізаваць і змястоўна ўспрыняць складаны матэрыял.

Алег РАМАНОЎСКІ
Фота манет прадастаўлены Івянецкім музеем традыцыйнай культуры

Падчас фестывалю ў Язні.

Віцебшчына /

Пісанка ды набойка

4 лістапада ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся семінар "З вопыту работы па збераржэнні і захаванні традыцыйных рамёстваў", у якім прынялі ўдзел дырэктары і спецыялісты дамоў і цэнтраў рамёстваў Віцебшчыны.

Падчас семінара былі разгледжаны перспектыўны план мерапрыемстваў на будучы год, канцэпцыя правядзення свята-конкурсу "Сцяжкі майстэрства", што адбудзецца 28 лістапада ў Сянно.

У межах семінара ўсе прысутныя змаглі прыняць актыўны ўдзел у майстар-класах па такіх відах дэкаратыўна-прыкладнога мас-

Майстар-класы на семінары ў Віцебску.

Свяча?..

Аграгарадкі бываюць рознымі

ву вакол будынка, падфарбаваць падлогу, абслугоўваць аддаленыя вёскі, прадастаўляючы транспарт…

Але вернемся да музея. Тут выклікаюць інтарэс асабістыя рэчы з хаты, дзе нарадзіўся будучы пісьменнік: ягоная калыска, мэбля і посуд, якім карысталася сям'я Кляшторных, унікальныя фотаздымкі пачатку XX ст., з якіх можна сярод іншага даведацца, што бацька Тодара Кляшторнага быў выдатным майстрам па вырабе мэблі.

Пераняла літаратурны талент бацькі старэйшая дачка Тодара Тадзіяна: пісала вершы для дзяцей, вяла літаратурны гурток. Менавіта яна і стала заснавальніцай гэтага музея. Дзякуючы яе высілкам і разуменню мясцовых работнікаў культуры кожны год на дзень нараджэння творцы, 11 сакавіка, ладзяцца "Кляшторнаўскія чытанні", якія не абмінаюць пісьменнікі і літаратуразнаўцы. Дзейнічае пры бібліятэцы-музеі і клуб для падлеткаў "Жыватворныя крыніцы", які рэгулярна ладзіць дні паэзіі. У музейнай зале часам праводзяцца і школьныя ўрокі, на якія прыязджаюць вучні і з іншых раёнаў. Арганізоўваюцца экскурсіі і для тых, хто адпачывае ў навакольных санаторыях — ёсць дамоўленасць з адміністрацыяй гэтых устаноў аб інфармаванні кліентаў пра такую магчымасць.

З музейных сувеніраў тут маюцца толькі буклеты на некалькіх мовах, прысвечаныя музею. Друкуюцца яны на каляровым прынтары на месцы па меры неабходнасці. А ў якасці рэкламы ўстановы Ірына Знарок стварыла старонку бібліятэкі-музея ў адной з сацыяльных сетак, якая ўжо налічвае 270 віртуальных "сяброў".

Трэба сказаць, што на Лепельшчыне не адна ўстанова такога тыпу. Да прыкладу, ёсць бібліятэка-музей у аграгарадку "Баброва", якая прысвечана вынаходніцкай дзейнасці даследчыка-селекцыянера Язэпа Мароза.

Бібліятэкар Ірына Знарок у музейным інтэр'еры.

Установа культуры ў Свячы (злева) і жылы дом аграгарадка.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Каторы раз у час нашых аўтатураў сустракаешся з цікавосткамі, пра якія раней нават і падумаць не мог. Такія ўстановы, як бібліятэка-музей Тодара Кляшторнага, з'яўляюцца патэнцыйным турыстычным аб'ектам, які знаёміў бы не столькі замежных гасцей, колькі, найперш, саміх жыхароў Беларусі з нашымі адметнымі творцамі, са славутымі і трагічнымі старонкамі нашай мінуўшчыны. Вось толькі, каб гэты працэс пачаў набіраць абароты, рэкламы ў сацсетках і высілкаў аднаго чалавека, відаць, замала.

А вось і народ!

Так, столькі наведвальнікаў, як у СДК вёскі Камень, мы за камандзіровачныя дні больш не бачылі. Справа ў тым, што ненаўмысна трапілі мы на рэпетыцыю вакальнага гурта "Беражніцы", што складаецца збольшага з мясцовай інтэлігенцыі. (Дырэктар Дома культуры Анжэла Пятрышча патлумачыла, што ёсць яшчэ інтэрнацыянальны ансамбль "Раксалана", тэатр мініяцюр "Самазванцы"…) Спевакоў тым кастрычніцкім вечарам сабрала мастацкі кіраўнік установы Ніна Бяздзенежных. Рэпеціравалі яны пад "мінусоўку" па-беларуску і рабілі гэта так самааддана, што зайздрасць брала: гэтыя ўмеюць узяць ад адпачынку па максімуму. Так, родная песня для "Беражніцы" — адпачынак. Таму і атрымліваецца яна так цудоўна….

Трохі сапсавалі сабе настрой, калі выехалі за Камень і скіравалися былі на Бешанковічы. Заўважылі на ўзгорку ўзбочыны штосьці падобнае да доўгатэрміновай агнявой кропкі часін вайны. Спыніліся, каб высветліць, якой вайны канкрэтна. Ніякіх указальнікаў-тлумачэнняў не знайшлі, як ні стараліся. Крыўдна. Ад пастаяннай пісаніны пра тое, што бракуе ў Беларусі на рэкламу гісторыка-архітэктурных цікавостак (у тым ліку і фартыфікацыйных), мы на пальцах мазалі панабівалі. Вывад адзіны: пра сталы турыстычны статус нашай дзяржаве марыць ды марыць. Дарэчы, прыдарожных абвестак пра бібліятэчны музей Кляшторнага па трасе на Камень таксама не было…

Цагліна пад дзвярыма

Яшчэ падчас падрыхтоўкі да камандзіроўкі намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага райвыканкама Марына Пясецкая параіла нам па шляху да райцэнтра завітаць у вёску Бачэйкава, дзе ўстановы культуры дзейнічаюць у паркавым антуражы былой сядзібы Цеханавецкіх. Дзякуем за ідэю! Мы ж, дарэчы, былі ў Бачэйкаве разы два, пісалі пра тое, што няблага было б выкарыстоўваць для патрэб культуры колішні службовы флігель сядзібы (дом пісара). Абяцаем наведаць гэтую кропку на карце раёна, калі сітуацыя пакрысе зменіцца.

Па ўласным жаданні і па дарозе на Бешанковічы спыніліся ля аўтобуснага прыпынку ў вёсцы **Свяча**. Запыталіся ў маладой жанчыны, дзе клуб. Яна не ведала. Выратавала школьніца: "Ды вось ён, за прыпынкам". Сапраўды, прайшлі якіх сорак метраў і ступілі на клубны ганак. Дзверы былі падпертыя цаглінай. З дапамогай шыльд высветлілі, што нядаўна ўстанова набыла статус "клуба-бібліятэкі" і ў гэты вячэрні час яна павінна працаваць. Падумалі, што хтосьці пажартаваў з кіраўніка ўстановы і "замкнуў" дзверы на цагліну. Адкінуўшы яе, пераканаліся, што ўнутры ўсе дзверы надзейна зачынены на ключ. Ніякіх пісьмовых тлумачэнняў сітуацыі паўсюднай "замкнёнасці" мы не знайшлі.

І ўвогуле, Свяча ў прыцемках добрага аптымістычнага настрою не дадавала. Бліжэйшыя ад клуба цагляныя дамкі глядзелі на вуліцу цьмянымі вачыма. А па гэтай вуліцы цягнуліся да крамы нейкія незразумелыя сугнеістыя асобы. Вокны свяціліся толькі ў краме. Скіраваліся туды і мы. Наведвальнікі вядомага выгляду выстраіліся ў невялічкую чаргу па немудрагелістым напоі. А крамніцы з ахвотай патлумачылі нам, што цэнтральная сядзіба мясцовай сельскай гаспадаркі перанесена нядаўна ў Бачэйкава. Але Свяча па-ранейшаму застаецца аграгарадком. Адпаведна, робім выснову, клуб-бібліятэка павінен працаваць.

Заставалася здзіўляцца, якімі рознымі на Беларусі з'яўляюцца і аграгарадкі, і іхнія ўстановы культуры.

Агульнае (не)лірычнае заключэнне

У параўнанні з культурай Лепельшчыны культура Бешанковічыны нагадала беспрытульнае дзіця. Не, яна здзіўляла крэатыўнымі знаходкамі і яркімі асобамі. Але станоўчае ўражанне ўвобмірг замянялася часам нейкім ды прыкрым пралікам. Але пра гэта — у наступным нумары.

К

Працяг аўтатура па раёнах Віцебшчыны — **у наступных нумарах "К".**

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Элементы экспазіцыі "Скарбы роднай зямлі".

Школьнікі ў Музеі Янкі Купалы.

Віцебск / Таямніца нашых званоў

Сустрэча з кандыдатам мастацтвазнаўства, выкладчыкам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, сябрам Асацыяцыі звонавага мастацтва Расіі Аленай ШАЦЬКО адбылася ў Віцебскай абласной бібліятэцы. Мастацтвазнаўца прэзентавала сваю манаграфію па званах праваслаўных храмаў заходніх рэгіёнаў Беларусі.

У кнізе адлюстравана гісторыя беларускіх званоў, пачынаючы з XI стагоддзя. Алена Шацько пашпартызавала і сістэматызавала 1747 іх адзінак XVI — XX стагоддзяў, запісала гук званоў у 247 храмах. Пачала сваю працу яна па блаславенні цяпер ужо Ганаровага Мітрапаліта Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі і працавала над кнігай пятнаццаць гадоў. У экспедыцыях, бібліятэках, архівах Літвы, Польшчы, Беларусі, Расіі даследчыца сабрала ўнікальны матэрыял пра званароў, захаваныя і вывезеныя экзэмпляры, традыцыі, звязаныя з тэмай навуковага пошуку. Па інфармацыі аўтара, прынамсі ў 21 праваслаўным храме Беларусі захаваліся старадаўнія званы, упрыгожаныя абразамі і надпісамі. Захавалася шмат дзе і традыцыя гучання званоў.

— З усёй постсавецкай прасторы толькі на захадзе Беларусі захавалася традыцыйнае званарства, — распавяла Алена Генадзьеўна. — У той час, як па ўсёй краіне ішло рабаванне храмаў, знішчэнне царкоўнай маёмасці, на гэтай тэрыторыі ў 1921 — 1939 гадах, званы гучалі, адліваліся. Людзі для гэтага збіралі па капейчыне. Ды і пасля Вялікай Айчыннай савецкая ўлада не змагла знішчыць традыцыі дарэшты. Людзі тады былі іншыя, яны не ўяўлялі жыцця без храма. У 1960-я яны з вілами ды граблямі абаранялі храмы і званы…

Сотні запісаных Аленай Шацько шчырых эмацыйных інтэрв'ю са святарамі, званарамі, гісторыкамі і вернікамі — сведчанне адмысловага стаўлення да звону і яго гучання як да чагосьці нематэрыяльнага. Некаторыя рэдкія кадры гутарак са спадчыннымі званарамі з вёсак Докшыцкага раёна ўвайшлі ў фільм "Магія гуку, або Аб чым звоніць звон" (яго можна знайсці ў Інтэрнэце), які быў прадэманстраваны удзельнікам сустрэчы. Сёння тых званароў ужо няма, але іх манеру працягнулі вучні: традыцыя не перарвалася.

Падчас візіту ў Віцебск Алена выступіла з лекцыямі ў адзінай на Беларусі дзіцячай школе званароў пры Пакроўскім саборы, у духоўнай семінарыі. Дзякуючы даследаванню традыцыйныя званы сельскіх праваслаўных храмаў захаду Беларусі стане магчымым прапанаваць для занясення ў спіс нематэрыяльнай спадчыны UNESCO.

Таццяна САЛАЎЁВА

Мінск / Супраца і інтэрактыў

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы стала працуе над пашырэннем праграмы ўзаемадзеяння са школамі. На пачатку навучальнага года была падпісана дамова аб супрацоўніцтве са сталічнай гімназіяй № 37.

У планах — урачысты прыём у гімназісты, які адбудзецца ў музеі Песняра, удзел у праекце "Закуліссе" і сумеснай з Рэспубліканскім тэатрам беларускай драматургіі акцыі "Чытаем Купалу разам", у "Гуканні вясны", інтэрактыўных музейных праграмах і ў Міжнароднай акцыі "Ноч музеяў": тады вучні старэйшых класаў стануць не проста наведвальнікамі, а памочнікамі-валанцёрамі.

У верасні адбылася першая акцыя "Дзядзька Янка, добры дзень!" з вучнямі пачатковых класаў гімназіі № 37. Для іх музей падрыхтаваў інтэрактыўныя заняткі з загадкамі, казкамі, крыжаванкамі і, канешне ж, падарункамі. А напрыканцы кастрычніка адбылося "Пасвячэнне ў гімназісты" вучняў пятых класаў гімназіі № 37. Падчас урачыстасці для дзяцей, бацькоў і настаўнікаў была арганізавана інтэрактыўная праграма з пошукам музейных экспанатаў, віктарынамі, загадкамі, майстар-класамі, сюрпрызамі і падарункамі. Кульмінацыяй імпрэзы стала ўручэнне акадэмічных шапачак і складанне клятвы гімназіста.

З 10 лістапада музей пачаў запіс на "Калядкі ў Купалавым доме", якія будуць ладзіцца з 21 снежня па 6 студзеня некалькі разоў на дзень. Для маленькіх сяброў і іх бацькоў мы падрыхтавалі цікавую святочную праграму і прапаноўваем даведацца, як адзначаюць Каляды ў Беларусі цягам апошніх ста гадоў.

Вольга ПАРХІМОВІЧ,
загадчык аддзела культурна-адукацыйнай работы Літаратурнага музея Янкі Купалы

Дзіцячая опера: што “Доктар…” прапісаў?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 4.)

Каб любіць беларускую оперу…

Пастаноўшчыкі зрабілі ўсё, каб “апраўдаць” вялізныя памеры сцэны і залы. Карабель (ён жа — медцэнтр) адбудаваны ў два паверхі (сцэнаграфія Аляксандра Касцючэнкі). Айбаліт ляціць на паветраным шары. Большасць касцюмаў (мастакі — Кацярына Булгакава і Марыя Мароз) — у стылістыцы роставых лялек. Але ўсё роўна… Бацькі! Калі хочаце адвучыць сваё дзіця ад “звычкі” наведваць оперу, купіце білеты на балкон! Бо нават з ягонага цэнтра, куды на гэты раз ласкава запрасілі крытыкаў і прэсу, добрай паловы не бачна і не чутна. Музыка туды — далятае, словы (за выключэннем, бадай, баса Дзмітрыя Трафімука ў партыі Кракадзіла) — не (унізе, куды я перабралася пасля антракту, яны чутны), бягучы радок, як і ўся авансцэна, не бачны. Затое ўсім відаць выратавальны нумар тэлефона — 103. Дарэчы, добры асветніцкі ход у спектаклі: дзеці запомняць гэтыя лічбы на ўзроўні падсвядомасці.

А куды звяртацца па камерную сцэну — прычыну многіх айчынных оперных хвароб? Тым больш гісторыя музыкі, як і медыцыны, сведчыць: усялякія эксперыменты пачынаюцца з мабільных, лакальных варыянтаў, каб потым перанесціся на больш буйны разгорт.

Адзіны, каго не пужае, а натхняе такая маштабнасць, — рэжысёр Міхаіл Панджавідзе. Ягоных прыдумак — смешных, іранічных, гарэзлівых, адкрыта “хуліганскіх”, “сцёбных” — безліч. Брава! Артысты, якія ў пачатку рэпетыцыйнага працэсу, як заўсёды, “плакаліся”, заўзята падхопліваюць прапанаваную ім атмасферу вясёлай гульні (хаця, зразумела, тая “нязмушанасць” каштуе ім нямала). На “подзвігі” штурхае іх і ўдзел Дзіцячага музычнага тэатра-студыі, бо юныя артысты спяваюць і танчаць нароўні з дарослымі.

Для трупы гэта не “тэатральны ранішнік” з адпаведным да яго стаўленнем, а крок наперад, магчымасць засвоіць новыя камічныя амплуа, вылучыць моладзь і ў тым ліку артыстаў хору (хормайстар — Ніна Ламановіч) на сольныя партыі. Для юных гледачоў — рознакаляровае мільганне, два паваротныя колы, відэа, шматлікія танцы (трэба бачыць, якія выкрунтасы вырабляе хаця б Алена Таболіч, увасабляючы Танечку), асабліва частыя ў другой дзеі (харэографы — Юлія Дзятко і Канстанцін Кузняцоў). Для дарослых — развенчванне савецкіх штампаў: ідэалагічных, оперных, балетных (тыя ж Чаплі ў ролі “лебедзяў”).

Але галоўнае выпрабаванне чакае публіку ў фінале. “Можа, пашкадуем Бармалея?” — запытваюць у залы. “Не!” — нікольки не задумваючыся, радасна крычыць дзятва, навучаная сучаснымі каштоўнасцямі “не дараваць”. І хаця опера завяршаецца “мірным саюзам”, такая рэакцыя не можа не хваляваць. Бо яна — бы першы званок у жыццёвым тэатры.

К

Чыя тэрыторыя бібліятэка?

Гомельская абласная: “Пакаленне Мы”

Сёлета, у Год моладзі, Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка запусціла наш праект “Пакаленне МЫ”. Мы стварылі яго разам з загадчыкам аддзела літаратуры па мастацтве Святланай Курашовай. Мэты — прыцягнуць маладых чытачоў, павысіць прэстыж кнігі і чытання, паказаць, што бібліятэка — не толькі сховішча выданняў, але і месца, дзе жыццё віруе.

Праект разлічаны на год, працуе ён у розных фарматах на некалькіх пляцоўках і разбіты на блокі “Час дзейнічаць”, “Час чытаць”, “Час пазнаваць”, “Час тварыць”, “Час жыць і быць здаровым”. Пастараліся ахапіць усе бакі цікавых тэм: валанцёрства, творчасць, самаразвіццё і атрыманне актуальных ведаў… У праграме: флэш-мобы і квэсты, дабрачынныя акцыі і літаратурныя чытанні, выстаўкі і канцэрты, трэнінгі, майстар-класы, дні бясплатнага абанемента… Рэалізавана ўжо шмат нашых ідэй. Распавяду пра самыя рэзанансныя акцыі.

Вершы ў кішэні

Гэтую акцыя правялі 20 сакавіка напярэдадні Сусветнага дня паэзіі. Мерапрыемства — нешараговае. Гаворка пра новы фармат сацыяльнай камунікацыі, дзе паведамленне выглядае як картка з радкамі класіка. Уявіце: яна раптам з’яўляецца ў кішэні мінака. Рэакцыя ў адказ заўжды зацікаўленая і эмацыйная: чалавек прыемна здзіўляецца і чытае. Бібліятэчная моладзь выбрала ўлюбёныя вершы, размясціла іх на імправізаваных каляндарыках (іх было 370) і раздавала асобнікі на вуліцах. А на пляцоўцы ля бібліятэкі працаваў “свабодны мікрафон”, і ўсе аматары паэзіі, якіх аказалася нямала, чыталі творы.

Падары радасць дзіцяці

У фае бібліятэкі праходзіў збор велікодных шакаладных яек для дзяцей, пазбаўленых бацькоўскага цяпла. Валанцёры сабралі 175 салодкіх сюрпрызаў. Дапамаглі студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажыўкааперацыі, Гомельскага інжынернага інстытута Міністэрства надзвычайных сітуацый Рэспублікі Беларусь і навучэнцы гімназіі № 56. Нашы супрацоўнікі таксама сабралі 28 падарункаў, а яшчэ падрыхтавалі тэматычную пастаноўку.

Падчас мерапрыемстваў акцыі. / Фота аўтара

Спачатку ладзілі акцыю ва Улукоўскай дапаможнай школе-інтэрнаце: трэба было бачыць светлыя і шчаслівыя дзіцячыя тварыкі! Апрача традыцыйных для гэтага свята яек, малечы атрымалі падарункі ад “Гомельхлебпрама” — нашага шматгадовага партнёра. Потым мы наведалі Гомельскі дзіцячы дом… Вельмі спадзяёмся, што падобныя мерапрыемствы стануць традыцыйнымі.

Бібліятэка — тэрыторыя маладых

Красавік быў адметны тым, што ў чытальнай зале Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны адбылася канферэнцыя “Бібліятэка — тэрыторыя маладых”. Была прапанавана прэзентацыя абласной установы. Аддзелы перыядычных выданняў, літаратуры на замежных мовах, літаратуры па мастацтве распавялі пра сваю работу. Студэнты пазнаёміліся з бібліяграфічным аглядам літаратурных навінак, з анонсам мерапрыемстваў праекта “Пакаленне МЫ”. Падобныя сустрэчы адбудуцца ў кожнай гомельскай вышэйшай навучальнай установе.

Памяняй цыгарэту на цукерку

У Сусветны дзень без тытуню (31 мая) бібліятэка разам з Гомельскім абласным спартыўным клубам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі зноў выйшла на вуліцы. Гаворка ішла пра шкоду курэння. Гамяльчане знаёміліся з медыцынскімі рэкамендацыямі для тых, хто вырашыў развітацца з небяспечнай звычкай. А валанцёры абменьвалі цыгарэты на цукеркі. Спецыяльна для акцыі было зроблена сто буклецікаў з інфармацыйнымі матэрыяламі. А на бібліятэчным ганку гучала энергічная музыка.

Арт-фэст “БІБЛІЯ#кантакт”

19 чэрвеня у нас пачалі працаваць пляцоўкі, на якія зазірнуў бадай кожны мінак. “Біблія#двор” прапаноўваў інтэрактыўны адпачынак і забаўкі для інтэлектуалаў. Запаўнялася дошка з пажаданнямі бібліятэцы. На кніжнай выстаўцы прэзентаваліся выданні пра музыку, аўтамабілі і матацыклы, макіяж і моду, чытанне для адпачынку і развіцця. На “Кніжным развале” можна было прыдбаць букіністычныя выданні.

Фотасцяна “Пазнай сябе сярод чытачоў бібліятэкі” ўразіла многіх: не кожны чакаў пабачыць сябе на вялікім прыгожым палатне. А на прыступках установы перад публікай працаваў малады мастак.

Мотаклуб “Начныя ваўкі” накіраваў сваіх прадстаўнікоў на “жалезных конях”. Ахвотныя зрабіць з імі сэлфі выстройваліся ў чэргі. Побач можна было пабачыць, як твораць спецыялісты па мехендзі (татуіроўка хной) і аквамакіяжу. На “Лаве пакінутай кнігі” любы ахвотны меў магчымасць атрымаць кнігу ці абмяняць сваю.

Асноўнай дзеяй фэсту стала канцэртная праграма “Бібліятэка — тэрыторыя маладых”. Выступілі народны студэнцкі хор народнай песні “Радзейка” Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Нестара Сакалоўскага, танцавальныя калектывы “MIXdance” і “Strawberry”, студыя ўсходняга танца, студыя чэрлідынгу (сінтэз танцаў, гімнастыкі і акрабатыкі), дуэт светлавога шоу. Інструментальныя творы прапанавалі самыя розныя гурты і салісты.

Анастасія КАРАТКЕВІЧ,
загадчык аддзела перыядычных выданняў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі

Ад рэдакцыі

Гэтая публікацыя — яшчэ адзін красамоўны доказ, што бібліятэкары за апошнія гады адабралі ў клубнікаў першынство ў крэатыве. Прынамсі, гомельскі праект “Пакаленне МЫ” аналагаў у клубнай сістэме рэспублікі не мае. Меркаваць пра гэта можна нават па асобных рэалізаваных акцыях і нават па такім інфармацыйным фармаце падачы фактаў.

Калі ж мы памыляемся, і нашы клубнікі маюць нешта аналагічнае, пішыце пра гэта ў рэдакцыю. Творчае спаборніцтва паміж работнікамі бібліятэк і клубаў — толькі агульнай справе на карысць.

Застаўся самім сабой…

Здаецца, усё ў Светлагорскай карціннай галерэі “Традыцыя” імя Германа Пранішнікава адбывалася так, як у лістападзе 1998 года. Чымсьці вельмі роднасныя сваімі краявідамі карціны, тыя ж самыя прыхільнікі таленту знакамітага земляка. Нават народныя песні быццам паўтараліся з таго часу… І словы, узнёслыя ад захаплення, таксама быццам тымі ж. Не было толькі самога мастака.

Два гады таму не стала Пятра Захарава. Пасля пажару ў будынку Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа, дзе загінулі амаль усе яго дэкарацыі да спектакляў беларускай класікі, ён пражыў нядоўга. Не вытрымала хворае сэрца.

І вось першая пасмяротная выстаўка з 23 твораў, так пазнавальных для яго землякоў, бо многія завіталі ў галерэю, каб яшчэ раз пабачыць Карпавічы ў фарбах — родную вёску мастака. А я доўга не мог адысці ад сузірання “Калядак на Палессі”. Воблачныя дрэвы, таямніча-казачны паўзмрок, непаўторна пазнавальныя вяскоўцы, разгарнуты мелодыяй гармонік і аблічча аднаго з калядоўшчыкаў… Здаецца, мастак нават здолеў напісаць і задорныя галасы тых, каго бачым. Гучная карціна!

Пётр Захараў. "Гарбузы".

Калі б нават не ведаў, што Пётр Захараў амаль усё сваё працоўнае жыццё звязаў з мазырскім тэатрам, то і тады было б няцяжка заўважыць тэатральную сутнасць гэтага мастака. Яго творы вызначаюцца менавіта той неабходнай дэкаратыўнай манументальнасцю, лаканічнасцю мастацкага абагульнення, адкрытай яркасцю каларыту, якія дазваляюць ім цудоўна глядзецца здалёк, сцвярджаючы рэальнасць уяўнага або ўяўнасць рэальнага. Нават нацюрморты “Гарбузы”, “Перагрэліся”, “Стомленыя трубы” выглядаюць чымсьці па-тэатральнаму дэкарацыйна і ў той жа час з нейкім зразумелым псіхалагічным падтэкстам. І вялікія, і сціплыя па сваіх памерах карціны таленавіта пашыраюць прастору, выклікаючы адчуванне бясконцасці вясновых і восеньскіх палёў, дубраў, бярозавых гаёў. Таму так прываблiваюць “Верасень”, “Набярэжная Мазыра”, “Свіслач”, “Лістапад”, “У лесе” і нават безыменны “Пейзаж”, які так і хочацца назваць “Прасветленасцю” за яго нястрымнае бярозавае святло. Ля такіх краявідаў пачуваеш сябе менавіта там, дзе яны былі напісаны.

Памятаю, як Пётр Сяргеевіч расказваў мне, што пасля заканчэння Віцебскага мастацка-графічнага вучылішча пераехаў у Мазыр, што яго творчую сутнасць хораша ацанілі вядомыя тэатральныя мастакі Барыс Герлаван і Яўген Чамадураў, якія і рэкамендавалі ў творчы саюз, што ў свой час быў узнагароджаны памятнымі залатымі медалямі па выніках усесаюзных тады аглядаў тэатральна-мастацкай творчасці. І заўжды вучыўся свядома і падсвядома ў Бялыніцкага-Бірулі, Цвіркі, Вашчанкі, Шчамялёва, Бараноўскага, Алейніка, Казакевіча… Але і тады было бачна, а зараз тым больш відавочна, што ён застаўся самім сабой, прыемна здзіўляючы майстэрскім абагульненнем, імпэтнасцю каларыту, безагляднай смеласцю сюжэтных і кампазіцыйных рашэнняў.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ,
мастацтвазнаўца
Светлагорск

ФРАНЦЫЯ

Насамрэч, назіраць за ёй — адна асалода. Асалода для вачэй. Асалода для розуму. Высокая прычоска, высокія абцасы, чароўная ўсмешка… Французскі шарм. Гэта жанчына, якая ўмее падносіць сябе, жанчына, якая ведае, чаго хоча, і якая валодае якасцю адчуваць жыццё "тут і цяпер". Гаворка — пра знакамітую актрысу тэатра і кіно Фані Ардан, якая прыехала на Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад", а журналісты ды гледачы мелі магчымасць пачуць яе думкі.

Занатавала Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Што сказала дзіва?

Фані Ардан — пра каханне, кіно і бласлаўёныя выпадковасці

Фота Аліны САЎЧАНКА

Уладальніцу прэміі "Сезар", прыза імя Станіслаўскага, музу Франсуа Труфо, выканаўцу роляў у фільмах "Суседка", "Вясёленькай нядзелі", "Калас назаўжды" Франка Дзэфірэлі… Фані Ардан прыбыла на "Лістапад" не проста ў якасці пачэснай госці, але і як рэжысёр (ды сцэнарыст) сваёй другой карціны — "Дакучлівыя рытмы". Як і сама спадарыня Ардан, яе стужка створана з эмоцый, прыгажосці, запалу…

Гарэзлівая дзяўчына — на свае вочы мне ўдалося бачыць, як Ардан падскокнула ад задавальнення пасля прэзентацыі ўласнай карціны, — моцная актрыса, цікавы аўтар. Больш за тое, ні для каго ўжо не сакрэт, што Фані Ардан ведае і любіць творы нашага нобелеўскага лаўрэата Святланы Алексіевіч ды сустрэлася з ёй у Мінску.

Пра ўвасабленні кахання

— З 14 — 15 гадоў галоўная тэма, якая мяне цікавіла ў кнігах, — каханне. Я прачытала амаль усё з рускай літаратуры, і тады мне падавалася, што толькі яе прадстаўнікі могуць распавядаць аб непадзеленым каханні. Заўжды аддавала перавагу "Ганне Карэнінай", а не "Мадам Бавары". У каханні ёсць месца цуду. У сваім фільме я распавяла пра тое, як заканчваецца каханне, а не пра тое, як яно пачынаецца. Для мяне каханне — барацьба, а самае важнае — здольнасць кахаць. З нецярплівасцю, з памылкамі. Ёсць рацыя, калі кажуць, што мая карціна — надзвычай французская: у кіно маёй радзімы заўжды ёсць месца каханню, мо таму і роляў для жанчын нашмат больш, чым, да прыкладу, у амерыканскім. Усё тое — не выпадкова. Мая гераіня — гэта і сястра для Марыі Башар з "Суседкі", і Мадам Бавары, і Карэнінай. Гэтыя жанчыны спальваюць сябе дзеля кахання.

Пра музыку ў карціне

— У тэатры мне давялося працаваць з вялікай французскай віяланчалісткай Соняй Відэр-Атэртон, якая вучылася ў Маскве. І кожны раз, калі я бачыла яе на сцэне, назірала за ёй — хваляванне ўва мне расло. Паралельна я пачала працу над сцэнарыем. Усё гэта не магло на мяне не паўплываць. Я зразумела, што гераіня мусіць быць музыкантам, такім, як Соня. І калі мы слухалі разам з ёй Баха, разважалі, як асобныя кавалкі могуць спалучацца з гукамі будоўлі, шумам, яна паказала мне, як гэта можа быць і нават перапісала асобныя кавалкі для віяланчэлі. Па жыцці я вельмі натхняюся музыкай, і, вядома, пастаралася ўсё, што люблю ў ёй, укласці ў мой фільм.

Пра здымкі як дар

— Складанасць сумеснай працы над фільмам была ў тым, што каманда — інтэрнацыянальная: акрамя Жэрара Дэпардзье, усе акцёры — не французы. Здымалі мы па тэхнічных прычынах у Партугаліі, краіне, дзе не гавораць на маёй мове, і мне даводзілася размаўляць па-англійску. Але я заўважыла такую рэч: усе акцёры — аднолькавыя. І японскія, і расійскія, і французскія… Калі кажаш "Матор!" — пачынаецца дзеянне, адчуваецца жарсць, адрэналін. Вось што самае галоўнае!

Аднойчы я працавала з кітайскім рэжысёрам Цай Мінлянам на Тайвані. І ён размаўляў толькі па-кітайску. Не на англійскай, французскай ці італьянскай мовах. Але я дзіўным чынам усё разумела — усё, што ён ад мяне хацеў. Згадваю і працу з Антаніёні, які ў той момант быў ужо зусім хворы і не мог размаўляць. Але мы таксама разумелі адзін аднаго. Ведаце, акцёры — свайго кшталту сабакі. Яны дзейнічаюць паводле чуцця.

Але падобныя малабюджэтныя здымкі — заўжды складаная справа. Аднак гэта і тое, дзеля чаго варта жыць. І пэўныя здарэнні на пляцоўцы могуць пайсці на карысць фільму. Увогуле, усё, што адбываецца ў гэтыя моманты, трэба ўспрымаць як дар Божы, выкарыстоўваць тое на карысць стужкі. І ні ў якім разе нельга ісці супраць абставін. Памятаю выпадак, які адбыўся на здымках "Атэлла" Орсана Уэлса. Рэжысёр таксама быў заціснуты ў вельмі жорсткія часавыя і фінансавыя рамкі. Да ўсяго, у дзень, калі трэба было здымаць масавую сцэну ў двары, былі скрадзены ўсе касцюмы. Але замест таго каб упасці ў роспач, рэжысёр сказаў: "Добра, тады будзем здымаць у хамаме". І вы, напэўна, памятаеце гэту сцэну, дзе ўсё акцёры распранутыя, хамам, пара, і адбываецца нейкае чараўніцтва ў тыя моманты. Але мала хто ведае, што знаходка рэжысёра — вымушаная мера.

Здаецца, нехта з рускіх класікаў сказаў, што свет належыць таму, хто ўмее з гэтым светам працаваць. Гэта выслоўе дакладна пасуе і кінасправе.

Пра настаўнікаў

— Напэўна, самы вялікі ўплыў, які я атрымала ад рэжысёраў, з якімі давялося працаваць, — іх энтузіязм, імпэт. Кожны з іх валодаў унікальным стылем, кожны знаходзіў свае дэталі ў гісторыях, якія распавядаў, у кожнага быў асаблівы погляд на свет і кіно. Але іх усіх аб'ядноўвала жарсць, тое моцнае жаданне працаваць, якое яны выпраменьвалі. Гэтаму я і вучылася ў іх.

Заўжды лічыла, што быць актрысай і рэжысёрам — божая ласка, якая на нас сыходзіць, і трэба атрымліваць асалоду ад кожнага імгнення ў прафесіі.

Пра літаратурную працу

— Мне вельмі спадабалася займацца літаратурнай работай, пісаць сцэнарыі. Па натуры я адзінокі чалавек, не люблю свецкае жыццё, у мяне не так шмат сяброў. Але калі я са сваім сшыткам, сваімі персанажамі застаюся сам-насам, гэта падобна на тое, нібы я збіраюся на спатканне. Дарэчы, калі я скончыла першую версію сцэнарыя і паказала яго аднаму чалавеку, ён мне адрэзаў: "Нейкая бессэнсоўная гісторыя, бо галоўная гераіня закахалася проста ў крэціна". І потым я перарабіла сцэнар і перарабіла мужчыну. Асабліва мне спадабалася ў гэтай працы абмяркоўваць і нават спрачацца пра людзей, якія не існуюць. І мне вельмі падабаецца, што пасля прагляду фільма ці спектакля, можна гэтак жа горача спрачацца і перажываць. Напрыклад, як пасля футбольнага матча.

Пра ідэальнае кіно

— Для мяне ідэальны фільм — той, пасля якога прагнеш жыць далей. Нават калі вы прыходзіце ў кінатэатр і глядзіце штосьці такое драматычнае, але потым сыходзіце з адчуваннем уздыму, жаданнем жыць — тое і ёсць для мяне ідэальнае кіно. Бо "жыве той, хто змагаецца", як сказаў Віктор Гюго.

Пра фінансы

— Вы ведаеце, я ніколі не ўмела "гандляваць дыванамі". Калі апынулася на перамовах наконт карціны, патэнцыйныя спонсары запыталі: "А на якую ўзроставую катэгорыю разлічана ваша гісторыя?". І ў мяне не знайшлося адказу. І, адпаведна, аргументаў, каб упэўніць іх даць грошы. Ведаеце, я заўжды раблю свае карціны з малым бюджэтам. Але заўважыла, што на каманду — акцёраў і тэхнічную групу — гэта ўплывае такім чынам, што кожны з іх імкнецца вельмі добра зрабіць сваю працу.

Пра ідэальнага мужчыну

— Вы ведаеце, ідэальны мужчына для мяне — гэта той, які кахае і якога кахаюць. Каханне — вось мой ідэал. А тое галоўнае, што здолеў перадаць мне мой бацька, гэта — незалежнасць і вольнадумства, якія захоўваю да гэтай пары. У мяне — няма забаронаў.

А наконт далейшай кар'еры, наконт таго, чаму аддам перавагу? Акцёрскай дзейнасці ці рэжысёрскай? Пажывем — пабачым…

К

"Вялікая опера" і стажыроўкі

Як развівацца вакалісту?

У вялікай зале Белдзяржфілармоніі выступілі лаўрэаты вядомага расійскага тэлеконкурсу "Вялікая опера" — казашка Салтанат Ахметава (С.А.) і беларус Ілья Сільчукоў (І.С.). У іх выкананні прагучалі рамансы рускіх кампазітараў. Мы ж скарысталіся магчымасцю даведацца, сярод іншага, пра карысць удзелу салістаў у телепраграмах і стажыроўках.

КАЗАХСТАН, РАСІЯ

— Каму належыць ідэя выступлення ў Мінску?

С.А.: — З паўгода таму ідэя з'явілася ў мастацкага кіраўніка "Музычнай гасцёўні" Белдзяржфілармоніі Таццяны Старчанка. Мы з радасцю яе падхапілі і сталі абмяркоўваць праграму канцэрта, выбіраць рамансы. Некаторыя з іх, сачыненні Рахманінава і Чайкоўскага, я спявала раней, калі вучылася ў Акадэміі музыкі ў Астане, а іншыя, напрыклад, творы Глінкі і старадаўнія рамансы, падрыхтавала адмыслова для гэтага выступу.

І.С.: — Некаторыя рамансы я таксама спяваў студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, дзе вучыўся спевам у класе Пятра Рыдзігера, іншыя ж вывучваў цяпер. Выкананне камернай музыкі патрабуе пэўнай манеры, адрознай ад выканання оперных партый. Таму пры падрыхтоўцы да гэтага канцэрта, безумоўна, пашырыў свой творчы далягляд. Урэшце, мне падабаецца спяваць песні — беларускія, рускія, італьянскія, — і я іх неаднаразова выконваў.

С.А.: — Хочацца падзякаваць Таццяне Старчанка, якая акампаніравала нам і засведчыла абсалютную дакладнасць ў стылістыцы выканання музыкі рускіх кампазітараў. Ілью было лягчэй, бо ён жыве тут, у Мінску, аднак Таццяна знайшла час і ў кастрычніку прыехала ў Астану, каб мы змаглі ўсё спакойна і старанна адрэпеціраваць. Любоў жа да рускага раманса абудзіла ў ва мне педагог — знакамітая казахская спявачка Харлан Каліламбекава.

Ілья Сільчукоў.

Салтанат Ахметава.

— Вы абое, напэўна, падтрымліваеце творчыя кантакты з педагогамі?

С.А.: — Педагог — мой галоўны дарадца ва ўсім, асабліва ў выбары рэпертуару. Вядома, цяпер яна не працуе са мной так шчыльна, як раней, але я прашу паслухаць мяне, калі твор ужо гатовы, вывучаны самастойна.

І.С.: — Я ж заўсёды стараюся запрашаць на свае выступленні Пятра Рыдзігера. Як строгі, але добры дарадца Пётр Васільевіч дзеліцца са мной заўвагамі, адзначае, над чым яшчэ трэба папрацаваць. Урэшце, тое натуральна: спявак павінен вучыцца ўсё жыццё.

— Напэўна, яшчэ адзін шлях для творчага росту спевака — стажыроўка.

С.А.: — Так, сёння надзвычай важна быць у курсе падзей у вакальным свеце, слухаць, як спяваюць калегі ў розных оперных тэатрах. Такую магчымасць можна атрымаць у міжнародных акадэміях. Я абрала Італію, і не памылілася ў сваім выбары. Пашырыліся веды ў галіне выканальніцкай вакальнай стылістыкі ў акадэмічнай музыцы, атрымала я і школу ўдасканалення італьянскай мовы — ці не галоўнай для вакаліста-акадэміста, вывучала італьянскую, французскую і нямецкую музыку розных часоў. Майстар-класы праводзілі вядомыя спевакі і педагогі. Скажам, аднойчы занятак давала Сільвія Шаш, якая працавала са мной над камерным рэпертуарам, а затым мы разам спявалі ў канцэрце, што адбыўся ў Рыме. У акадэмію таксама прыязджалі музычныя агенты і артыстычныя дырэктары фестываляў. Такім чынам, у рамках заняткаў прадастаўлялася рэальная магчымасць і папрацаваць з вопытнымі майстрамі, і быць пачутым кімсьці са сферы еўрапейскага опернага менеджменту. Гэта шлях для будучых ангажэментаў.

І.С.: — А мне пашчасціла стажыравацца на працягу трох месяцаў у рамках аўстрыйскай праграмы для маладых спевакоў Зальцбургскага фестывалю. Я наведаў усе спектаклі, якія ўвайшлі ў яго праграму, паслухаў, як спяваюць у іх знакамітыя выканаўцы. Акрамя таго, прыняў удзел у майстар-класах выбітных дырыжораў і спевакоў-барытонаў.

— Мяркую, школай стаў і ўдзел у праекце "Вялікая опера" расійскага тэлеканала "Культура", пераможцай якога названа Салтанат, а Ілья заняў трэцяе месца...

С.А.: — Няхай гэта і шоу-конкурс, але ўсе ўдзельнікі сапраўды вельмі сур'ёзна рыхтаваліся да выступленняў. Дзякуючы "Вялікай оперы" мы сталі вядомымі ў многіх краінах, паколькі расійскі канал "Культура" транслюецца на розных кантынентах. Хто б, напрыклад, даведаўся пра мяне ў Беларусі, каб ні гэтыя тэлеперадачы?

І.С.: — Разам з тым, тэлеканал не займаецца далейшым прасоўваннем пераможцаў. Але цяпер, у эпоху медыя, тэлебачанне творыць цуды. Я маю на ўвазе папулярызацыю артыстаў. Дзякуючы гэтаму праекту нас ўбачылі і пачулі тысячы людзей. І сярод іх ёсць тыя, хто можа дапамагчы з кантрактамі і кар'ерай. Не трэба хаваць, што мара ўсіх оперных спевакоў — выступаць у розных тэатрах свету. "Вялікая опера" здружыла ўсіх нас. Там, вядома, прысутнічаў элемент канкурэнцыі, але была і выдатная атмасфера дабра і творчасці. Менавіта таму і працягнулася наша творчае сяброўства з Салтанат, якое прывяло да сённяшняга канцэрта. Дарэчы, у нас з'явілася жаданне выступіць з праграмай "Рамансы рускіх кампазітараў" яшчэ ў Казахстане і ў Расіі. Спадзяёмся, мара тая ажыццявіцца!

Элеанора СКУРАТАВА, музыказнаўца

Чаму мэтр не грае рок?

“Для песень — брак салістаў, для мюзіклаў — драматургаў”

Мы сядзім у адной з мінскіх кавярняў з Уладзімірам КАНДРУСЕВІЧАМ: вядомым, папулярным, знакамітым айчынным кампазітарам. Мэтрам. Я мог бы шмат ужыць дыфірамбаў (у найвысокім значэнні гэтага слова) на яго адрас, і ўсе яны будуць праўдай. Абмяжуюся такім: гутару з сучасным класікам беларускай музыкі. Фонам гучыць таксама класіка — сусветнага року. Супадзенне? Мудрыя людзі кажуць, што супадзенні ў нашым свеце рэдкія, а трымаецца ён на заканамернасцях. Хай будзе так, і сённяшні госць “Культуры”, у дадатак да ўсіх эпітэтаў, яшчэ і рок-легенда: вакаліст, бас-гітарыст і аўтар песень гурта “Пане-браце”. Ці памятае хто пра такі калектыў?

Алег КЛІМАЎ



Уладзімір Кандрусевіч.

Музыка не для дзяўчынак

— Галоўныя моманты ў вашым рок-жыцці — гэта...

— Першы адносіцца, напэўна, да года 1960-га (я тады вучыўся ў “музыкалцы”), калі на школьных танцах у Гродне ўпершыню ўбачыў хлопцаў, якія выконвалі бігбіт: Міньку і Сафона (адзін граў на віяланчэлі, другі — на гітары). Яны і папрасілі мяне падыграць ім на піяніна ў песні “When the Saints Go Marching In”. Другі — гэта Мінск, у якім я паступіў у кансерваторыю на клас фартэпіяна. Да таго часу асвоіў гітару, і на сваёй першай “бульбе” пазнаёміўся з хлопцамі-пяцікурснікамі, якія гралі джаз. На “бульбе”! І я далучыўся да іх. Наступны — калі з кансерваторскімі стаў збіраць гурт, які мы назвалі “Ключы” (у яго, напрыклад, уваходзіў Ігар Палівода). Потым — гурт “Пане-браце”: ён рабіўся ўжо на досыць прафесійным узроўні і меў нядрэнную апаратуру, якую ў нас у 1970 годзе пад Усесаюзны конкурс артыстаў эстрады пазычыў ансамбль “Лявоны” (праўда, выправіўся ён у Маскву ўжо як “Песняры”).

— А мінскі бігбіт-фестываль 1971-га чаму не згадалі? Вы ж былі яго арганізатарам…

— Дык тое — фінальная кропка ў маім рок-жыцці. Пасля гэтага фестывалю мяне выключылі з кансерваторыі.

— “За пакланенне перад заходняй музыкай”?

— Вядома, гэта мелася на ўвазе. Але афіцыйна за тое, што без дазволу кіраўніцтва кансерваторыі выступіў на фестывалі ў складзе “Пане-браце”, за тое, што наш гурт атрымліваў грошы за выступы на танцавальных вечарынах Першага цаглянага завода. Памятаю, як мяне выклікаў рэктар Уладзімір Уладзіміравіч Алоўнікаў і зладзіў форменны допыт. Выключэнне стала шокам: я ж вельмі добра вучыўся, атрымліваў павышаную, імянную, стыпендыю. Але праз два тыдні, як кажуць, пад ціскам грамадскасці (выкладчыкаў, студэнтаў), быў адноўлены.

— Ці не ўзнікала ў вас думка пра тое, каб прысвяціць сябе рок-музыцы надоўга?

— Да таго ішло, каб не той “аблом”. “Сістэма” цалкам даходліва дала зразумець, што з рок-музыкай мне нічога не свеціць. Самы пачатак 1970-х: які ж хард-рок у краіне Саветаў?! І “Пане-браце” спярша самі затаіліся, а затым усё само сабой спынілася. Але ж і асаблівага рок-руху тады ў Беларусі не было: усё трымалася на асобных крэатыўных персонах, на асобных ансамблях. У нас жа сёння з таго першага пакалення рок-н-рольшчыкаў не засталося нікога, хто б працягваў займацца рок-музыкай хоць неяк на сталай аснове. Апошнімі былі, напэўна, Валодзя Угольнік і Гена Старыкаў, якія нядаўна пайшлі з жыцця. Большасць жа скончыла з той справай у 1970 — 1980-х, бо не адчувалася перспектыў у развіцці жанру, не было матывацыі ім займацца. Другое беларускае рок-пакаленне аказалася больш жывучым і прадуктыўным.

"Пане-браце". 1970 г. / Фотаздымкі з архіва Уладзіміра Кандрусевіча

— А парыў заняцца рок-музыкай быў звязаны з тым, што хацелася падабацца дзяўчынкам?..

— Не. Існавала патрэба граць музыку такога кшталту, самавыяўляцца праз яе.

— “Пане-браце" заходні рок “здымалі” ?

— Спачатку. “The Beatles”, “The Rolling Stones”, “The Animals”, “Creedence Clearwater Revival”, “Deep Purple”... Прычым “здымалі” альбомамі і часам гралі іх на выступленнях ці не цалкам. Потым я стаў складаць рускамоўныя тэксты на мелодыі тых жа “бітлоў”. Уплывала польская музыка, перш за ўсё Чэслаў Нэмэн. Беларуская мова ў нашай творчасці прысутнічала. Мы і называліся па-беларуску, і кампазіцыя, якая служыла візітоўкай гурта, была на беларускай мове: “Як паедзем, пане-браце, / У лес па маліну. / Як выражам, пане-браце, / У лесе дубіну”. Але выкарыстоўвалі мы мову ў той час як фарбу, не больш. Элементам беларускасці, нацыянальнай самасвядомасці яна стала для мяне значна пазней. Маё ўнутранае станленне ў гэтым сэнсе прыпала на перыяд знаёмства, у тым ліку, з Уладзімірам Караткевічам: у другі раз паступіўшы ў кансерваторыю на клас кампазіцыі і прыступіўшы да напісання балета “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, я бываў у яго дома.

Асоб на сцэне няма...

— Чым тлумачыцца ваша музычная “ўсёеднасць”? Да року вы таксама ў нейкай ступені вярнуліся ў 2007-м, напісаўшы мюзікл “Байкер”...

— Неяк паступальна тое адбывалася. Спачатку шчыльна заняўся класікай. Затым захацелася паспрабаваць сябе ў музыцы для радыё- і тэатральных пастановак. Таксама нешта атрымалася. Прычым спектаклі з маёй музыкай ішлі па ўсім Савецкім Саюзе і нават за яго межамі. І ідуць не толькі ў Беларусі дагэтуль. Лагічным этапам з’явілася кіно. “Усёеднасць” жа... Проста я люблю музыку. За выключэннем папсы.

— Вы да напісання поп-песень ставіцеся без захаплення, між тым, нейкі час пабыўшы мастацкім кіраўніком прадзюсарскага цэнтра, які спецыялізуецца на эстрадзе...

— Каб у нас была годнага ўзроўню эстрада, я, можа, і пісаў бы “кароткі метр” увесь час, а не перыядамі (як, скажам, для Алёны Ланской: яна, дарэчы, з маёй песняй “Белая ластаўка” ў 2011 годзе атрымала Гран-пры на Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні на “Славянскім базары ў Віцебску”). Дык такой эстрады маёй мары і няма. На жаль. Быццам бы паасобку назіраеш нешта цікавае, але якаснага “нарошчвання цягліц” чамусьці не адбываецца. Няма зрастання ў адзінае цікавай музыкі, тэкстаў, аранжыровак, галасоў, у тое, што было б канкурэнтаздольным адносна, да прыкладу, небанальнай сучаснай расійскай або ўкраінскай эстрады. Няма прадзюсараў, але, бачу, што і з талентамі сумнавата. Не бачу харызматычных асоб сярод новай плеяды выканаўцаў. Акрамя, мабыць, Гарыка Купатадзэ — Габрыэля, але і ён ужо не першы год спрабуе прабіцца. Куды толькі... Хоць той жа Лепс вунь колькі прабіваўся. Але Лепса на беларускай сцэне не назіраецца.

— Вось каго я распытаю пра феномен Лепса! Адкажыце мне як прафесіянал дылетанту: ён правільна спявае, так можна спяваць наогул, або гэта ўсё “панты”, гульня на публіку і дэманстрацыя вакальных магчымасцей і гукаў, дадзеных яму прыродай?

— Так трэба спяваць! Гэта ж не класічныя спевы, дзе неабходны абсалютна пастаўлены голас. “Разыначка” Лепса ў тым, што ён валодае фірмовай “верхавінай” — высокай тэсітурай, унікальным фальцэтам. Цікава, што мяне калісьці, вельмі даўно, з ім пазнаёмілі. Мы неяк у канцы 1970-х падхалтурвалі ў Сочы, граючы па выхадных у рэстаранах падменным калектывам, у той час, як асноўны ансамбль адпачываў. У адным з “шынкоў” мясцовы хлопец, які тусаваўся з намі, звёў мяне з тамтэйшым “аўтарытэтам”. Той спытаў: “Можаш паслухаць майго сваяка?” — “Вядома”. І праз нейкі час падвёў да мяне падлетка гадоў чатырнаццаці. Ён праспяваў некалькі песень. Ну... нармальна, звычайны голас. А праз шмат гадоў, перасекшыся з некаторымі відавочцамі той сустрэчы, я даведаўся ад іх, што гэта быў Лепс.

— Шкодна, напэўна, для звязак тое, як ён спявае...

— Шкодна. На канцэртах ужо не можа браць тыя “вярхі”. І ўсё роўна гэта выканаўца з вялікай літары.

— А тыя, хто сёння паступае ў нашу кансерваторыю на вакальны факультэт, могуць браць правільныя “вярхі”?

— Сітуацыя з тымі, хто паступае ў Акадэмію музыкі, не надта добрая, наколькі я ведаю. Іх стала менш. Пра што гэта кажа? Пра тое, што ў маладых людзей, верагодна, знікла цікавасць да атрымання ведаў і адукацыі ў падобнага кшталту ВНУ.

А дзе рок-легенды?

— Цяперашніх айчынных рок-музыкантаў слухаеце?

— Слухаю, калі раптам нешта трапляецца. Але па імёнах нікога не назаву, значыць, нічога такога надта выбітнага не сустракаў. Па тэлевізары некалькі разоў бачыў цікавыя каманды, але назвы ў памяці не адклаліся.

— Калі кажуць пра тое, што нашай рок- і папулярнай музыцы варта імкнуцца да заходніх узораў спеўнага мастацтва, вы таксама ў ліку падобных дарадцаў?

— Там усё іншае — музыка, галасы. Думаю, па вялікім рахунку нас не перарабіць, гэта нешта такое на генным узроўні, — чым мы валодаем, чаго можам дасягнуць, а чаго — не. Там жыццёвае крэда іншае. Мы ўсё адно станем у музыцы пераймальнікамі, інтэрпрэтатарамі, калі пойдзем шляхам нейкіх канонаў. Я выступаю за пошук чагосьці свайго, уласцівага той культуры, у якой жывеш. Праўда, працэс гэты складаны. Самы вялікі прарыў у беларускай папулярнай музыцы быў звязаны з “Песнярамі” Уладзіміра Мулявіна. Валодзя выдатна падбіраў галасы, у ансамблі былі цудоўныя аранжыроўшчыкі, вельмі “смачна” калектыў апрацоўваў народныя песні. Але калі тое было?..

— Беларуская мова — мова рок-н-ролу?

— Не сказаў бы. Хутчэй, мова бельканта, як італьянская. Яна вельмі мяккая, у ей шмат мяккіх галосных.

— Хто для вас рок-легенды ў нашай музыцы?

— Нікога не аднёс бы да іх. Жэня Канавалаў? Ну які гэта рок быў? Біт... Легенды ў поп-музыцы — калі ласка: Мулявін, Бадзьяраў. А рок-легенды ёсць толькі на Захадзе. Гэта ўсё ж іншая культура, хоць мы хацелі ды спрабавалі ў ёй нешта сваё зрабіць. І зараз маладыя спрабуюць. Рок — не толькі выкананне песень, а, хутчэй, жыццёвы прынцып. Нельга адначасова граць на сцэне рок, а дома апранацца ў халат, быць пай-хлопчыкам.

— Колькі ў Міка Джагера тых халатаў, напэўна...

— Таму для мяне рок-легенды — Джэніс Джоплін і Джымі Хендрыкс, а не Джагер, хай Мік мне даруе. Я бачыў і чуў “The Rolling Stones” ужывую. Што сказаць? Машына, звыклая праца. І... эстрада. Рок-н-рол — назапашванне не знешніх атрыбутаў, а ўнутраных — духу і сілы. Калі рок-музыкант зарабляе першы мільён, акружае сябе лімузінамі з яхтамі, то рок у яго жыцці канчаецца. А ён — гэта ахвярнасць, самазгаранне. Якім бы зараз быў Джон Ленан? Пра што спяваў бы, што казаў бы свету? Не ведаю. Напэўна, ён сышоў, скажам так, своечасова і на ўздыме.

З драматургамі напружана

— Што ў вашай творчасці адбывалася ў апошнія гады тры?

— Музыка да мюзікла “Соф’я Гальшанская” ў Дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. І чым даўжэй жыве гэта пастаноўка, тым больш я маю да яе дачыненне. Не проста аддаў музыку: мне патрабавалася ўнікаць у сцэнаграфію, у працу мастакоў. Пакуль такое маё “ўмяшальніцтва” церпяць. Выйшлі два фільмы: “Белыя росы. Вяртанне” і “Цуд-востраў, або Палескія рабінзоны”. Мюзікл “Дыліжанс” — лібрэта Леаніда Філатава па навэле Гі дэ Мапасана “Пышка” — у Тэатры імя Якуба Коласа, у Тэатры імя Максіма Горкага — “Круг кахання”. У працы знаходзяцца два мюзіклы. “Шляхціч Завальня” рыхтуецца для Музычнага тэатра, а “Пра Фядота-стральца…” пішацца: у канцы 1990-х я пазнаёміўся з Філатавым, і ён мне тады якраз даслаў рукапіс “Дыліжанса” з дарчым надпісам, сярод іншага там быў і дазвол на выкарыстанне яго твораў. А яшчэ пастаянна шукаю маладых аўтараў, шукаю сапраўдную драматургію. Паэты ў нас добрыя ёсць, а з драматургамі цікавымі праблема...

К

"Як акцёр хачу заўсёды працаваць..."

Амаль забыты народны артыст: наш зямляк Іларыён Пяўцоў

(Працяг. Пачатак у "К" №№ 40, 42 — 43, 45 — 46.)

Сёння "К" працягвае апавядаць пра лёс і творчасць знакамітага акцёра Іларыёна Пяўцова, ураджэнца Беларусі. Акрамя выканання ролі палкоўніка Бараздзіна ў знакамітай кінастужцы "Чапаеў", творца паўплываў на выбар выканаўцы галоўнай ролі ў стужцы Барыса Бабачкіна.

Барыс КРЭПАК

Іларыён Пяўцоў.

…Сапраўды, Ганна Сташэнка разам з мужам была прыкамандзіравана ў чапаеўскую 25-ю дывізію. Арганізавала там самадзейны акопны тэатр і наогул славілася дамай таварыскай і вельмі актыўнай. Але, галоўнае, здолела закруціць пры "жывым мужы" франтавы раман з самім начдывам — шчодралюбным Васілём Іванавічам! І гэта ў выніку паслужыла адной з прычын сур'ёзнага канфлікту паміж Фурманавым і Чапаевым. Па некаторых сведчаннях, дзіўнаваты "трохвугольнік" разрубіў камандуючы Усходнім фронтам Міхаіл Фрунзэ: ён ціха, без шуму перавёў Фурманава і яго жонку на новае месца службы — у Туркестан, дзе ў жніўні 1919 года — за месяц да гібелі Чапаева — прыняў камандаванне Туркестанскім фронтам.

Насамрэч, сапраўдным прататыпам Анкі-кулямётчыцы стала чапаеўская дывізіённая санітарка і ротная разведчыца Марыя Андрэеўна Папова, асоба даволі незвычайная. Пасля грамадзянскай вайны скончыла факультэт савецкага права Маскоўскага дзяржуніверсітэта, працавала да 1937 года ў Германіі рэферэнтам юраддзела гандлёвага прадстаўніцтва СССР (чытай: супрацоўнікам разведупраўлення), працавала разам з Аляксандрай Калантай у савецкім пасольстве ў Швецыі. Кавалер ордэна Баявога Чырвонага Сцяга. Аўтар тэкста песні "Гулял по Уралу Чапаев-герой...". Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыла ў Маскве на вуліцы Цвярской, 6. Менавіта ў яе кватэры нараджаўся будучы тэатр "Современник", а ейная дачка Зінаіда стала першай жонкай папулярнага акцёра гэтага тэатра Ігара Васільева. Вось такая дзіўная карусель бывае ў чалавечых лёсах...

Не буду расказваць пра іншых акцёраў — Кміта, Блінова, Шкурата, Сіманава, — бо гэта асобная тэма. Але пра тое, як Бабачкін стаў Чапаевым, павінен сказаць, бо тут без пяўцоўскага "ўмяшчальніцтва" не абышлося.

На гэтую ролю рэжысёры спачатку планавалі папулярнага акцёра Мікалая Баталава, вядомага гледачам па фільмах "Аэліта", "Пуцёўка ў жыццё" і "Маці". Аднак той катэгарычна адмовіўся здымацца ў "чарговай" карціне пра грамадзянскую вайну, бо гэта тэма ў тыя гады была дыскрэдытаваная вельмі бездапаможнымі фільмамі, а Мікалай Пятровіч цану сабе як творцы ведаў. Прэтэндаваў на галоўную ролю і Васіль Ванін, але пробы не прайшоў.

Трэцяй і апошняй кандыдатурай стаў Барыс Бабачкін, якога першапачаткова рэжысёры разглядалі на ролю чапаеўскага ардынарца Пецькі. Але менавіта па рэкамендацыі Пяўцова яго рызыкнулі паспрабаваць на ролю начдыва, і проба перасягнула ўсе чаканні. Адбылося ўсё так. Сцэнарый чытаўся на кватэры Пяўцова — у доме па вуліцы Дзяржынскага. Пяўцоў з Бабачкіным пачалі фантазіраваць: як ім бачыцца вобраз начдыва. І тут Пяўцоў папрасіў свайго былога вучня і калегу па Ленінградскім тэатры драмы Барыса Андрэевіча паказаць, як Чапаеў мог бы нарадзіць папаху. Завадны Бабачкін тут жа яе прымерыў, прыклеіў вусы, і яшчэ пакуражыўся — праспяваў "Чорнага ворана". У яго аказаўся вельмі прыемны голас. Васільевы ўсхвалявана пераглянуліся. Ім стала ясна: быць Бабачкіну "Чапаем" (так спачатку хацелі назваць свой фільм аўтары)!

Трэцяй і апошняй кандыдатурай на ролю Чапаева ў аднайменным фільме стаў Барыс Бабачкін, якога першапачаткова рэжысёры разглядалі на ролю чапаеўскага ардынарца Пецькі. Але менавіта па рэкамендацыі ўраджэнца Беларусі Іларыёна Пяўцова яго рызыкнулі паспрабаваць на ролю начдыва, і проба перасягнула ўсе чаканні.

Скажу так. Па вялікім рахунку, калі б Бабачкін і Георгій Васільеў не былі вучнямі Іларыёна Пяўцова, то начдыва сыграў бы іншы артыст. А спачатку здавалася, што Бабачкін зусім не падыходзіў на гэтую ролю, калі кіравацца апісаннем Чапаева ў аповесці Фурманава. Але я ведаю, што Бабачкін быў заўсёды зацятым, заўзятым праціўнікам выбару акцёра "па тыпажах" (а сучаснае кіно арыентуецца выключна на тыпажнасць). Бабачкін з яго акцёрскім талентам і тэмпераментам мог пераўвасобіцца ў любога персанажа. І ў выніку Чапаеў для большасці людзей — гэта менавіта ён, Барыс Бабачкін, з характэрнымі вусамі, гарачым позіркам і трошкі нервовым тварам. Чапаеў на ўсе часы! Як і Рыгор Мелехаў у выкананні Пятра Глебава з герасімаўскага "Ціхага Дону"…

Нараджэнне вялікага міфа

Я хацеў бы выказаць сваю думку на такую з'яву, як "кінафальсіфікацыя" гісторыі ў савецкім кінематографе. Праблема, на мой погляд, важная, і нават у наш час яна лунае ў прасторы, калі здымаюцца, скажам, гістарычныя і біяграфічныя фільмы. Менавіта пачынаючы ад "Чапаева" гісторыя, прадстаўленая ў мастацкім кіно, шмат дзесяцігоддзяў атрымлівала "версіі", па якіх школьнікі вывучалі быццам бы праўду мінуўшчыны.

Ленін меў рацыю, калі сказаў, што "з усіх мастацтваў для нас важнейшым з'яўляецца кіно". Так, кіно. Яно ўплывала на розум і сэрца людзей больш за ўсялякія падручнікі і дакументальны матэрыял пра мінулыя эпохі, і гледачы верылі ва ўсё, што расказвалі ім рэжысёры і акцёры. Для нас, напрыклад, хлопцаў пасляваенных гадоў, была толькі адна праўда — тая праўда, якую нам падавалі на кінаэкранах. Сёння амаль усе тыя звесткі ўспрымаюцца з гістарычнага пункта гледжання, мякка кажучы, наіўна, а часам і карыкатурна, асабліва ў адлюстраванні вобразаў "ворагаў". Але пры выпадку я гляджу такія стужкі, дзе мяне асабліва цікавяць не проста сцэнарныя ці рэжысёрскія памылкі, а гісторыка-ідэалагічныя "абсалютныя хібы". Хібы выключна міфалагічнага парадку.

Разумею, так было патрэбна партыйнай ідэалогіі. Праўда, у такіх фільмах працавалі выдатныя акцёры, часам сусветнага ўзроўню, гучалі цудоўныя песні, якія адразу станавіліся хітамі, запамінальная музыка, класічная і сучасная, што нямала садзейнічала глядацкаму поспеху. Напрыклад, "Месяцовую санату" Бетховена ў выкананні самога Іларыёна Пяўцова (у салоне штабнога вагона) я ўпершыню пачуў у фільме "Чапаеў", які хлапчуком паглядзеў на "прасціне" вясковага клуба годзе ў 1948-м, і яна мяне ўразіла. Хаця ў тыя часы я ў класіцы, вядома, анічога не разумеў: усё было на нейкай пачуццёвай падсвядомасці.

Прасцей кажучы, Сталін заўсёды праграміраваў будучыя гістарычныя фільмы. І праграма тая была звязана з надзённымі палітычнымі задачамі. Ён браў гатовую фігуру ў гісторыі, якая магла быць утылітарна карыснай з пункта гледжання тагачаснай палітычнай сітуацыі ды ідэйнай барацьбы. Так з'явіліся на экраны Шчорс, Аляксандр Неўскі, Суворaў, Кутузаў, Пугачоў, Салават Юлаеў, Мінін з Пажарскім, Іван Грозны, Катоўскі, Кармялюк, Пархоменка (дарэчы, у фільме Леаніда Лукава пра гэтага героя грамадзянскай вайны "псіхічная атака" кайзераўцаў была цалкам "пазычана" з "Чапаева").

Серыя такіх фільмаў была дапоўнена невыразнымі біяграфіямі дзеячаў культуры, мастацтва, навукі — таксама тых, хто мог бы карысна служыць непасрэдным інтарэсам сучаснасці. Ну і, зразумела, гістарычных фальсіфікацый тут (свядома!) не пазбегнуць. Міфалогія не толькі брала верх, але і ператваралася ў своеасаблівы, самы правільны "падручнік" гісторыі, па якім выхоўваліся пакаленні савецкіх людзей. Такое кіно — адна з прычын таго, што мы не ведаем сапраўдную гісторыю, слаба ідэнтыфікуем сябе з канкрэтнымі гістарычнымі асобамі, падзеямі, і аказваемся ў чымсьці падобнымі да "іванаў без роду і племені". А кіношныя "хібы" — гэта, так бы мовіць, для дыскусій вузкіх спецыялістаў — гісторыкаў-архівістаў у акулярах, якія на сваіх кухнях могуць крытыкаваць "малапісьменнасць" аўтараў або дзяржаўных заказчыкаў таго ці іншага фільма.

Вось такіх хібаў шмат і ў "Чапаеве". Хаця, па шчырасці, Васільевы таленавіта выйшлі з небяспекі ператварыць карціну ў агітку. Аднак прывяду некалькі прыкладаў, да якіх мелі непасрэдныя адносіны і стваральнікі легендарнага фільма. Думаю, для чытачоў гэта станецца цікавым, балазе кіназнаўцы, асабліва даследчыкі творчасці лаўрэатаў Сталінскай прэміі братоў Васільевых, не вельмі любяць "педаліраваць" такія моманты.

Пачну з самай знакамітай і ўражвальнай сцэны фільма — "псіхічнай атакі" капелеўцаў. Гэта чыстая выдумка рэжысёраў, але выдумка геніяльная, у якую паверылі ўсе гледачы, маўляў, менавіта так і дзеелася на самой справе. Памятаю, у 1963 годзе ў нашым універсітэцкім інтэрнаце на Мытнінскай набярэжнай Ленінграда акцёр маскоўскага Малога тэатра Барыс Бабачкін, напярэдадні атрымаўшы званне народнага артыста СССР, сустракаўся са студэнцкай моладдзю і шмат чаго расказваў пра "час і пра сябе". Зразумела, гаворка ў асноўным, ішла пра карціну "Чапаеў" і яго "зорную" ролю. Дык вось, мне запомнілася рэпліка артыста, што яго першы настаўнік Іларыён Пяўцоў яшчэ ў час знаёмства з рэжысёрскім сцэнарыем, зазначыў, што такая "псіхічная атака" ў той сітуацыі быць не магла з гістарычнага пункта гледжання. Аднак рэжысёры пераканалі яго ў тым, што яны здымаюць мастацкі, а не дакументальны фільм. Гэты эпізод, па іх словах, ёсць дынамічны вобраз супрацьстання "чырвоных" і "белых", як "столкновение двух воль", дзвюх сіл у грамадзянскай вайне, і таму павінен быць менавіта такім, так бы мовіць, "зборным", сімвалічна-алегарычным.

Кадры з фільма "Чапаеў". 1934 г.

Заканчэнне артыкула — **у адным з наступных нумароў "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстаўка **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя".**

Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Ад рэалізму да імпрэсіянізму"** (жывапіс XIX — XX стст. са збору Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі) — да 11 студзеня.
■ Выстаўка **"Залатое стагоддзе ткацтва. Кунтушавыя паясы і партрэты шляхты"** са збору літоўскага Нацыянальнага мастацкага музея М.К. Чурлёніса (Каўнас) — да 4 снежня.
■ Выстаўка твораў народнага мастака Беларусі **Мая Данцыга** — да 22 лістапада.
■ Выстаўка з музеяў Сеула, арганізаваная сумесна з Музеем універсітэта Дангук і карэйскім фондам пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Карэя ў Беларусі, — **"Жыццё Карэі"** — да 6 снежня.
■ Выстаўка жывапісу і графікі Уладзіміра Правідохіна **"MODUS VIVENDI"** — да 21 снежня.

Імпрэза:
■ Канцэрт з серыі **"Палітра любімай класікі"** — 21 лістапада а 19-й.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстаўка:
■ **"Прарок свайго часу. Адам Міцкевіч. Ілюстрацыі і медалі"** — да 25 снежня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Івянецкая школа керамікі: традыцыі і сучаснасць"** — да 9 студзеня 2015 года.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
■ "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выстаўкі:
■ Выставачны праект **"Вялікая прэзентацыя музейных рэліквій: 79 прыступак углыб гісторыі"** — да 31 снежня.
■ Выстаўка **"Рэтраспектыва 1965 — 2014"** з фонда Ісмаіла Ахметава па развіцці адукацыі і падтрымцы культуры (Расія) — да 15 лістапада.
■ Выстаўка **"Захавальнікі старой веры"** (мастацкая спадчына стараабраднікаў) — да 15 лістапада.
■ Выстаўка фатаграфіі **"Салавейчык — Аўгусціс. Пачатак і канец эпохі"** — да 8 лістапада.
■ Выстаўка **"Сярэбранае стагоддзе"** са збораў мінскіх калекцыянераў А.Сяргеева, І.Сурмачэўскага і іншых — да 6 снежня.
■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шляхах гісторыі"**.
■ Выстаўка твораў Артура Фанвізіна і Дзмітрыя Сурыновіча **"Дзівосны свет акварэлі"** — да 6 снежня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".

Выстаўкі:
■ Выстаўка твораў омскага майстра мікрамініяцюры Анатоля Каненкі **"Цуд пад мікраскопам"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстаўка:
■ **"Джунглі за шклом"** — да 6 сакавіка 2016 года.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстаўка **"Мумії свету"** — да 17 студзеня 2016 года.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстаўка:
■ Выстаўка сцэнічнага касцюма **"Карагод народных строяў"**.

Імпрэза:
■ **Літаратурна-музычны вечар эпохі барока** — 21 лістапада а 16-й.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстаўка:
■ Выстаўка дэбютнай аўтарскай лялькі **"Прэм'ера"** — да 22 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстаўка:
■ Выстаўка работ студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **"Alma mater & Cinema 2015"**, прысвечаная XXII Мінскаму МКФ "Лістапад-2015" — да 13 снежня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
ср. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка-праект **"Паспець паказаць..." Класіка ваеннай фатаграфіі. 1941 — 1945"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель X — XVII стст."** — да 13 снежня.
■ Выстаўка **"Вялікі баль у палацы Радзівілаў"** — да 31 студзеня.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
■ Выстаўка **"Фарбы пленэра"** — да 26 лістапада.

Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** — да 31 снежня.
■ Выстаўка **"Чорна-белыя вандроўкі Барыса Бокшы"** — да 15 студзеня 2016 года.
■ Выстаўка **"Свет Праваслаўя"** — да 15 студзеня 2016 года.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўка:
■ Выстаўка графікі Рыгора Сітніцы **"Я палітру расквечу каханнем"**.
■ Выстаўка **"Беларускі Арфей"**, да 90-годдзя паэмы "Сымон-музыка".

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўкі:
■ Выстаўка жывапісу і габеленаў Аляксандра і Тамары Сцяцэнкаў **"Украіна, цвеце любы, сонцам гадаваны..."**, зладжаная пры падтрымцы Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, — з 20 лістапада да 2 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстаўка:
■ Выстаўка **"Архітэктура як жыццёвая пазіцыя"**, да 85-годдзя з дня нараджэння заслужанага архітэктара Беларусі Юрыя Шпіта, — да 22 лістапада.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
■ Фотавыстаўка Рудольфа Клайна **"Сінагогі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы 1782 — 1944 гг."** — да 29 лістапада.
■ Персанальная выстаўка Генадзя Козела **"Чырвоная тэрыторыя"** (жывапіс, скульптура, арт-аб'екты) — да 22 лістапада.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
■ Выстаўка **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Куфэрак: шаноўная пані"** (рэканструкцыя гістарычных строяў пач. XIX — пач. XX стст.) — да 1 снежня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

ВЫСТАВАЧНЫЯ ЗАЛЫ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, ул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Рэспубліканская выстаўка мастацкага тэкстылю **"Знітаванне"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** (міні-выстаўка **"Эпоха гігантаў: знаходкі мегалацэроса ў Гомелі"** — да 30 лістапада).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выстаўкі "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выстаўкі:
■ **"Крохкія захавальнікі Слова"** (рэдкія рукапісныя і старадрукаваныя кнігі з фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля) — да 6 снежня.
■ **"Шкло, якое гаворыць праўду"** — да 30 лістапада.
■ Выстаўка **"Мадэрн — эпоха жаноцкасці"** (сапраўдныя строі і аксэсуары другой пал. XIX — пач. XX стст. са збору Музея гісторыі моды Марыны Івановай (Кіеў)) — да 17 лістапада.
■ Выстаўка традыцыйных нацыянальных кітайскіх строяў, жывапісу, рэчаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці — **"Зямля Паднябёсная"** — да 13 снежня.
■ Выстаўка Акадэміі акварэлі і вытанчаных мастацтваў **Сяргея Андрыякі**.
■ **"Жывапіс Генадзя Жарына"** — да 18 лістапада.
■ Юбілейная выстаўка мастака і заслужанага выкладчыка краіны Валянціна Пакаташкіна **"75. Дзеці, творчасць, любоў..."** — з 20 лістапада.

Вежа палаца

Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
■ **"Кнігі ў белых халатах"** (медыцынскія выданні XIX — XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна) — да 13 снежня.
■ Мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў **"Край родны, назаўжды любімы"** з фондаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля — да 31 снежня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўка:
■ Выстаўка **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад
■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстаўка **"Першая і Другая сусветныя войны ў артэфактах, дакументах і фота"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстаўка з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстаўка **"Тры плюс ART"**.
■ Выстаўка **"Ад пяра гусінага, да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстаўка **"Чароўны куфар"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстаўка твораў Георгія Капуснікава **"Прорва"** — да 20 лістапада.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выстаўка **"Tour de Беларусь. Этап: Мінск — Полацк — Мінск"** — да 22 лістапада.
■ Выстаўка **"Варыяцыі Існасці"**, прадастаўленая сябрамі Магілёўскай і Бабруйскай арганізацыі БСМ.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
■ **14 — "Лятучы Галандзец"** (опера ў 3-х дзеях) Р.Вагнера.
■ **14 — "Гукі музыкі"** — Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **15 — "Віні-Пух і ўсе, усе, усе..."** (опера ў 2-х дзеях) В.Пятровай. Пачатак а 12-й.
■ **15 — "Эсмеральда"** (балет у 3-х дзеях) Ц.Пуні.
■ **17 — "Царская нявеста"** (прэм'ера оперы ў 2-х дзеях) М.Рымскага-Корсакава.
■ **18 — "Рамэа і Джульета"** (балет у 2-х дзеях) С.Пракоф'ева.
■ **12** — канцэрт **"Штраўс запрашае..."**.
■ **20 — "Карміна Бурана"** К.Орфа; **"Кармэн-сюіта"** Ж.Бізэ — Р.Шчадрына.
■ **20 — Вечар музыкі Сяргея Рахманінава** (Камерная зала Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **21 — Вечар сучаснага балета**.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **15 — "Фінт-Круазэ"** Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.
■ **17 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
■ **18 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** Д.Балыка.
■ **19 — "Адэль"** Я.Таганава.
■ **20 — "Кантракт"** Ф.Вебэра.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **14 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава. Пачатак у 11.30.
■ **14 — "Шалом алейхем! Мір вам, людзі!"** А.Хадоскі. Пачатак а 19-й.
■ **15 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **15 — "Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера і інш.
■ **17 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **18 — "Містар Ікс"** І.Кальмана.
■ **19 — "Юнона" і "Авось"** А. Рыбнікава.
■ **21 — "Залатое кураня"** У.Уланоўскага. Пачатак у 11.30.
■ **21 — "Вяселле ў Малінаўцы"** Б.Аляксандрава.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **14 — "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** Ш.Пяро. Пачатак аб 11-й.
■ **15 — "Сонейка і снежныя чалавечкі"** А.Весялова. Пачатак аб 11-й.
■ **18 — "Дэкамерон"** Д.Бакача. Пачатак а 18-й.
■ **19, 20 — "Ямелева шчасце"** па матывах рускіх народных казак. Пачатак а 10-й і ў 12.30.
■ **21 — "Церам-церамок"** С.Маршака. Пачатак аб 11-й.